беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

НАША НІВА

№ 3 (41)
22 сакавіка 1996 г.
пятніца

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ НАША НІВА БЕЛАРУСЬ МІНСК

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА

ЭЛЕПРАГРАМА

БІРЖА ПРАЦЫ

"КАЛІ НЯ ПРЫЙДЗЕШ ТЫ, ПРЫЙДУЦЬ ПА ЦЯБЕ"

Пад такім дэвізам менскія студэнты заклікаюць людзей адзначыць Дзень Волі. Сьвята пачнецца 24 сакавіка а 12-й гадзіне на пляцы Незалежнасьці.

Як мы паведамлялі раней, ідэя адзначыць 78-ю гадавіну абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі належыць Аргкамітэту, у які сёлета ўвайшлі Васіль Быкаў, Мечыслаў Грыб, Генадзь Карпенка, Станіслаў Багданкевіч, Аляксандар Дабравольскі ды іншыя вядомыя ў краіне людзі. Шэсьце пачнецца а 12-й гадзіне з пляцу Незалежнасьці і будзе рухацца да помніка Янку Купалу і далей, да помніка Максіму Багдановічу, дзе адбудзецца мітынг. Ініцыятары мяркуюць сабраць на сьвята больш за 10 тысячаў чалавек і такім чынам выказаць свае негатыўныя адносіны да апошніх ініцыятываў А.Лукашэнкі ў Маскве. Шэсьце павінна стаць першай масавай акцыяй пасьля шэрагу сёлетніх паразаў незалежніцкіх сілаў.

"Калі ня прыйдзеш ты, прыйдуць па цябе", – заклікаюць студэнты, маючы на ўвазе тую атмасфэру беззаконьня і паліцэйшчыны, якая запаноўвае ў краіне і ўсё больш нагадвае часы сталінскае тыраніі.

БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІ КАНФЛІКТ

Калі дзьве асобныя краіны маюць агульную гісторыю, агульную мяжу на 750 км, агульныя землі і шмат агульнага народу, які сноўдае туды сюды, але пры гэтым маюць супрацьлеглыя палітычныя арыентацыі, – тады канфлікты паміж гэтымі краінамі непазьбежныя. Маленькая Літва ўсімі сіламі ўцякае ў Эўропу ад непрадказальных уплываў вялізнай Расеі. Беларускія ўлады – наадварот, аддаюцца гэтым уплывам, спакушаюцца ўсходняй стыхіяй разбурэньня і сьмерці. У такіх умовах створаная пяць гадоў таму мяжа дзьвюх краінаў – Беларусі і Літвы – становіцца мяжою дзьвюх цывілізацыяў – Захаду і Ўсходу, Эўропы і Азіі, стабільнасьці і хаосу. Да канфлікту нашых гісторыкаў, які доўжыцца дзесяцігодзьдзямі (глядзі ст. 20), дадаюцца міждзяржаўныя пікіроўкі і канфлікты на мяжы (ст. 24).

■ АД РЭДАКЦЫІ

ЧАТЫРЫ ЎРОКІ 25 САКАВІКА

Дыскусія на тэму, ці існавала ў пэрыяд Сярэднявечча такая гістарычна-культурная супольнасьць, як Сярэдняя Эўропа, толькі распачынаецца. Гаворачы пра Сярэднюю Эўропу, пра гэты абшар ад Таліну да Тыраны, найчасьцей маюць на ўвазе XX ст. Менавіта ў гэтым стагодзьдзі народы-аўтахтоны рэгіёну, якія спрадвечна засялялі свае землі, спазналі пэрыяд эмансыпацыі – стварыўшы прафэсійную нацыянальную культуру, яны заснавалі свае нацыянальныя дзяржавы. Упершыню за папярэднія стагодзьдзі чэхі, палякі, літоўцы, вугорцы перасталі быць нацыянальнымі групамі насельнікаў розных імпэрыяў і ўзнавілі сваю дзяржаўнасьць; латышы ды эсты ўпершыню атрымалі магчымасьць стварэньня сваіх дзяржаваў.

Працяг на старонцы 2

Ці можаце вы сходу назваць пяць найважнейшых нацыянальных інтарэсаў Рэспублікі Беларусі? Прычым – у парадку іх важнасьці. Першы, другі, трэці... Калі такі сьпіс існуе і збольшага супадае ў партыяў, асобных палітыкаў і паспалітага люду, – тады ёсьць краіна, геапалітычны суб'ект. Калі няма – тады няма... Сёньня мы прапануем вам параўнаць прыярытэты беларускіх палітыкаў розных арыентацыяў. Апытаньне "НН" – на старонцы 3.

■ СССР

ГІСТОРЫЯ, ПАЎТОРАНАЯ ЯК ФАРС

У мінулую пятніцу расейская Дума прыняла пастанову аб дэнансацыі Белавескіх пагадненьняў. Такі крок – натуральны працяг перадвыбарнай кампаніі, падчас якой "аднаўленьне СССР" стракацела ў шматлікіх праграмах... Тое, пра неабходнасьць чаго так доўга казалі бальшавікі, адбылося. Дэ-юрэ Расея выходзіць з СНГ. Прававая база, якая вызначала яе месца ў сьвеце, скасаваная. На тэрыторыі РФ утвараецца СССР. Дамовы Расеі з суседзямі ня маюць сілы... Учора гэта быў абсурдны прагноз, а сёньня ўжо – абсурдная рэальнасьць.

Дзеля чаго спатрэбіўся такі бальшавіцкі дэмарш? Дзеля таго, каб перахапіць ініцыятыву сп. Ельцына ў "зьбіраньні" земляў, а калі пашанцуе, то і прыцягнуць яго да "адказнасьці", расчысьціць месца для адзінага кандыдата ў прэзыдэнты – тав. Зюганава. Гэта, вядома, прасьцей, чым прапанаваць хоць бы рэальны плян урэгуляваньня ў Чачэніі.

Чаму гэтая авантура спатрэбілася менавіта цяпер? Бо ў гэтым месяцы плянавалася падпісаньне паміж Беларусяй, Расеяй, Казахстанам, магчыма, Кыргыстанам ды разьдзёртым вайною Таджыкістанам, урад якога прадстаўляе толькі сябе самога (добрая кампанія для Беларусі!), нейкага пакету дамоваў, якія мусілі пакласьці пачатак такому саюзу, якога "сьвет ня бачыў". Сп. Ельцын тымчасам заплянаваў і візыт у Кіеў, дзе толькі што больш чым прахалодна прынялі расейскіх думцаў. Аматарам СССР давялося прыняць экстраныя захады дзеля ратаваньня свайго самага важнага казыра, у параўнаньні зь якім астатнія карты блякнуць.

Чым гэта можа абярнуцца для Расеі? Амаль літаральным паўторам сцэнару з падпісаньнем Саюзнае дамовы, якое не далі зрабіць Гарбачову. Адзін вынік ужо ёсьць. Гэта рэзкае паскарэньне цэнтрабежных сілаў як у межах СНГ, так і ў межах самое Расеі. Лідары краінаў Балтыі і СНГ амаль усе адрэагавалі на дэнансацыю афіцыйнымі заявамі, у якіх яшчэ раз прысягнулі ідэалам свабоды. У тым ліку і сп. Назарбаеў. А сп. Бразаўскас, які тымчасам візытаваў ва Ўругваі, патэтычна запэўніў журналістаў, што краіны, якія вылузнуліся з СССР, ужо ня зьвернуць з свайго шляху.

А Беларусь? Беларусь па сутнасьці прамаўчала.

Паводле лёгікі засталося прычакаць ініцыятываў з боку расейскага Савету Фэдэрацыі, а таксама – заяваў ад Татарстану, Інгушэтыі, Кабарды, Тувы ды іншых, "адпусканьня" Чачэніі, а можа й яшчэ каго.

Другі вынік у тым, што Расея яшчэ раз пераканала сваіх партнэраў і інвэстараў у тым, што мець зь ёю справы – несалідна і небясьпечна. А ўкладаць грошы і будаваць праекты лепей дзенебудзь у іншым месцы.

Калі рашэньне Думы мае юрыдычную сілу, якую сілу тады могуць мець заплянаваныя дамовы Беларусі з Расеяй? Калі сп. Ельцын кажа, што рашэньне

Думы ня мае юрыдычнае сілы, значыць і ён не зьбіраецца лічыцца з законам. І захады, да якіх ён гатовы зьвярнуцца, будзе вызначаць толькі ён сам. Калі партнэр у гульні выбівае карты з рук, такога партнэра б'юць кандэлябрамі па галаве. Рэпэтыцыя на "Белым доме" ўжо была. Ці варта Беларусі класьці яйкі ў такі кошык?..

А ў Менску ў мінулую пятніцу быў сонечны капёж. Адсьвяткавалі Дзень Канстытуцыі. Ад Беларусі, як ні ад кога, Расея чакала важкага слова. Спроба камуністаў падтрымаць маскоўскіх аднапартыйцаў выглядала зусім кволаю ў параўнаньні з урачыстасьцямі 15 сакавіка каля Опэры, і не была заўважана на Ўсходзе. А Лукашэнка, які сам нічога ня можа выснаваць, параздаваў няўцямныя камэнтары, зь якіх вынікае, што рашэньні Думы яму сымпатычныя. Беларускі парлямэнт амаль за тыдзень так нічога й ня вымавіў ні народу свайму ні суседзям, і толькі ў сераду ўнёс пытаньне пра дэнансацыю ў парадак дня сэсіі.

Што ж, тав. Зюганаў мае чым пацьвердзіць уласны тэзыс перад расейскімі таварышамі: беларусы – "ня самая працавітая й сумленная нацыя". А сп. Ельцын атрымаў пацьверджаньне ненадзейнасьці свайго партнэра. "Апошні зубар" можа й на рогі падняць.

Аднак з фарсам трэба вызначацца й Беларусі. Прымусяць. Камуністы ўжо пад самую ініцыятыву Думы (14 красавіка!) бахнулі заяву пра "палітычна памылковыя й злачынныя" пагадненьні ў Віскулях. Таварышы, напэўна, ня ведаюць, што Беларусь на 1991 год не была прэзыдэнцкаю рэспублікай, а Белавескія пагадненьні прайшлі абсалютнай большасьцю галасоў у Вярхоўным Савеце. Тав. Лукашэнка не галасаваў.

Дарэчы, пра Лукашэнку. Калі дэнансацыя набудзе хоць нейкую сілу, ён застаецца без пасады. І таму да пары мусіць стаць гарантам нашага сувэрэнітэту. Ініцыяваць аднаўленьне СССР ён таксама ня можа, бо яго манаполія на ідэю ўжо канчаткова адыйшла да Зюганава, а сп. Ельцын яшчэ доўга будзе прэзыдэнтам Расеі і ад яго ўжо цалкам залежыць пэрспэктыва "інтэграцыі". Вось за гэты зазор часу і адбудзецца самае істотнае. Лукашэнка мусіў адразу ж кінуцца на падтрымку старэйшага партнэра. Ня кінуўся. Інтэграцыя адкладаецца.

Вядома, для "інтэгрантаў" найлепей было б сесьці дзе на Ісык-Кулі, падпісаць што-небудзь "эпахальнае", кульнуць па чарцы... Да таго ішло. Але цяпер азіяцкія "браты" могуць ківаць на свае парлямэнты, папросяць пачакаць. А самі дома абрынуцца з пагрозамі ў адрас здраднікаў і ворагаў незалежнасьці. Што да Беларусі, то яе ўваходжаньне ў Расею для Ельцына – слабое суцяшэньне, бо рэальна беларусы і так нікуды не падзеліся. А пачынаць асэнізацыю беларускае эканомікі паміж лічанымі месяцамі да выбараў і вайною ў Чачэніі, ратуючы рэнамэ Лукашэн-

Працяг на старонцы 2

■ ТЭМА

Беларусы ў расейска-чачэнскай вайне

Расейская Фэдэрацыя – гэта вялізны кацёл народаў, інтарэсаў і жарсьцяў. Адзінае, што стрымвае РФ ад поўнага хаосу, – гэта яе цэльнасьць: захаваньне цяперашніх межаў. Дастаткова парушыць гэтую цэльнасьць – ці то праз аддзяленьне Ічкерыі, ці то праз далучэньне Беларусі, і хаос вырвецца зь межаў крохкае стабільнасьці. Вось чаму незалежнасьць Чачэніі – гэта люстэркавы адбітак незалежнасьці Беларусі. Далёкая вайна ў Грозным і Гудэрмэсе праходзіць і па нашай, беларускай тэрыторыі. Сотні нашых хлопцаў ваююць там з абодвух бакоў фронту. Лёсы некаторых зь іх – тэма артыкулу на старонцы 5.

Інфарматар

12 газэтных палосаў патрэбнае інфармацыі

- *Тэлевізійныя праграмы: ад пятніцы да чацьвярга.*
- *TV-Sat. Праграма перадачаў спадарожнікавага TV.*
- *Радыё: Свабода, Голас Амэрыкі, Французскае, Нямецкая Хваля, Ватыкан, Бі-Бі-Сі, Польскае, 101'2 FM.*
- *Спажывец. Правы пасажыра.*
- *Кіно, відэа, тэатры, музэі, выставы, канцэрты.*
- *Рынак. Кошты. Тавары.*
- *Біржа працы. Дзясяткі новых вакансіяў.*
- *Транспарт. Расклад руху.*
- *Адукацыя. Платнае навучаньне ў Менску.*
- *Адпачынак: гульні, тэсты, забавы.*

Чатыры ўрокі 25 Сакавіка

Працяг са стар. 1

Ва ўсім эвалюцыйным ланцугу разьвіцьця гэтых народаў у XIX ды XX ст. стартавы пункт – культурная ідэнтыфікацыя, сьпеласьць культурных працэсаў стварыла магчымасьць самой праблематыкі палітычнага суверэнітэту.

Дзьве падзеі ў Беларусі пачатку XX ст. засьведчылі, што народ гэтае краіны належыць да Сярэдняй Эўропы – заснаваньне ў 1906 годзе нацыянальнай газэты "Наша Ніва" ды абвяшчэньне ў 1918 годзе незалежнасьці БНР. Прыналежныя да Сярэдняй Эўропы паводле прынцыпаў фармаваньня культурнае ідэнтычнасьці ды ўтварэньня нацыі, 25 сакавіка 1918 г. беларусы заявілі пра прыняцьце імі палітычных законаў разьвіцьця Сярэдняй Эўропы. ВЫБАР СЯРЭДНЯЙ ЭЎРОПЫ – гэта першы ўрок 25 Сакавіка.

Працэсы культура- і нацыягенэзу набывалі лягічную цэльнасьць у афармленьні палітычнае незалежнасьці. Але тут зноў падключылася геапалітыка. І выйграла свой раўнд у культуры. Уся наступная гісторыя Беларусі XX ст. – гэта, фактычна, супрацьстаяньне геапалітыкі й культуры. Геапалітыка так і ня здолела перамагчы культуру, хоць апошняя базуецца на ўласных рэсурсах, а палітычныя катаклізмы на нашую тэрыторыю прыўносіліся параўнальна больш магутнымі вонкавымі сіламі. Другі ўрок 25 Сакавіка – САМАЎЗНАЎЛЕНЬНЕ КУЛЬТУРЫ. Пры гэтай уласьцівасьці культуры, калі яе не перамагае геапалітыка, дык урэшце культура перамагае геапалітыку.

Трэці ўрок – чыста гістарычна-палітычны й тычыцца ён абставінаў абвяшчэньня незалежнасьці БНР. 20 лютага й 9 сакавіка ў Першай ды Другой устаўных граматах заяўлялася пра стварэньне Ўраду й Рэспублікі. Але юрыдычна БНР заставалася яшчэ часткаю Расеі. У сярэдзіне сакавіка ўзьнікла праблема зь фінансавымі рэсурсамі – перад адступленьнем Саветаў лідары расейскіх бальшавікоў у Беларусі Мясьнікоў і Ландар вывезьлі ўсё, што знаходзілася ў Менскіх банках; немцы ж канфіскавалі касу ўраду БНР. І вось тут было прынята рашэньне паслаць дэлегацыю на Ўкраіну і папрасіць крэдыт ва ўраду Ўкраінскае Народнае Рэспублікі. Але ў якой якасьці прасіць гэты крэдыт?

А 20 гадзіне вечара 24 сакавіка 1918 г. пачалося паседжаньне Рады БНР. У дыскусіі пра становішча БНР выступіў Антон Луцкевіч, які заявіў пра няпэўнасьць юрыдычна-прававога статусу Беларускае Рэспублікі й дадаў: "Спадзявацца на дзяржаўны крэдыт ад незалежнае Ўкраіны нам, часткі Расеі, бяз згоды цэнтральнага расейскага ўраду – юрыдычна немагчыма. Украінцы, зразумела, могуць нам дапамагчы грашыма, але ня ў выглядзе дзяржаўнага крэдыту, а проста ахвяраваньнем..." І вось гэты трэці ўрок, які афіцыйным Менскам ігнаруецца, а беларускімі інтэлектуаламі ўсьведамляецца ня цалкам – ФАКТАР УКРАІНЫ. У сытуацыі, калі расейская сьвядомасьць у прынцыпе супраць незалежнае Беларусі, калі Захад у прынцыпе гатовы падтрымаць незалежнасьць Беларусі, але ставіцца да яе хутчэй абыякава, шмат што пачынае залежнаць ад пазыцыі Ўкраіны – да прыкладу Ўкраіны ў Беларусі апэлююць, на яе падтрымку маюць спадзяваньні. Гэты ж сцэнар паўтарыўся ў 1991 г. А 25 сакавіка 1918 г. каля 8-е гадзіны раніцы, пасьля начной дыскусіі Рада БНР, прыняўшы Трэцюю ўстаўную грамату, абвясьціла незалежнасьць Беларусі.

З трэцяга ўроку непасрэдна вынікае чацьверты – ВАЖНАСЬЦЬ ЮРЫДЫЧНАГА АФАРМЛЕНЬНЯ ПАЛІТЫЧНЫХ КРОКАЎ. Прайграўшы ў міліарным супрацьстаяньні, што ахапіла ўвесь рэгіён, палітычна БНР ня зьнікла, яе палітычныя структуры працягвалі дзейнічаць, а ў наш час лёзунгі БНР сталіся палітычнымі лёзунгамі розных грамадзкіх сілаў Беларусі. Не ў апошнюю чаргу дзякуючы таму, што ўсю сваю палітычную дзейнасьць урад БНР афармляў адпаведнымі дакумэнтамі. Гэтыя юрыдычныя акты працягвалі жыцьцё ў сваёй юрыдычнай прасторы, нават калі ў рэальным жыцьці даўно ўсё зьмянілася. Задакумэнтаваная дзейнасьць БНР сталася традыцыяй, якая вызначае й нашыя сёньняшнія паводзіны.

Найлепшым чынам засвоіць урокі 25 Сакавіка – гэта пераўтварыць іх у фактар культурнага ды палітычнага ўплыву. Навакольныя ўмовы ў параўнаньні з 1918 г. зьмяніліся антуражна, але ў сутнасьці – не радыкальна.

Алег Дзярновіч

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік
№3(41)
заснаваны ў 1906,
адноўлены ў 1991
заснавальнік і выдавец
рэдактар
адказны сакратар
мастацкі рэдактар
рэдактар дадатку "Інфарматар"
макет
мантаж
набор
стыліст
карэктура
пры ўдзеле
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі
(тэл. 56-94-36)
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл/факс 36-76-75
Падпісны індэкс 63125

НАША НІВА

Павал Жук
Сяргей Дубавец
Алег Дзярновіч
Сяргей Харэўскі
Андрэй Лапцёнак
Віктар Корзун
Лявон Раманчык
Тацяна Чуйвід
Антон Кузьміч
Сяргей Сматрычэнка
Сяргея Шупы
Зьміцер Бартосік

КРАІНА ЗА ТЫДЗЕНЬ

Цяпер у Чэхію можна ездзіць бязь візаў. Нашу краіну наведала намесьніца міністра замежных справаў Чэхіі Гэлена Бомбасава. Яна мела сустрэчы ў МЗС Беларусі, а таксама ў Міністэрстве Зьнешніх Эканамічных Сувязяў. Падчас гэтых сустрэчаў абмяркоўваліся пытаньні разьвіцця беларуска-чэскіх палітычных і эканамічных адносінаў, а таксама праблемы бясьпекі й супрацоўніцтва ў Эўропе. Было падпісанае пагадненьне аб узаемных бязьвізавых паездках грамадзянаў абедзьвюх дзяржаваў.

На адно сьвята ў нас цяпер болей. Прэзыдэнт А.Лукашэнка падпісаў указ №100 аб усталяваньні Дня работнікаў гандлю, бытавога абслугоўваньня насельніцтва і жыльлёва-камунальнай гаспадаркі. Цяпер гандляркі й сантэхнікі атрымалі ўласнае сьвята, якое будзе адзначацца ў чацьвертую нядзелю сакавіка.

Тых, хто мае грошы, дужа напалохаў намер прэзыдэнта Лукашэнкі нацыяналізаваць шэраг беларускіх камэрцыйных банкаў. Як вядома, прэзыдэнт Беларусі публічна абвесьціў пра нацыяналізацыю бліжэйшым часам "Аграпрамбанку", "Прамбудбанку", "Зьнешэканомбанку", "Прыёрбанку" і "Белбізнэсбанку". "Яны будуць выконваць мае даручэньні, — сказаў А.Лукашэнка, — яны будуць працаваць у інтарэсах яго вялікасьці народу. Там будзе дзяржаўны капітал у статутным фондзе. І тады паўтара трыльёны рублікаў, якія яны атрымалі летась, будуць накіраваныя туды, куды я скажу, а не туды, куды жулікі загадаюць". Супрацьдзеньня гэтаму з боку банкіраў ці парлямэнцкіх фракцыяў пакуль не назіраецца. Страх за свае капіталы прымушае іх моўчкі чакаць нацыяналізацыі.

А тыя, хто грошай ня мае, павінны падумаць пра жыльлёвыя субсыдыі. Гэта калі частку аплаты за сваю кватэру і паслугі робіце вы самі, а частку — дзяржава. Працэдура налічэньня гэтае дапамогі даволі мудрагелістая, але ў некалькіх словах скажам, што па субсыдыі можна зьвяртацца, калі выдаткі на кватплату перавышаюць 15% ад агульнага сямейнага бюджэту. Паводле зьвестак БелаПАН, сёньня такія субсыдыі атрымліваюць толькі 5% насельніцтва Беларусі. Відавочна, што лічба гэтая павінна быць большай, але ня ўсе людзі ведаюць пра свае правы, дый сярэдні памер дапамогі не такі ўжо вялікі (64,4 тысячы рублёў), каб мець лішнія клопаты.

Генэрал-лейтэнант Валеры Кастэнка, камандзір войскаў супрацьпаветранай абароны Беларусі, прызнаўся, што асабіста аддаў загад зьбіць сумнавядомы амэрыканскі паветраны шар. У інтэрвію "Радыёфакту" ён сказаў, што "войскі ПВА рэспублікі дзейнічалі строга ў рамках закону "Аб дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь і паветранай прасторы", не дапусьціўшы ніводнага адступленьня, ніводнага парушэньня". Таксама генэрал Кастэнка паведаміў, што ў сёлета была падпісаная дамова з Расеяй пра сумеснае выкарыстаньні палігонаў. Цяпер беларускія вайскоўцы будуць праводзіць баявыя стрэльбы на палігонах Расеі, бо, як сказаў генэрал, "мы ўжо пяць гадоў не стралялі".

Дэнансацыя Белавескіх пагадненьняў можа паўплываць на папулярнасьць славутай "Белавескай" гарэлкі ў Расеі, дзе слова "белавескі" набыло ідэалягічна варожы сэнс. Прыкметы гэтага сталі заўважныя падчас нядаўняга візыту дэлегацыі беларускіх парлямэнтароў у Маскву. Кіраўнік дэлегацыі віцэ-сьпікер Генадзь Карпенка на брыфінгу для журналістаў распавёў пра такі эпізод. Калі Ўладзіміру Жырыноўскаму падаравалі традыцыйны беларускі сувэнір — пляшку "Белавескай", той заўважыў, што гарэлка добрая, але назоў кепскі. І палез у шуфляду шукаць, чаго б падараваць беларусам у адказ. Ажно выцягнуў наручнікі. Не, кажа, я пераблытаў, гэта для Бурбуліса. І таму падараваў кожнаму зь беларускіх парлямэнтароў па календары.

У "Народнай Газэце" зноў перамены. Указам прэзыдэнта Лукашэнкі галоўны рэдактар гэтае газэты Мікалай Галко звольнены з пасады "ў сувязі зь неадпаведнасьцю выконваемай рабоце". Прэзыдэнт Беларусі прызначыў Міхаіла Шыманскага выканаўцам абавязкаў галоўнага рэдактара "Народнай Газэты". Зацьвярджаць спадара Шыманскага на новай пасадзе будзе Вярхоўны Савет. Цікава, ці зоймецца Мікалай Галко, з прыкладу свайго папярэдніка спадара Сярэдзіча, стварэньнем чаго-небудзь накшталт "Яшчэ Больш Народнай Газэты"?

Ансабаль "Песьняры" цяпер працуе над новай праграмай. Мяркуючы зь песьні, што прагучала ў аўторак у "Радыёфакце", праграма будзе па-расейску. Эксклюзіўна для слухачоў "Радыёфакту" прагучала разухабістая песьня "Казацкая вольніца". Праўда, у прыпеве слова "гуляй" вымаўлялі на тутэйшы манэр — зь беларускім "г". Магчыма, гэта сьведчыць пра невядомыя нам пляны што да будучага саюзу братніх славянскіх народаў, дзе дзяржаўнаю моваю стане нашая мясцовая трасянка?

ЗДАРЭНЬНІ

Балён з газам выбухнуў у вёсцы Людвінова Вялейскага раёну. Саўгасны трактарыст Алег Лапша прынёс у хату балён для газавае пліты. У памяшканьні ёмістасьць нагрэлася і дала цечу па шве. Гаспадар адчуў пах і зьбіраўся быў выклікаць адпаведную аварыйную службу, ды запозна. Уключылася лядоўня, і ад іскры адбыўся выбух, за якім пасьледаваў пажар. У выніку цалкам зьнішчаныя дзьве кватэры васьмікватэрнага дому. Гаспадар балёну разам з жонкаю атрымалі цяжкія апёкі (да 60%) і знаходзяцца ў шпіталі. Ад апёкаў і атручаньня пацярпелі яшчэ некалькі суседзяў. Цудам засталася некранутаю кватэра насупраць. Загарэліся толькі дзьверы, якія ўдалося лёгка заліць вадою. Паколькі кватэра з балёнам знаходзілася на другім паверсе, то суседзі ніжэй ня менш чым ад агню пацярпелі ад тонаў вады, вылітых пажарнікамі пры ліквідацыі пажару.

Гарэлі таксама ў Крычаве ў маласямейным інтэрнаце заводу гумава-тэхнічных вырабаў. Ад кінутага без дагляду самаробнага награвальніка ўзнік пажар. У выніку загінулі сам гаспадар, трое суседзяў і двое малалетніх дзяцей. Адзінаццаць жыхароў суседніх пакояў, атручаныя чадным газам, шпіталяваныя. Каб не своечасовыя дзеяньні пажарнікаў, то маглі б загінуць болей за 60 чалавек.

Подзьвіг Аляксандра Матросава паўтарыў у суботу капітан міліцыі Міхаіл Дзям'янаў. Здарылася гэта ў Воршы на чыгуначнай станцыі. Тут нарадам патрульнае службы праводзілася апэрацыя — шукалі ўдзельнікаў бандыцкіх фармаваньняў. Падчас затрыманьня двух невядомых, падазраваных у крадзяжы рэчаў з аўтаматычных багажняў, адзін з злачынцаў, не дастаючы рук з кішэняў паліто, зусім як у баевіках, пачаў страляць зь пісталета ў супрацоўнікаў міліцыі. Пры гэтым ён параніў аднаго зь іх. Міліцыянты сталі страляць у адказ і паранілі бандыта. Тады адзін з злачынцаў выхапіў баявую гранату і кінуў яе ў напрамку дзяжурнага Дзям'янава, які, ратуючы жыцьцё сваіх саслужыўцаў і двух выпадковых грамадзянаў, накрыў гранату сваім целам. Дзям'янаў загінуў на месцы, сем міліцыянтаў і двое цывільных атрымалі раненьні рознае цяжкасьці. Два міліцыянты адпраўленыя ў шпіталь. Злачынцы спрабавалі ўцячы, але неўзабаве былі знойдзеныя і пасля чарговай перастрэлкі ліквідаваныя. Паводле неафіцыйных зьвестак, іх пасеклі з аўтаматаў проста на месцы. У бандытаў былі сканфіскаваныя зброя, боезапасы, падробленыя пашпарты і скрадзеныя грошы. Узбуджаная крымінальная справа, вядзецца следзтва.

Стралялі таксама і ў Салігорску. Як паведамляе БЕЛТА, намесьнік дырэктара Салігорскай пэдагагічнай вучэльні, седзячы ў сваім працоўным кабінэце, пачуў звон разьбіванага шкла. Падыйшоўшы да вакна, ён убачыў скразныя дзіркі ў шыбах. Міліцыянты, якія прыбылі на месца здарэньня, канстатавалі, што ў вакно стралялі. Была знойдзеная дэфармаваная куля ад дробнакалібравай стрэльбы. Як пазьней высьветлілася, страляў з самапалу рабочы ВА "Беларуськалій", які жыве ў доме насупраць вучэльні. Страляў дзеля выпрабаваньня толькі што зробленае ім прылады, і відаць, не туды пацэліў. Падчас пратрусу ў яго кватэры знайшлі незарэгістраваную паляўнічую стрэльбу, аптычны прыцэл, а таксама 260 дробнакалібравых набояў ды іншыя "кілерскія" прыстасаваньні.

А супрацоўнікі Ваўкавыскай дарожнай міліцыі не далі пастраляць пяці злодзеям, што накіроўваліся "на справу" ў Ваўкавыск. Можа й даехалі б да месца, але былі п'яныя. Так іх і затрымалі. У машыне былі знойдзеныя мэталёвыя пруты, баявы рэвальвэр, пісталет "пугач" ды чорныя маскі. Трое з злодзеяў ужо былі раней суджаныя.

Традыцыі славутага дывэрсанта Канстанціна Заслонава жывуць і перамагаюць у горадзе Воршы. Вельмі ж любяць тут гульні з выбуховымі прыстасаваньнямі. У панядзелак грузчык мясцовага рамонтага заводу зьвярнуўся непасрэдна да начальніка аддзелу ўнутраных спраўў на траспарце маёра міліцыі Бохана з заявай, у якой патрабавалася выдаць тры мільёны рублёў для групы чачэнцаў дзеля вяртаньня іх на радзіму. У выпадку адмовы выказвалася пагроза ўзарваць чыгуначны мост. Міны, вядома ж, не знайшлі і грошай не далі. Замест трох мільёнаў на апахмелку, грузчыка зьмясьцілі ў вар'ятню.

А ў адным з абласных цэнтраў нашае краіны лекары вэнэролягі змагаліся з пранцамі. У скурвэндыспансэр паступіла 16-гадовая пацыентка з дыягназам "востры сыфіліс". Патранажная служба дыспансэра высьветліла, што юная аматарка прыемных пачуцьцяў за тыдзень здолела заразіць 12 партнэраў. Сярод іх ёсьць школьнікі, пэнсіянэры і (паводле некаторых зьвестак) яе блізкі сваяк.

Грамадзяніну Швэцыі, уладальніку адной з стакгольмскіх фірмаў, пашанцавала трохі больш, бо замест захворваньня на пранцы ён пацярпеў толькі матэрыяльна. Як паведамляе БЕЛТА, швэд вырашыў спусьціцца з свайго нумару ў менскім гатэлі "Плянэта" ў казыно і трохі пазабавіцца. Там ён пазнаёміўся зь дзьвюма прыгожымі дзяўчатамі, якіх запрасіў да сябе ў нумар. Ня вытрымаўшы спаборніцтва з тутэйшым насельніцтвам у здольнасьці піць гарэлку, ён заснуў. Калі ж раніцаю прадзёр вочы, то ўбачыў, што начныя сяброўкі яго пакінулі. Таксама, як пакінулі яго залатыя ювэлірныя вырабы, 1300 даляраў ды 1,5 млн. беларускіх рублёў.

Паводле зьвестак "НН" і інфармацыйных крыніцаў матэрыялы падрыхтаваў Уладзімір Бараніч

Гісторыя, паўтораная як фарс

Працяг са стар. 1

кі — трызьня. Калі ж група "таварышаў" зь Менску й надалей будзе шчаміцца ў тыя дзьверы, то законнасьць будзе відавочна не на іх баку. Бо на чыім баку яна ў Расеі?

З поля ўвагі ў двубоі Зюганаў — Ельцын сёньня яўна выпадае трэці — Жырыноўскі. І як далёка могуць сягнуць ягоныя амбіцыі пры прававым хаосе, невядома. Але пакуль глябальны двубой сп. Ельцын — камуністы, толькі пашырае поле гульні для жырыноўцаў. Ці не пад ЛДПР ствараецца "інтэграцыя"? Тут — шырокае поле для мізантрапічных прагнозаў...

Расея, якая ўжо даўно не вялікая й не разьвітая дзяржава, траціць свае апошнія гістарычныя шанцы. На паседжаньні "вялікае сямёркі" спадар Ельцын з гонарам заявіў, што запрашэньне яго — гэта прызнаньне таго, што Масква стала "нэрвавым цэнтрам сусьветных пераменаў". Сёньня з гэтага ўжо можна пасьмяяцца. Краіна, якая займае 23-е месца паводле паказчыкаў ВУП, і 39-е паводле яго долі на душу насельніцтва, 37-е паводле эфэктыўнасьці сельскае гаспадаркі, аднак першае месца ў сьвеце паводле пазыкаў, яшчэ хоча на нешта ўплываць! А дакладней, крыху ўзьняцца, стаўшы на галовы сваіх суседзяў.

Меў рацыю Банапарт — гісторыя паўтараецца двойчы, другім разам як фарс. Спадзяюся, найбольшыя драмы ўжо мінулі. Але падобна, што нашага карсыканца такі канец імпэрыі не задавальняе ніякім чынам.

Сяргей Баркоўскі

Нацыянальныя інтарэсы Беларусі

адмыслова для "Нашай Нівы" фармулююць прадстаўнікі розных палітычных арыентацыяў

Станіслаў Багданкевіч, лідар фракцыі "Грамадзянскае дзеяньне"

Я сфармулюю іх паводле Канстытуцыі. Сёньня надзвычай важна захаваць сувэрэнітэт Рэспублікі Беларусь. Цяпер гэта важна, бо частка людзей мае ілюзіі, якія насаджае гэта наша невуцкая ўлада, нібыта ўсе беды адбываюцца ад сувэрэнітэту. А беды – ад няўменьня карыстацца сувэрэнітэтам дзеля, скажам, павышэньня эфэктыўнасьці вытворчасьці й паляпшэньня жыцьця людзей.

З гэтым жа зьвязана неўступленьне ў ваенныя блёкі.

Асабліва важны наш сувэрэнітэт для пераводу эканомікі на рэйкі лібэральнае мадэлі. Гэта значыць: свабода прадпрыймальніцтва, канкурэнцыі, уласнасьці і на базе гэтага – пад'ём прадукцыйнасьці працы і самой вытворчасьці.

У эканоміцы найважнейшае пытаньне – інвэстыцыі, магчымасьць павысіць заробак, скараціць выдаткі на энэргію, на сыравіну, на камплектацыю. Без інвэстыцыяў гэта немагчыма. А для іх патрэбныя зьмены палітычнай сытуацыі, патрэбны закон, трэба, каб не было самавольства. Хто гэта пойдзе, панясе грошы, калі сеньня ўказам я дам, а заўтра ўказам адбяру, калі за суткі зьмяню падаткаабкладаньне. Вось ніхто і ня йдзе.

Сродкі масавай інфармацыі – адзін з найважнейшых прыярытэтаў. Ва ўмовах, калі нельга пагутарыць з народам, немагчыма зьвярнуць людзей на свой бок, выкласьці аргумэнты, абвергнуць паклёп...

Вінцук Вячорка намесьнік старшыні БНФ

Я назаву толькі адзін – гарантаваная незалежнасьць.

Мечыслаў Гіруць лідар аграрнай фракцыі

Першачарговая задача – навесьці парадак, г.зн. усталяваць закон і законнасьць. І закон павінен пераважаць ва ўсіх структурах улады. Усе тры галіны ўлады – заканадаўчая, выканаўчая і судовая – павінны працаваць у рамках закону, у рамках Канстытуцыі. Калі мы ня будзем гэта выконваць, то зрабіць нейкія салідныя зрухі ў эканоміцы ці навесьці парадак у краіне мы ня здолеем. Таму найперш трэба выконваць закон.

Другое пытаньне – ажыўленьне вытворчасьці, стабілізацыя эканомікі і ня толькі ў сельскай гаспадарцы і агрэпрамысловым комплексе, а ўвогуле стабілізацыя – і ў прамысловасьці і ў будаўніцтве, ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі. Калі мы здолеем гэта зрабіць (а з ажыўленьнем вытворчасьці мы змаглі б і павялічыць заробкі, і заняць нашых людзей), то будуць вялікія зрухі да стабілізацыі ў краіне і ў эканамічным, і ў сацыяльным пляне.

Наступнае пытаньне – сацыяльная абарона людзей. Сёньня ў нас заробкі не выплочваюцца па дзесяць месяцаў у сельскай гаспадарцы і ёсьць перапынкі зь іх выплатай у іншых галінах. Не зусім нармальнае становішча і з пэнсіямі. Цяпер гэта, відаць, адзіная краіна, дзе ўсе атрымліваюць аднолькавую пэнсію: акадэмік – 500 тысячаў і прыбіральшчыца – 500 тысячаў. Мяркую, што гэта ненармальная зьява, тут не павінна быць ураўнілаўкі. Павінна быць ацэнка чалавека паводле таго ўкладу, які ён унёс за ўсё сваё сьвядомае жыцьцё. Калі параўноўваць таго ж акадэміка ці буйнога дзяржаўнага дзеяча з той жа прыбіральшчыцай ці простым калгасьнікам, – натуральна, ёсьць розьніца.

Далей – навядзеньне правапарадку. Цяпер у нас злачыннасьць расьце і самае страшнае – арганізаваная злачыннасьць. З гэтым трэба змагацца, прычым не аднабакова, ня колькасьцю праваахоўных органаў, а эканамічнымі мэтадамі і законамі, якія б жорстка каралі людзей за злачынствы.

Мечыслаў Грыб сацыял-дэмакратычная фракцыя

Сёньня галоўны інтарэс Беларусі ва ўнутранай палітыцы – гэта адпаведна нашай Канстытуцыі захаваць свой сувэрэнітэт, незалежнасьць краіны.

Зь міжнароднага боку – пашырэньне эканамічнай інтэграцыі на Ўсход і на Захад. І я б не рабіў тут ніякіх адхіленьняў – дзе павінна быць больш, дзе павінна быць менш. Дзе як атрымаецца. Але яшчэ раз скажу, што трэба рабіць захады і на Ўсход і на Захад.

Трэцяе – трэба як мага хутчэй прыводзіць у дзеяньне рэформы: прыватызацыю, зьмену формы ўласнасьці і гэтак далей. Калі гэтага ня будзе, то няма ніякай надзеі, што наша прамысловасьць зможа неяк падняцца.

Аляксандар Дабравольскі, фракцыя "Грамадзянскае дзеяньне"

Першы нацыянальны інтарэс – гэта незалежнасьць і законнасьць. Таму што цяпер пад пагрозай знаходзіцца само існаваньне дзяржавы і калі нейкія іншыя інтарэсы абмяркоўваць, то толькі тады, калі незалежнасьць і законнасьць будуць у Беларусі.

Натуральны нацыянальны інтарэс Беларусі – нэўтралітэт. Мы апынуліся між двума сусьветамі, між дзьвюма цывілізацыямі, між двума ваеннымі інтарэсамі: НАТО і Расеі. Беларусь можа далучыцца туды або туды, але ўвогуле ў Канстытуцыі зафіксаваны добры артыкул пра тое, што Беларусь павінна імкнуцца да нэўтралітэту.

Яшчэ інтарэс – мець добрыя адносіны з усімі краінамі-суседзямі і не імкнуцца быць прыдаткам якой-небудзь іншай краіны.

У сфэры эканомікі – свабодная рынкавая эканоміка, рэформы. Гісторыя паказвае, што дзяржавы, якія ішлі шляхам заахвочваньня асноўнага рухавіка эканомікі – чалавечай ініцыятывы, – дабіваліся посьпеху. Тыя, хто гэтага не рабіў, замянялі добрае жыцьцё добрымі словамі.

У сфэры культуры – захаваньне беларускай культуры, якая цяпер пад пагрозай. Роўнасьць моваў, за якую людзі прагаласавалі на рэфэрэндуме, разумеецца такім чынам, што павінны быць усе правы ў расейскай мовы, і ніхто збольшага не разумее патрэбы адраджэньня беларускай мовы, якой сёньня пагражае зьнікненьне.

Сяргей Калякін лідар фракцыі камуністаў

Першы – дабрабыт народу, мірнае разьвіцьцё (захаваньне грамадзкага міру ў Рэспубліцы Беларусь), інтэграцыйныя сувязі з Расеяй і іншымі дзяржавамі, якія ўтварыліся на тэрыторыі СССР, бясьпека Рэспублікі Беларусі ў рамках заключаных міждзяржаўных пагадненьняў і паступальнае разьвіцьцё эканомікі празь пераадоленьне крызысных зьяваў, стабілізацыю і нарошчваньне вытворчасьці сельскагаспадарчай і прамысловай прадукцыі.

Генадзь Карпенка намесьнік старшыні ВС

Першы – захаваньне дзяржаўнасьці.

Другі – вырашэньне эканамічных праблемаў.

Трэці – пошук свайго месца ў міжнароднай супольнасьці.

Чацьверты – нацыянальная культура, мова.

Пятро Краўчанка старшыня Камісіі па Міжнародных Справах

Першы – дзяржаўная незалежнасьць, сувэрэнітэт.

Другі – дасягненьне бязьядзернага статусу нашай дзяржавы.

Трэці – ператварэньне Беларусі ў нэўтральную краіну. Нэўтралітэт трэба разглядаць як мэту, да якой трэба рухацца.

Далей – стварэньне ўсходнееўрапейскай эканамічнай супольнасьці – зь Беларусі, Украіны і Расеі. Тое, што мы называем усходнееўрапейскім агульным рынкам. Агульны рынак на захадзе і ўсходнееўрапейскі рынак павінны злучыцца да 2005 году.

Пятая тэза – вяртаньне ў Эўропу пасьля 2005 году.

Уладзімер Нісьцюк сацыял-дэмакратычная фракцыя

Самы галоўны нацыянальны інтарэс Беларусі ў тым, каб людзі зажылі ўрэшце па-людзку. А ўвогуле галоўны нацыянальны інтарэс: застаючыся ў цэнтры Эўропы, застаючыся спалучэньнем усіх нэрвова-транспартных канцоў, захаваць спакой і стабільнасьць. Нас гісторыя кідала, штурхала, мы ўвесь час пад нейкімі нашэсьцямі былі, мы ўвесь час змагаліся за незалежнасьць. Нашаму памяркоўнаму мэнталітэту заўсёды не ставала спакою. Памяркоўна, бяз рэзкіх рухаў, мы напэўна зможам нешта зрабіць. Ня трэба вынаходзіць ровар, прыдумляць "рынкавы сацыялізм", трэба шукаць мадэль эканамічнага разьвіцьця, якая ўжо выверана на краінах падобнага кшталту. З падобнай гісторыяй і традыцыямі. На маю думку, наша Беларусь магла б у нечым прадубляваць ролю Швэйцарыі ў пэўнай кропцы Эўропы. Мы таксама на найважнейшым стратэгічным кірунку і на скрыжаваньні ўсіх транспартных шляхоў. Мы таксама вызначылі ў Канстытуцыі, што наша дзяржава – нэўтральная. Высокі ўзровень інтэлекту нацыі, навукі, палітычная стабільнасьць... Але для гэтага трэба, каб людзі былі хоць трохі ўпэўненыя ў заўтрашнім дні.

Пятро Садоўскі Беларускі Хельсынскі Камітэт

Захаваць дзяржаўнасьць, сувэрэнітэт, мову, стаць эўрапейскай дзяржавай.

Эканоміку трэба дэмакратычную будаваць, сапраўдную, а ня "рынкавы сацыялізм".

Зьнешнія – будаваць нармальныя адносіны. Мы цяпер толькі кажам, што ў нас і ўсходні вэктар і заходні вэктар. Ніякага ў нас заходняга вэктару няма. Наш зьнешні дэпартамэнт, Міністэрства Замежных Справаў, яно ж паралізаванае, яно не выконвае свае функцыі. Там папросту ёсьць гэты шворан прэзыдэнцкі, яно ім працята, і ўсе сядзяць, як мышы пад мятлой.

Войска. Трэба, каб былі прапорцыі ўзброеных людзей. У нас цяпер што адбываецца? Армія нібыта трошкі скарачаецца, але страшэнна пухнуць паліцыя, дзяржаўная бясьпека, амон, усякія прэзыдэнцкія гвардыі і г.д. Гэта прыблізна так, як было пры Бэрыі. Калі так будзе працягвацца, то праз годдва ў нас будзе лацінаамэрыканскі варыянт – калі падтрымваюцца бізнэсмэны, якія стаяць на баку прэзыдэнта. Вось будзе 50 багатых фаміліяў, 50 капіталістаў, астатніх – пад малаток. Як у свой час Сталін. Купала, Колас – маякі, а астатніх усіх – выразаць... Прэзыдэнт ужо складае сьпісы пісьменьнікаў, артыстаў, майстроў кіно, якіх трэба падтрымваць. У нас ужо ёсьць і свая намэнклятурная мастацкая інтэлігенцыя. Гэта Яроменка, Азаронак, Гасьцюхін, Ярмоленка ў гэтай абойме, Мулявіну давяраюць канцэрт складаць... Ідзе намэнклятурызацыя бізнэсу і г.д. Трэба ад гэтага пазбаўляцца.

Леанід Сечка сацыял-дэмакратычная фракцыя, старшыя ПНЗ

Асноўнай ідэяй маглі б выступіць ідэя патрыятызму, любоў да Айчыны, вакол чаго мы маглі б аб'яднаць народ. Што тычыцца іншых ідэяў... Ідэя адраджэньня Бацькаўшчыны, вяршынства закону, гарантыі правоў і свабодаў, існаваньня парлямэнцкай сыстэмы, усеагульнага выбарчага права. Вельмі важная ідэя рэфармаваньня грамадзтва. Але мы выступаем супраць рэзкіх рэвалюцыйных пераўтварэньняў грамадзтва і дзяржавы. Рэфармаваньне – гэта складаны працэс, які патрабуе аб'яднаць намаганьні ўсіх грамадзянаў. Для гэтага патрэбная салідарнасьць. А каб яе дасягнуць, патрэбная ідэя патрыятызму.

Мікола Статкевіч лідар БСДГ

Наша беларуская дзяржава павінна забясьпечыць нашаму народу, нашай нацыі нармальнае жыцьцё і разьвіцьцё. Маецца на ўвазе пэўны ўзровень дабрабыту, бясьпекі, разьвіцьця культуры, дачыненьняў з суседзямі...

Калі дзяржава атрымала незалежнасьць, у нашай сытуацыі яна павінна, безумоўна, пачынаць эканамічныя рэформы, клапаціцца пра ўмацаваньне дзяржаўнасьці, пра фармаваньне нейкіх ідэалаў грамадзтва. Дзяржава павінна забясьпечыць выхаваньне патрыятызму.

Георгі Таразевіч СДС

Самае галоўнае – абараніць незалежнасьць. Найперш – эканамічную. Потым і на іншых напрамках жыцьця. Я думаю, калі мы станем на трывалыя эканамічныя ногі, тады ўсё будзе прасьцей. На жаль, гэта шлях складаны і доўгі. Але мы павінны яго прайсьці.

Што тычыцца зьнешніх дачыненьняў, то тут мы павінны быць больш мудрымі дзеля ўсталяваньня лепшых адносінаў з нашымі найбліжэйшымі суседзямі. І нам ня трэба быць павернутымі ў адзін бок, на Ўсход. Нам трэба вельмі актыўна разьвіваць свае адносіны і з Польшчай, і з Украінай і з прыбалтыйскімі краінамі, і, зразумела, з Расеяй. І вядома ж з Захадам, з Эўропай, з Амэрыкай, зь іншымі краінамі. Але суседзі – перш за ўсё. Я сёньня ня бачу такіх узаемна зацікаўленых адносінаў з нашымі суседзямі – і з Поўначчу, і з Поўднем, і з Захадам.

Юры Хадыка намесьнік старшыні БНФ

Самы галоўны інтарэс Беларусі – адстаяць незалежнасьць. Гэта такі прыярытэт, перад якім адступаюць усе іншыя. І, вядома, цяпер вельмі небясьпечная сытуацыя ў духоўнай сфэры – у адукацыі і культуры. Ідуць нахабныя адкрытыя напады на сыстэму беларускамоўнай адукацыі.

Станіслаў Шушкевіч фракцыя "Грамадзянскае дзеяньне"

Канстытуцыйнасьць, дзяржаўнасьць, рынак і сацыяльная абароненасьць. Рынак – сацыяльна арыентаваны, бо без сацыяльных праграмаў мы выжыць ня можам, у нас шмат няздольных людзей... Вось усе галоўныя пункты.

Уладзімер Ягораў дэпутат ВС, былы старшыня КГБ

Найперш – гэта незалежнасьць.

Гэта эканамічнае супрацоўніцтва краіны зь яе найбліжэйшымі суседзямі на ўзаемнай выгадзе і перадусім, натуральна, з Расеяй, бо іншых рынкаў збыту нам у бліжэйшы час на захадзе папросту не знайсьці. Не дарасьлі яшчэ з сваімі тэхналёгіямі.

Трэці фактар – гэта захаваньне ў нашым народзе ягоных найлепшых традыцыяў: талерантнасьці, памяркоўнасьці. Гэта таксама недапушчэньне якіхсьці інтарэсаў, якія б разьвівалі варожасьць, якія б сеялі нейкія падозраньні, сумневы і ў міжнацыянальных, і ў канфэсійных адносінах.

Чацьверты фактар – прававое выхаваньне народу і асабліва моладзі. Сюды можна аднесьці і ўсю нашу гуманітарную сфэру. Гэта захаваньне, адраджэньне і давядзеньне да народу, да маладога пакаленьня ўсяго таго лепшага, што назапашана, што створана старэйшымі, папярэднімі пакаленьнямі. Я маю на ўвазе ня толькі апошнія дзесяцігодзьдзі, але й нашу далёкую гісторыю, таму што ў ёй ёсьць шмат незаслужана забытага і вартага таго, каб гэта сёньня падняць, адрадзіць, абагульніць і гэтым ганарыцца, выхоўваць на гэтым. На гэтым мусяць грунтавацца і астатнія прынцыпы, што датычыць і дзяржаўнага ўладкаваньня і разнастайных рэформаў.

Апытваў Алег Дашкевіч

...і нацыянальныя інтарэсы беларуса

"Толькі б не было вайны, альбо Давайце жыць дружна"

Непрыняцьце вайны як сродка вырашэньня канфліктаў, сядзіць у галовах беларусаў надта моцна. Гісторыя Беларусі – ланцуг самых розных канфліктаў, пэрманэнтныя войны, што каціліся празь Беларусь то з захаду на ўсход, то наадварот, прычым самі беларусы амаль кожнага разу ўдзельнічалі ў іх з розных бакоў барыкадаў, альбо вымушаныя былі проста падпарадкоўвацца абставінам. Інтарэсы самой Беларусі ў гэтых войнах як правіла ня ўлічваліся. Такім чынам, непрыняцьце вайны ўвайшло ў генэтычны код беларусаў. Вайна, напрыклад, у адрозьненьне ад Расеі або Чачэніі, у Беларусі непапулярная і папулярная ня будзе.

"Хата, сьвінка, бульба"

У Беларусі жылі й жывуць з свайго мазаля, у адрозьненьне ад Расеі, мала спадзеючыся на цуд. Свая хата, свая зямля, свая жывёла ратавала ва ўсе часы, пры любой уладзе. Камуністам давялося палову насельніцтва або забіць, або зьвезьці ў Сыбір, каб зрабіць тут калгасы. Дарэчы, нашы калгасы адназначна розьніліся ад расейскіх "колхозов". Бур'яну вакол хатаў было менш. Менавіта з гэтай прычыны вяртаньне да фэрмэрства, якое прапагандуюць сёньня, у нас сустрэлі без аптымізму. Людзі баяцца страціць хату, бульбу, сьвінку.

За незалежнасьць краіны будуць зацята змагацца ўсе, калі і ў гарадах, дзе жыве большасьць насельніцтва, фабрыкі і заводы людзі будуць уважаць за свае – хату, бульбу, сьвінку.

"Не наяжджай"

Беларусь ня любіць Жырыноўскага – бо наяжджае. Беларусь ня выбрала Пазьняка з той самай прычыны. Енкі "гіне мова, гіне культура" прывялі да вынікаў рэфэрэндуму. Урэшце і Лукашэнку, які пачынае наяжджаць, чакае тое самае...

"Каб паважалі"

Беларусь карысталася пэўным аўтарытэтам за савецкім часам. Беларусь стараецца гэты аўтарытэт захаваць. На прасторы СНГ ёй гэта амаль што ўдалося. Псуе карціну сваімі "откровениями" пра Гітлера прэзыдэнт Лукашэнка. Дык вось, калі на рынках і таўкучках Расеі ды Украіны беларуса са старой памяці і ў выніку аднолькавых праблемаў паважаюць, то з таго боку заходняй мяжы павагі значна меней. А гэта ўспрымаецца беларусамі вельмі балюча. Адсюль такое ўпартае нежаданьне Беларусі рухацца на захад.

За тое, за што паважаюць беларуса, беларус паважае сябе сам. Пераступаньне адной зь межаў гэтага квадракола вядзе да паразы ў Беларусі кожнага. Сёньняшняя сытуацыя ў краіне адназначна вядзе да ўзмоцненага супрацьстаяньня. Калі яна ня зьменіцца, а спадзеваў на гэта няма, то выльецца ў супрацьстаяньне ўзброенае, раней ці пазьней. Калі зьявіцца зброя, то зьявяцца і забітыя. А забойства – гэта адначасовае пераступаньне ўсіх чатырох межаў квадракола.

"Прайграе той, хто першы заб'е"

Урэшце ўсё вяртаецца на "колы свае". Не забі – галоўны інтарэс Беларусі.

Алег Дашкевіч

■ КОЙДАНАВА

Ганна Матусэвіч

ЛІСТЫ ДА СЫНА

10.03. Шараю гадзінаю ў нас прапала сьвятло. Рабіць не было чаго. Мы з мужам селі на крэсла-канапу. Двое "апоўзількаў" зараз жа ўскараскаліся на калені. Старэйшы, "прахвэсар", балбатаў па "chatter telephone", падараваным амэрыканскімі беларусамі. Дзеці дурэлі ад радасьці, мы п'янелі ад шчасьця. І калі запалілі сьвятло – мы яго не жадалі. Няхай жыве шарая гадзіна!

11.03. Мая Вэраніка любіць "нэндзіць" (Віталькаў наватвор). А сёньня яна й сапраўды хворая. Скукарэчылася, прытулілася да бацькі. І тут баліць, і там баліць... А яшчэ гэты "кадук" туды-сюды саўгаецца, як глытаеш... – Які кадук? Кадук – гэта чорт, а ў цябе кадык! Не чапай ліха, каб было ціха.

Але ж успомнілі непрыяцеля і ён не прамінуў зьявіцца. Я напякла дзецям "хрушчоў" ды паставіла ўгару на шкапчык. Віталік адчыняе дзьверцы – міска ляціць (добра што не на галаву!) ды на падлогу.

Вось табе й кадук!

12.03. Успаміналася даўнейшае. Выклікаў сьледчы. Прыходжу. Доўга чакаю. Нарэшце заходжу. Сядаю. Расказваю. "Давайте договоримся. Мы будем говорить по-русски," – прапануе мне ружовашчокі "ловец счастья и чинов"

– Выбачайце, але я ня ўмею...

– Как?!

16.03 ... Расцвет страны всегда творится под космическим воздействием. Коллектив устремлённых мыслей притягивает из пространства нужные наслоения посылок. Клише великих открытий носятся в пространстве. Те, кто могут напрячь свою психическую энергию в ритм космических энергий, те примут в сознание сокровища. Расширение сознания направит его к цепи соединения всех творческих сил Космоса. Упадок страны – результат отрицания причинности космических воздействий. Когда Эго делается идолом, закрываются Врата. Личность становится отражением улыбки космического действия, лишь когда она считает себя неотъемлемой частью существующего, проявленного Космоса...

... Традиция наших времён не позволяет духу устремиться к высшим сферам. Церковь имеет свои догмы, семьи имеют свои рамки, сооруженные прадедами, народы имеют законы, лишившие их самостоятельности... Нужно в школе дать детям сознание всей нескончаемости творческой деятельности.

... Научите малых помыслить о Беспредельности, помня к тому же, что никто не должен считать себя ничтожной песчинкой, как обычно это делает лицемер.

Мозаика Агни Йоги

17.03. Я спазьнялася на электрычку. Ішла подбегам, а дзе й бегла. Але не хвалявалася. Неяк будзе. Я спазьнілася на пяць хвілінаў, але мусіла чакаць яшчэ прыблізна столькі ж. Я села ў вагон і праехала некалькі станцыяў. Увайшла жанчына, паглядзела на мяне ва ўпор і запытала: "Чаму спазьнілася электрычка?" Аднекуль з Прасторы да мяне данеслася: "Дзеля цябе Я магу спыніць цягнік".

Да электрычкі ў мяне заставалася досыць часу. Я не сьпяшалася. Я адпачывала сярод дарогі, корпалася й была легкадумнай. Я прыйшла на пэрон і ўбачыла хвост электрычкі. Строгае папярэджаньне для мяне было заслужанай поўхай: "Не задавайся. Цягнік пойдзе і безь цябе".

■ МЕНСК

Андрэй Дынько

НОВАЕ ПАГАНСТВА

Летась на Вадохрышча падчас сьвяточнага набажэнства ў Сьвятадухавым саборы Яго Блажэнства Філарэт ня вытрымаў націску людзей, што гатовыя былі зьнесьці ўсё на сьвеце, і прыкрыкнуў: "Успокойтесь, язычницы, Святой воды на всех хватит!"

Я думаю, што паганства – вельмі трапная характарыстыка таго імаралізму, што апанаваў краіну. Новае паганства, замяшанае на цемрашальстве народу, невуцтве інтэлігенцыі, канфармізме інтэлектуалаў, блукае ад галоднага мяшчанства да сытага. Такімі мы прыйшлі да 1991 году, да аднаўленьня незалежнасьці. Беларускі народ зрабіўся іншым, чым быў паўстагодзьдзя назад; меншасьць асымілявала большасьць; абудзіліся і разьвіліся тыя адмоўныя рысы, што ў зародкавым стане ўласьцівыя любому нацыянальнаму арганізму.

На сёньня ў вочы кідаюцца тры адметнасьці беларускага народу: нецярпімасьць, мазахізм і пітушчасьць. Будзьма шчырымі: сярэднія нашы Алеся з Алікам недалюбваюць пшэкаў і каталікоў наогул (прышчаплялася школьнымі падручнікамі і прэсай усіх колераў), ненавідзяць лабусаў (прышчапляецца ўжо гадоў 10 "развлекательным" маскоўскім тэлебачаньнем), пагарджаюць хахламі й чучмекамі (прышчаплялася ў войску амаль кожнаму мужчыну), лічаць расейцаў гультаямі, злодзеямі і алкашамі. Шмат пра што сьведчыць і стаўленьне да жыдоў: нават разьвітаўшыся зь імі, мы так і не ацанілі, колькі яны зрабілі для нас. Мы не пачулі цёплых словаў Купалы. Няпрыязю да жыдоў вымяраецца ступень народнага цемрашальства.

А хіба перад аўганцамі, чэхамі, прыбалтамі беларусы пакаяліся? Хіба на помніку ля Траецкага прадмесьця тыя, хто яго ставяць, напішуць пяць словаў у памяць мільёна забітых аўганскіх чучмекаў? Мы па-мазахісцку амаль што выхваляемся, што ў вайну загінуў кожны чацьверты беларус, але забываем дадаць, што сярод 2 мільёнаў 200 тысячаў было й 800 тыс. жыдоў, якіх мы не ўратавалі, і сотні тысячаў расейскіх салдатаў і ваеннапалонных, якія ратавалі нас.

Ксэнафобіяй нас заразілі моцна, мазахізм жа, падобна, уласьцівы нам ад прыроды. У вёсцы Ядзінства Чачэрсага р-ну дзеткі штораніцы паўзуць па бервяне праз раўчук-рэчку да шашы, да аўтобусу, што возіць іх да школы. Зьбіць мосьцік? А нахалеру? Усё роўна што ў нас за жыцьцё: плоцяць мала, начальнікі крадуць, каровы запускаюцца. Не, няхай будзе бервяно, можна будзе хоць салодка павохкаць увечары: ох, як цяжка, ой сілы няма. На выбарах "ядзінцы" галасавалі за пэрсанаж з нагайкаю. Вэнэра ў футры зацьмі-ла зорку Вэнэру. На апошнія грошы наш Алік звычайна ідзе са слоікам па піва. А што дзіця ўжо два тыдні ня бачыла ні мандарынкі, ні яблычка – дык хай прывыкае. Мазахісты жлукцяць паўлітроўкамі "Рускую" ці "Клімавіцкую", носяць пачварныя куфайкі, пэцкаюць у пад'ездах.

Дапіваючы чацьвертую пляшку гарэлкі на траіх, чачэрцы кідаюць маім знаёмым італьянцам: "Сіньёры, вашы сябры паехалі ў Ветку? Намучацца там, бо тыя кацапы вёдрамі хлешчуць". Ну дык жа ж не памыліліся, зрэшты, бо веткавец, набраўшыся да божай сілы, ганяўся за роднымі "дзецьмі Чарнобыля" і небаракамі-італьянцамі зь сякераю.

Але ж не заўжды мы былі такімі. Не заўжды блатныя песьні "цьвінчылі" з кожнае шчыліны. Не заўжды стаяў гэты маць-перамаць: я ня думаю, што "Вольная сцэна" перамагла б з "Рычардам" у Эдынбурзе, калі б шатлянцы разумелі па-беларуску. Мая бабуля дагэтуль, завіхаючыся паблізку, замыкае дзьверы "на гулячку", як кажуць у нас, то бок "на галінку". Яна вешае галінку на клямку, што мае азначаць: дзьверы зачынены звонку, у хаце няма нікога, не заходзьце. Гэта ўжо пасьля нас навучылі вайсковаму прынцыпу "Чалавек чалавеку воўк". Зрэшты, homo homini lupus est, паводле маіх арытмэтычных падлікаў, – улюбёная прыказка ўніверсытэцкіх выкладчыкаў.

У Чэхава гераіні абураюцца: "Як можна насіць чырвоную сукенку зь зялёным пасікам!" Роля інтэлігенцыі – падказваць грамадзтву, што можна, а чаго нельга насіць. На жаль, мы прыйшлі да незалежнасьці з інтэлігенцыяй, тры чвэрці якой ня ведаюць, што такое, напрыклад, мазахізм. Невуцтва – не загана, гэта – стан, што перадаецца з пакаленьня ў пакаленьне. Калі інтэлігенцыя глядзіць мыльныя опэры ды чытае гараскопы, што і каму яна можа параіць? У краіне трыюмфуе імаралізм, а інтэлігенцыя з тэлеэкранаў дзеліцца рэцэптамі маркоўнае ікры, а народны пісьменьнік ва ўсіх газэтах скардзіцца, што яму няма за што наладзіць банкет на юбілей. Імпэрыя зла ўстае з труны – а інтэлігенцыя ану падцягваць: славянскія узы, славянская гордасьць, славянская сьмеласьць... Ну што зробім, мала шчэ нам было "ядзінства" ў цынкавых трунах.

Чортавы прагматыкі вядуць рэй паўсюль: у палітыцы, журналістыцы, навуцы. "Мы, канфармісты, з братняю Русьсю..." Мая кіеўская знаёмая Ларыса Багатык у 1989 годзе брала ўдзел у славутым галадаваньні ўкраінскіх студэнтаў за незалежнасьць. Так і прынесьлі яе аднойчы да бабулі, перабінтаваную транспаранцікам "Геть Ма-

Працяг на старонцы 22

Беларусы ў

У звароце да воінаў-інтэрнацыяналістаў прэзыдэнт А.Лукашэнка сказаў: "Мы нізка схіляем галовы перад вамі, воіны-інтэрнацыяналісты, перад памяццю вашых таварышаў, якія загінулі ці памерлі ад ранаў. Адыходзяць у мінуўшчыну лякальныя войны й ваенныя канфлікты, у якіх удзельнічалі грамадзяне Рэспублікі, але гора бацькоў, удоваў і дзяцей-сіротаў болем адгукаецца ў нашых сэрцах. Мы яшчэ раз пацьвярджаем сваю прыхільнасць да міру і заяўляем, што ніводзін салдат нашай дзяржавы больш ня будзе ваяваць, значыць, і гінуць у іншых краінах".

З працытаванага можна зрабіць выснову, што беларускія маткі й сапраўды перасталі атрымліваць труны зь целамі сваіх сыноў, якія загінулі ў чужых краёх за чужыя ім інтарэсы.

На жаль, гэта ня так. Беларускія жанчыны і сёньня аплакваюць сваіх сыноў, мужоў, братоў... Беларускія мужчыны працягваюць ваяваць у лякальных войнах за межамі Бацькаўшчыны. Гэтым разам у Чачэніі. Прычым, як у складзе фэдэральных войскаў Расеі, гэтак і ў шэрагах чачэнскіх паўстанцаў генэрала Дудаева.

На баку "фэдэралаў"

Ім блізу 25 гадоў ад нараджэньня. Паходзяць зь Беларусі. На момант распаду СССР вучыліся альбо завяршалі вучобу ў ваенных вучэльнях далёка ад беларускай тэрыторыі. Атрымаўшы дыплёмы, ня ўсе яны змаглі вярнуцца, каб служыць у Бацькаўшчыне. Многія нашыя суайчыньнікі прынялі грамадзянства Расеі і цяпер служаць у фэдэральных войсках гэтае краіны.

У сьнежні 1994 г. Масква пачала неабвешчаную вайну супраць народу Чачэніі. Пачала рукамі ня толькі расейцаў, але таксама й рукамі тых маладзенькіх салдат і афіцэраў, чые котлішчы засталіся ў незалежнай і таму пакуль нэўтральнай Беларусі. Магчыма, першы пуск ракетаў па Грозным зрабіў менавіта беларус...

Чачэнія-Беларусь: "груз дзьвесьце"

Беларускія газэты час ад часу зьмяшчаюць інфармацыю пра факты гібелі альбо ўзяцьця ў палон на расейска-чачэнскім фронце салдат і афіцэраў расейскай арміі, чые родныя жывуць у Беларусі. Так у лютым газэта "Звязда" паведаміла пра гібель 25-гадовага афіцэра расейскай арміі Аляксандра Рыбакова, труна зь целам якога прыйшла з Чачэніі ў Гомель. У гэтым горадзе наш зямляк скончыў школу, пасьля была Ташкенцкая вышэйшая агульнавайсковая камандная вучэльня. Служыў у Пермскай вобласьці. Калі Беларусь набыла статус незалежнай краіны, напісаў рапарт аб пераводзе на Радзіму, дзе жыве маці —Лідзія Ягораўна, работніца Гомельскага электрамэханічнага заводу. Замест пераводу ў Беларусь яго "перавялі" на пазыцыі расейскіх войскаў у Чачэніі. У выніку — сьмерць ні за што і бязьмежнае гора маці.

Паланёны, але не забіты

Кантрактнікаў чачэнцы ў палон амаль не бяруць —расстрэльваюць на месцы. А вось у прызваных паводле ўсеагульнага вайсковага абавязку шараговых расейскай арміі, якія трапляюць у рукі паўстанцаў, ёсьць шанец быць абмянянымі на ўзятых у палон чачэнцаў. Існуе таксама практыка, калі чачэнскі бок перадае паланёных расейскіх салдатаў на рукі іх маткам, якія дзеля вызваленьня сваіх сыноў сьцякаюцца ў Чачэнію з усёй Расеі, а таксама і з-за ейных межаў.

Напрыклад, Лідзія Іванаўна, маці ўзятага ў палон салдата Віталя Балякіна, выехала на пошукі сына ў Шатойскі раён зь беларускіх Баранавічаў. Два гады таму ейны сын быў прызваны ў расейскую армію з Далёкага Ўсходу, дзе ягоны айчым праходзіў службу ў якасьці афіцэра. Потым айчым-падпалкоўнік выйшаў у адстаўку й пераехаў зь сям'ёй у Беларусь, а салдат В.Балякін быў адпраўлены ў Чачэнію. Там яго і напаткаў чачэнскі палон. Застаецца надзея, што Лідзія Іванаўна адшукае сына й вернецца зь ім у Беларусь.

"Мама, не адпускай мяне ў Чачэнію"

Віталь С. нарадзіўся ў сям'і, якая належыць да старога беларускага роду. Скончыў школу ў мястэчку Будславе.

30 лістапада 1988 году, калі ў беларускай сталіцы па загадзе камуністычнага рэжыму міліцыя разганяла мірнае шэсьце грамадзянаў з нагоды сьвята Дзядоў, Віталь ужо вучыўся ў Маскоўскай вышэйшай камандной вучэльні дарожна-інжынэрных войскаў, якое знаходзіцца ў г. Балашыха.

Ужо на скрыжалях лёсу Савецкаму Саюзу было накрэсьлена разваліцца, ужо Віталевы аднагодкі расклейвалі па беларускіх гарадох і мястэчках улёткі, якія заклікалі дамагацца незалежнасьці, а ён яшчэ марыў, як пасля атрыманьня на плечы пагонаў малодшага лейтэнанта паедзе ў якую-небудзь Чыту, а потым і далей... Аднак Белавескія пагадненьні, факт ліквідацыі СССР і ўтварэньня СНГ унеслі свае карэктывы ў пляны афіцэра. Па невялікім часе давялося задумацца, што ён, малады й нежанаты, робіць у расейскім войску, якое ваюе ў Таджыкістане, Чачэніі, бярэ ўдзел у іншых лякальных канфліктах.

Першы рапарт на перавод у Беларусь Віталю С. дапамог напісаць беларускі афіцэр, з паходжаньня татарын. Ён вельмі хацеў дапамагчы хлопцу, казаў, што такія, як Віталь, патрэбныя беларускаму войску... На жаль, выйшла іначай. Пасьля другога рапарту Віталя адправілі ў Чачэнію. Трэцяе "прашэньне" начальства параіла не пісаць, бо, маўляў, звольнім з "воўчым білетам".

Летась перад Калядамі Віталь прыязджаў да бацькоў. Гаварыў, што ў Чачэніі ён ахоўваў прадуктовыя склады. Але выпіўшы аднойчы зь местачковымі хлопцамі крыху больш за норму, стаў раптам бушаваць, крычаць, што ён больш не паедзе ў Чачэнію, і ўсё прасіў маму не адпускаць яго.

Пяць дзён гасьцяваў старлей Віталь С. у Беларусі. Пяць дзён спаў ён у бацькоўскай хаце не распранаючыся. Празь дзень пасьля пахмельля мусіў выбірацца назад у Расею. Сказаў, што яго больш на Каўказ не пашлюць, што камандаваньне часьці абяцае даць капітана і кватэру ў падмаскоўным горадзе Балагое, і паехаў. Гэтыя зьвесткі зь біяграфіі 25-гадовага беларуса паведаміла мне ягоная сястра Вальжына, студэнтка БДУ. На яе кніжнай паліцы сярод падручнікаў заўважаю кнігу ў белай вокладцы пад назваю "Афганістан". Гаспадыня інтэрнацкага пакойчыка перахоплівае мой позірк і ўздыхае: "Пра Чачэнію, відаць, не напішуць. Там ваююць такія, як Віталь, альбо наёмнікі. Людзі, якія

расейска-чачэнскай вайне

самі выбіраюць свой лёс".

Я не згаджаюся, я кажу, што прыйдзе час, калі Бацькаўшчына прыме ўсіх сваіх дачок і сыноў, каб супольна будаваць рэальную беларускую дзяржаву... "Калі гэта будзе?" — перапыняе маю рыторыку сьветлавалосая дзяўчына, брат якой, інжынэр-маставік, служыць у расейскім войску, дзе афіцэры сьпяць не распранаючыся.

Авіятар

Пасьля Будслаўскае сярэдняе школы беларускі хлопец Франц А. скончыў Саратаўскую верталётную вучэльню. Мае жонку, сына двух з паловаю гадоў і аднапакаёвую кватэрку ў горадзе Растове. На Радзіме, у Беларусі, жывуць ягоныя й жончыны бацькі, родная сястра Ірэна выкладае беларускую мову ў школе.

У Чачэніі Франц А. служыць вахтавым мэтадам. На пачатку сакавіка ён ізноў зьбіраўся лячець туды. Жонка Алена, якая разам з сынам гасьцюе цяпер у Беларусі, паведаміла мне, што муж не страляе чачэнцаў. Ён выконвае на сваёй шрубакрылай машыне дапаможныя рэйсы: вывозіць забітых і параненых "фэдэралаў", дастаўляе прадукты, ваенныя грузы...

Францу дваццаць сем. Год службы ў Чачэніі ідзе яму за два. Праз колькі гадоў ён можа выйсці на пэнсію. Калі застанецца жывы.

Вось што пісаў Ф.Савіч у сваіх няскончаных успамінах пра каўкаскую высылку і ўцёкі зь яе:

"... Я рушыў з маёй партыяй праз Маздок у Кізьляр, куды быў прызначаны ў пяхотны Апшэронскі полк.



Новая жыцьцёвая сьцежка адкрылася перада мною — ваеннае жыцьцё, жыцьцё салдата. Я павінен быў страляць чаркесаў, якія мне й маёй Бацькаўшчыне не зрабілі нічога благога, павінен быў бараніць справу, якая супярэчыла маім перакананьням, ваяваць у шэрагах прыгнятальнікаў у вайне, якая вялася дзеля іх гонару і інтарэсаў. Я быў супраць тых, хто змагаўся за сваю незалежнасьць. Таму ня меў намеру зацята абараняць ні справу, якую не пераносіў, ні жыцьцё, якое мне стала абыякавым. Калі многія з нашых падчас бою выяўлялі цуды ваяўнічасьці, то не дзеля таго, каб атрымаць раны й ордэны ці зьнішчыць непрыяцеля, а дзеля таго, што жадалі заваяваць сабе магілу".

Уцёкшы з каўкаскае высылкі, Ф.Савіч аж да самае сьмерці мусіў хавацца ад царскіх уладаў. Мястэчка Янішпаль, што на Ўкраіне, стала ягоным апошнім прыстанкам. Тут ён заслужыў людзкую любоў і павагу, працуючы фэльчарам. Памёр падчас эпідэміі халеры, калі, ратуючы ад хваробы местачкоўцаў, захварэў і сам. Пахаваны ў Астроску. У Кіеве яму пастаўлены помнік.

Ссыльны Апшэронскага палка

У 1836 годзе беларус Францішак (Франц) Савіч утварыў у Вільні нелегальнае "Дэмакратычнае таварыства". Летам 1838 году ўладамі царскай Расеі ён разам зь сябрамі быў арыштаваны й прысуджаны да высылкі на Каўказ у салдаты бяз выслугі.

Чаму яны не вяртаюцца

Мой знаёмы Мікола М. з Як беларусу, які ўмеў лячыць і не хацеў забіваць невядомых яму чаркесаў у далёкім і невядомым Кізьляры, дзе, як ён пісаў, "адміністрацыйныя будынкі падобныя адзін да аднаго, як маскаль да маскаля".



Дому літаратара адказвае на гэтае пытаньне катэгарычна: бо не жадаюць, прагнуць зарабіць на генацыдзе чачэнцаў.

Думаю, аднак, што на пытаньне "Чаму некаторыя афіцэры-беларусы пасьля распаду СССР засталіся ў расейскім войску і ваююць у Чачэніі", адназначнага адказу няма. І потым, хіба ўжо згаданы Віталь С. самахоць паехаў у Чачэнію і зарабляе там "на охране продскладов" вялікія грошы? Якраз наадварот — яго выслалі на Паўночны Каўказ за тое, што асьмеліўся падаць два рапарты на перавод у Беларусь. Іншая рэч, што ён мог проста кінуць службу ў войску чужой яму краіны й вярнуцца на зямлю сваіх продкаў. Праўда, для гэтага трэба мець мужнасьць і дастаткова разьвітае нацыянальнае і грамадзянскае пачуцьцё.

Адна з істотных прычынаў таго, чаму расейскія афіцэры беларускага паходжаньня ня могуць вярнуцца ў Беларусь, — адсутнасьць у нашай дзяржаве палітыкі вяртаньня беларусаў з постсавецкіх прастораў ва ўлоньне беларускае мэтраполіі. Афіцыйны рэжым у нас сёньня заклапочаны адным — шляхам так званай інтэграцыі з Расеяй ліквідаваць рэальную незалежнасьць РБ. На тле такой прэзыдэнцкай палітыкі было б неразумна заклікаць беларусаў вяртацца ў Беларусь.

Калі Віталь С. рабіў неаднаразовыя спробы пакінуць расейскае войска, каб прадоўжыць службу ў Бацькаўшчыне, то Франц А., малодшы сын саўгаснага каваля, выяўляе, са словаў ягонае жонкі, імкненьне яшчэ крыху паслужыць у Чачэніі, крыху зарабіць. Маўляў, як бацька ён мусіць дбаць пра сям'ю. На маю думку, ён баіцца вяртацца ў Беларусь, дзе яму хутчэй за ўсё не прапануюць працу паводле спэцыяльнасьці — "цёплыя" месцы занятыя. А ў небе над Чачэніяй думаць ня трэба, там гэта супрацьпаказана. Там трэба дакладна ведаць інструкцыю, курс і мэту: з франтавых пазыцыяў забраць мёртвых, на пазыцыі закінуць жывых...

За свабоду Рэспублікі Ічкерыі

Аляксандар Кацуба нарадзіўся ў 1962-м. Мой аднагодак з гораду Веткі, што ў Гомельскай вобласьці. Працаваў трактарыстам у саўгасе "Веткаўскі", потым служыў у савецкім войску на тэрыторыі РСФСР, дзе й ажаніўся. Жыў зь сям'ёю ў Пскоўскай вобласьці.

Калі фэдэральныя войскі распачалі інтэрвэнцыю ў Чачэнскую Рэспубліку Ічкерыю, А.Кацуба добраахвотна паехаў у Грозны, каб ваяваць на баку генэрала Дудаева. Загінуў паміж 27 і 29 студзеня 1995 г. Цела знайшлі падчас замірэньня. Мясцовыя жыхары пахавалі добраахвотніка разам з чачэнскімі байцамі.

Пасьля таго, як стала вядома пра гібель А.Кацубы, у ягонага брата Сяргея веткаўская міліцыя адабрала пашпарт. Маўляў, каб ня ўздумаў і гэты сарвацца ў Чачэнію ды не пачаў помсьціць за родную кроў...

Чачэнская бойня працягваецца. Фэдэральныя войскі праводзяць "зачысткі" чачэнскіх сёлаў. Адно за адным. "Зачышчаюць" жанчын, дзяцей, калекаў, старых і нямоглых — усіх, хто не пасьпявае ўцячы, схавацца. "Гэтая вайна ніколі ня скончыцца", — кажуць веткаўцы, чые блізкія застаюцца ў Грозным.

Былыя знаёмцы пра А.Кацубу адгукаюцца не зусім добра. Нават ягоны родны брат кажа, што Алесь пайшоў "забіваць людзей за грошы". Думаю, аднак, што Сяргей памыляецца. Бо быў і застаецца неаспрэчны пастулят: ня ўсё вымяраецца грашыма. І калі заўтра ў гіпатэтычных беларускіх атрадах супраць гіпатэтычнага акупанта побач зь беларусамі будзе змагацца той жа чачэнец, які сёньня спакойна робіць свой бізнэс у нашай сталіцы, альбо літовец, украінец, латыш, то ці будзе іх асабістае змаганьне змаганьнем за грошы? Трэба думаць, што не, бо, ваюючы за нас і нашу свабоду, яны тым самым будуць ваяваць за свабоду сваіх народаў.

Іншая рэч — за што ваюе расейскі кантрактнік на баку фэдэральных войскаў? За што ён забівае чачэнцаў, якія прагнуць жыць сваім горскім одумам на сваёй зямлі?

Што да А.Кацубы, ураджэнца Беларусі, то мы ўжо ніколі дакладна не даведаемся, чаму ён выбраў такі спосаб "зарабіць".

Вы ваюйце, мы вам пасьпяваем

Летам гэтага году ў Менску на высьпе ракі Сьвіслачы, што побач з Траецкім прадмесьцем, будзе адкрыты помнік воінам-інтэрнацыяналістам, якія ваявалі ў Афганістане. Без сумневу, "падзею" абставяць зь вялікаю помпай. Прыедуць дзяржаўныя мужы, зьбярэцца "грамадзкасьць гораду". Некаторыя "афганцы" згадаюць, як вясною 86-га ў Траецкім яны "гасілі" навучэнцаў мастацкай вучэльні...

А вось кіраўнік ансамблю "Песьняры" Ў.Мулявін можа згадаць, як цёпла прымалі ягоны калектыў у канцы мінулага году на Пскоўшчыне. "Мулявінцы" выступалі пад лёзунгамі: "Россия. Порядок. Жириновский". "Раскручвалі" кандыдата ў Думу ад ЛДПР нейкага Міхайлава, рэдактара пскоўскага выпуску "Правды Жириновского". Як паведамляе названая газэта, дабрачынныя канцэрты "Песьняроў" арганізавала мясцовая філія ЛДПР, а сродкі, атрыманыя ад выступу беларускага ансамблю, накіраваныя на будаўніцтва помніка расейскім воінам-дэсантнікам, што знайшлі сваю сьмерць у Чачэніі.

Такім чынам знакаміты ВІА, які больш за дваццаць пяць гадоў сьпяваў цудоўныя беларускія песьні, многія зь якіх сталі народнымі, завяршае сваю кар'еру, ублытаны ў нячыстыя гульні расейскай унутранае палітыкі.

* * *

Чым менш улада дбае пра сваіх грамадзянаў, тым больш яна ставіць помнікаў. Таму ў дзень, калі ў Менску адкрыюць "афганскі" стод, мы абавязкова згадаем тых беларусаў, якія сёньня ваююць з абодвух бакоў расейска-чачэнскага фронту. Колькі іх? — гэтага ня ведае нават беларускі КГБ, дзе першым намесьнікам працуе нядаўні палкоўнік расейскае Фэдэральнае Службы Бясьпекі Леанід Ерын. Аналітыкі "на воку" называюць лічбу ў некалькі тысячаў. Паводле падлікаў аўтара гэтых радкоў, такая колькасьць не перабольшана.

Славамір Адамовіч

СЬВЕТ ЗА ТЫДЗЕНЬ

У Данблейне (Шатляндыя) ад рук звар'яцелага злачынцы Томаса Гамільтана загінулі 16 школьнікаў і іх настаўніца, якая спрабавала засланіць сабою аднаго з вучняў. Яшчэ 12 дзяцей былі параненыя. 43-х гадовы злодзей уварваўся ў пачатковую клясу, дзе праходзілі заняткі, і за тры хвіліны разрадзіў у дзяцей чатыры пісталеты, а пасьля застрэліўся сам. З 29 вучняў толькі адзін унікнуў стрэлаў.

Як стала вядома, маньяк знаходзіўся пад наглядам паліцыі ўжо некалькі гадоў. У 1974 годзе яго выключылі з руху бой-скаўтаў за "неадэкватныя і, магчыма, за незаконныя паводзіны". Падставай паслужыла скарга, якую некаторыя бацькі напісалі на Гамільтана пасля таго, як дзеці правялі зь ім тыдзень у летнім лягеры. Гамільтан неаднаразова спрабаваў апратэставаць рашэньне ўладаў. За некалькі дзён да забойства ён зьвярнуўся асабіста да каралевы Элізабэты II — апякункі скаўтаў. Дарэчы, ліст быў напісаны на добрай ангельскай мове з усімі правіламі этыкету. Але станоўчага выніку не атрымаў. Тады ён выказаў пратэст гэткім вось чынам.

У Вялікабрытаніі існуе даволі строгая сыстэма правілаў валоданьня зброяй. Зброю нельга мець былым зьняволенным. А набываць і мець зброю дома могуць выключна сябры стралковых клюбаў. Гамільтан быў сябрам аднаго зь іх. Апроч зброі, ён захапляўся фатаграфіяй. У 80-х гадох ён кіраваў атлетычнымі гурткамі для хлопчыкаў 9-14 гадоў і падчас заняткаў часта іх фатаграфаваў. Пры гэтым ён патрабаваў, каб дзеці здымалі саколкі. А пасля заняткаў спрабаваў праводзіць каго-небудзь з вучняў дахаты, каб напрасіцца ў госьці.

Уся Вялікабрытанія была шакаваная жахлівым здарэньнем. Дырэктар школкі, дзе адбыліся забойствы, сказаў: "Нас наведаў д'ябал". Гэтае здарэнне нагадвае падзею 1987 году, калі 27-гадовы Майк Райн забіў 16 чалавек, а пасля застрэліўся сам. У нядзелю па ўсёй краіне праходзілі жалобныя мерапрыемствы, у якіх удзельнічала сама каралева. У панядзелак адбылося пахаваньне забітых.

Абстаноўка вакол вострава Тайвань надалей застаецца складанай. Кітайцы працягваюць вайсковыя манэўры паблізу тэрытарыяльных водаў Тайваня. Яны зрабілі шэраг ракетных стрэлаў, прычым ракеты падалі і выбухалі ў тэрытарыяльных водах астраўной дзяржавы. Прычынай для манэўраў сталася жаданьне мільярднага Кітаю напалохаць свайго суседа з насельніцтвам трохі большым за 20 мільёнаў напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў у Тайвані. Кітай, як вядома, не прызнае самастойнасьці суседняй дзяржавы, дзе жывуць тыя ж кітайцы.

Рэч у тым, што пасьля збройнай перамогі ў 1949 годзе ў Кітаі камуністаў былая да таго адміністрацыя Гаміньдану (у перакладзе — нацыянальная партыя) на чале з генэралісымусам Чан Кайшы знайшла прытулак на востраве Тайвань. У 1971 годзе Тайвань быў пазбаўлены сяброўства ў ААН і ягонае месца адышло камуністычнаму Кітаю. Супрацьстаянне паміж Кітаем і Тайванем узмацняецца яшчэ і тым, што паміж Тайванем і ЗША існуе дамова аб узаемнай бясьпецы. І Злучаныя Штаты недвухсэнсоўна заявілі пра намер бараніць свайго саюзьніка ад мільярднага суседа ўсімі магчымымі сродкамі. Дэманстрацыю Кітаем сілы ў вялікай ступені можна растлумачыць унутранай нестабільнасьцю камуністычнага рэжыму ў краіне, дзе пачалося змаганьне за лідарства, каб заступіць месца нямоглага правадыра Дэна Сяопіна.

Тайваньскі ўрад аддаў загад на прывядзеньне войска ў стан павышанай баявой гатоўнасьці. Атмасфэру яшчэ больш напаліла пастанова Пэкінскіх уладаў пра эвакуацыю жыхароў невялікіх астравоў, што знаходзяцца ў зоне вучэньняў. Сьледам за гэтым пачаліся масавыя ўцёкі з астравоў, што належаць Тайваню. Для тых нешматлікіх, хто застаецца, наладжаныя курсы грамадзянскае абароны. Цяпер у гэтым раёне знаходзяцца караблі другога морскага флёту ЗША. Такой амэрыканскай ваенна-морскай армады ня бачылі тут з часоў Віетнамскай вайны. Прэм'ер дзяржсавету КНР Лі Пэн у незвычай рэзкай форме засьцярог Вашынгтон ад умяшальніцтва ў канфлікт.

Заходнія карэспандэнты адзначылі, зь якой самаўпэўненасцю трымаўся кітайскі прэм'ер, адказваючы на пытаньні журналістаў. Таксама ён рашуча абверг паведамленьні амэрыканскіх СМІ аб жаданьні Пэкіну знайсьці кампраміс. Прадстаўнік МЗС Кітаю заявіў: "Калі хто-небудзь паспрабуе абвесьціць незалежнасьць Тайваня, ці якая-небудзь замежная дзяржава парушыць межы КНР, да якіх, вядома ж, адносіцца і Тайвань, то Кітай выкарыстае ўсе наяўныя ў яго сродкі для абароны свайго сувэрэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасьці". У Пэкіне далі зразумець, што гэтыя пагрозы не зьяўляюцца пустымі словамі. Паводле канфідэнцыйных крыніцаў, кітайцы маюць намер, у выпадку канфлікту з ЗША, нанесьці атамны ўдар па Лёс-Анжэлесе. Праўда, афіцыйныя кітайскія колы гэта абвяргаюць, называючы дэманстацыю сілаў у Паўднёва-Кітайскім моры звычайнымі вучэньнямі.

Што будзе, калі пачнуцца баявыя дзеяньні, уявіць няцяжка. Ёсць прыклады Карэі ды Віетнаму, а з улікам наяўнасьці ў Кітая балістычных ракетаў зь ядравымі баегалоўкамі, на памяць прыходзіць колішні амэрыканскі бэстсэлер "Трэцяя сусьветная вайна".

У Чачэніі працягваліся баявыя дзеяньні. Прэзыдэнт Рэспублікі Ічкерыі Джахар Дудаеў даў інтэрвію для замежных журналістаў у адным з засакрэчаных месцаў на поўдні Чачэніі. Ён сказаў, што нядаўні напад ягоных байцоў на раён Грозанага — "усяго толькі невялікая трэніроўка напярэдадні буйной апэрацыі".

Між тым у прыгарадах Грознага працягвалася страляніна. Дзеяньні расейскіх войскаў ускладняюць чачэнскія снайпэры, якія заселі на дахах дамоў. Самым эфэктыўным спосабам змаганьня зь імі расейцы лічаць артылерыю, і на вінтовачныя снайпэрскія стрэлы адказваюць гарматнымі "снайпэрскімі" стрэламі. У выніку руйнуюцца дамы і гінуць цывільныя людзі. Дастаецца мірным жыхарам ня толькі ад непасрэдных баявых дзеяньняў. "Пабочныя эфэкты" вайны бываюць ня менш трагічныя. Часам людзі баяцца пахаваць нябожчыка, што раскладаецца на вуліцы, атручваючы навакольле смуродам. Баяцца, бо ўжо здараліся выпадкі, калі трупы на вуліцах былі замінаваныя.

У Грэцыі, наадварот, вайна толькі закончылася. Праз 24 стагодзьдзі грэцкія гарады Атэны ды Спарта афіцыйна заключылі дамову пра сканчэньне Пэляпанэскай вайны (431-404 гады да н.э.). Як паведамляе газета "Бизнес&Балтия", адпаведны акт быў падпісаны ў Спарце яе мэрам Дымітрысам Маталясам і мэрам Атэнаў Дымітрысам Аўрамопулясам.

Тады ў вайне ўдзельнічалі Атэны, якія былі на чале некалькіх сотняў гарадоў-дзяржаваў (так званы Дэлёскі саюз), і, зь іншага боку, Спарта, што была на чале Пэляпанэскага саюзу, у які ўваходзіла большасьць полісаў Пэляпанэсу. Калі ня браць пад увагу кароткачасовыя пярэрвы, то гэтая вайна доўжылася ажно 27 гадоў, прычым непасрэдныя актыўныя дзеяньні паміж галоўнымі напрыяцелямі — Атэнамі і Спартаю — ішлі блізу 20 гадоў без відавочнай перавагі якога-небудзь з бакоў. У 404 годзе да н.э. Атэны, абкладзеныя з сушы ды мора, капітулявалі. Доўгія сьцены — апірышча атэнскай незалежнасьці, былі зруйнаваныя, у грэцкім сьвеце прызнавалася гегемонія Спарты. У Атэнах быў усталяваны алігархічны рэжым трыццаці валадароў, што ўвайшоў у гісторыю як урад "трыццаці тыранаў".

У нядзелю прэзыдэнт Казахстану Назарбаеў адным з апошніх выказаўся наконт рашэньня расейскай Думы аб дэнансацыі Белавескіх пагадненьняў. Відаць, Назарбаеў чакаў, пакуль наконт гэтага выкажуцца прэзыдэнт Расеі Ельцын ды ягоныя апанэнты ў Думе. І толькі пасьля гэтага Назарбаеў у рэзка асудзіў рашэньне Думы разам зь ягонымі аўтарамі.

Ён сказаў: "Развал СССР пачаўся далёка да белавескіх падзеяў, у той момант, калі апаратчыкі з расейскай камуністычнай партыі вырашылі аддзяліць кампартыю Расеі ад КПСС. А КПСС была каркасам. А каркас, як вядома, быў на той час разбураны. Да чаго цяпер імкнуцца тыя ж сілы? Разьяднаць дзяржавы СНГ, пасеяць атмасфэру неспакою й недаверу, разбурыць СНГ..." Назарбаеў сказаў, што спробы аднавіць былы СССР пагражаюць дэстабілізацыяй і могуць выклікаць кроў на ўсёй яго тэрыторыі. Гэтыя словы ён казаў па-расейску для замежных журналістаў. А у выступе ў нацыянальнай тэлевізіі ён сказаў па-казахску (пераклад радыё "Свабода"): "Калі нехта думае, што мы хочам мець адносіны з Расеяй з-за нашай слабасьці, то гэта ня так. Мы нізавошта не адмовімся ад незалежнасьці, пра якую марылі нашыя дзяды і бацькі. Як кіраўнік дзяржавы, я буду выконваць тое, што напісана ў нашай канстытуцыі і заяўляю, што Казахстан будзе адстойваць сваю незалежнасьць у любым выпадку, а калі якія-небудзь партыі ці арганізацыі мараць аднавіць СССР, што накіравана супраць тэрытарыяльнай цэласнасьці Казахстану і ягонага сувэрэнітэту, то я як прэзыдэнт буду вымушаны забараніць дзейнасьць такіх партыяў у Казахстане, а супраць іхных лідараў ужыць адпаведныя захады".

У адрозненьне ад ангельцаў і шатлянцаў ірлянцы ўсяго сьвету наадварот сьвяткавалі. У нядзелю быў Дзень Сьвятога Патрыка — апекуна Ірляндыі. Сьвяты Патрык — місіянэр і апостал Ірляндыі — сымбаль нацыянальнай еднасьці ўсіх ірлянцаў.

Па ўсім свеце, дзе жывуць ірлянцы, адбыліся карнавальныя шэсьці і масавае расьпіваньне піва. Нават у Маскве спэцыяльным рашэньнем ураду гораду на тры гадзіны быў спынены рух транспарту па Новым Арбаце, каб даць месца сьвяточнаму параду. Арганізатары сьвята — ірлянцкія пабы ды рэстарацыі ў Маскве, якія рабілі гэта збольшага ў рэклямных мэтах, арганізавалі бясплатнае паеньне півам. Народныя гуляньні былі чыста ў расейскім стылі. Побач з тузінам Сьвятых Патрыкаў маскоўскую публіку забаўлялі расейскія



скамарохі ды Дзяды Марозы.

А ў Ганконгу ў гэтую нядзелю адываўся штогадовы забег афіцыянтаў. Болей за 400 афіцыянтаў з усяго сьвету зьехаліся для таго, каб вызначыць, хто зь іх найспрытнейшы. Яны мусілі прабегчы стомэтроўку, трымаючы на далоні спод з бутэлькай ды чаркай на высокай ножцы. Пры гэтым яны мусілі ўсьміхацца і мець прыязны выраз твару. Зьнешне ўсё павінна было выглядаць, нібы яны абслугоўвалі кліента, але бегчы мусілі як сапраўдныя атлеты. Натоўпы заўзятараў, што прыехалі разам з афіцыянтамі, падбадзёрвалі сваіх землякоў. Пераможцам стаў афіцыянт з Паўднёвай Карэі. Беларускіх афіцыянтаў там заўважана не было.

У мінулыя выхадныя натоўпы немцаў сабраліся ў Бэрліне каля былога будынку ГДРаўскага КГБ — "Штазі". Цяпер тут знаходзіцца гэтак званае ведамства Гаўка, якое займаецца захаваньнем і вывучэньнем архіваў усходненямецкіх спэцслужбаў. Як паведаміла "Нямецкая Хваля", тут праводзіўся дзень адчыненых дзьвярэй.

Ахвотных прайсці ў гэтыя адчыненыя дзьверы было гэтулькі шмат, што журналісты ахрысьцілі гэта другім штурмам "Штазі". Першы, як вядома, адбыўся ў студзені 1990 году падчас масавых пратэстаў супраць хонэкераўскага рэжыму, які неўзабаве і сканаў. Тады натоўп прагнаў зьляканых вартаўнікоў, і разьятраныя немцы пачалі граміць у будынку ўсё, што патрапіцца пад руку, перакульваючы шафы ды вывальваючы на падлогу стосы папераў. На гэты ж раз усё было нашмат больш прыстойна. Хаця патрапіць у будынак "Штазі" імкнулася блізу 25 тысячаў чалавек.

Паводле нямецкіх законаў, кожны грамадзянін мае права азнаёміцца з асабістаю справай, заведзенай на яго дзяржбясьпекай ГДР. Болей за мільён чалавек ужо накіравалі

№ 2/96
22-28 сакавіка

ШТОТЫДНЁВЫ
ІНФАРМАЦЫЙНЫ
ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ
НАША НІВА

інфармацтар НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы - штотыдзень 12 палосаў патрэбнае інфармацыі

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ
ЗАБЕСЬПЯЧЭННЕ
BELARUSIAN PUBLIC
RELATIONS ASSOCIATION

БІРЖА ПРАЦЫ • КНІГІ • РЫНАК • ТРАНСПАРТ • АДПАЧЫНАК • АДУКАЦЫЯ • СПАЖЫВЕЦ • ЗДАРОЎЕ • КІНО • ТБ • ТЭЛЕСАТ • РАДЫЁ • СПОРТ • МУЗЫКА • ЗА МЯЖОЮ

Эканамічнае становішча ў народнай гаспадарцы гораду застаецца складаным. Працаўнікі ўсё часьцей вымушаны звальняцца на сваё жаданьне ў пошуках працоўных месцаў з больш прыймальнымі ўмовамі найманьня. Пра асноўныя вынікі працы народнае гаспадаркі г.Менску ў студзені-сьнежні 1995 г., а таксама пра дзясяткі новых вакансіяў, якія прапануюць арганізацыі, прадпрыемствы і ўстановы ў нашай

Біржы працы чытайце на стар. **2**

Платная адукацыя ў Менску.
Недзяржаўныя ВНУ.
300 - 600$ — сярэдні кошт аднаго навучальнага году ў менскіх камэрцыйных ВНУ.

▶5

Напрыканцы **сакавіка** ў розных краінах сьвету адбудуцца адукацыйныя выставы і лінгва-кірмашы. Яны, безумоўна, выклічуць вялікую зацікаўленасьць беларускіх фірмаў і агентаў, якія адпраўляюць беларусаў на навучаньне за мяжу і ў тых, хто шукае новых партнэраў і новыя праграмы. На такіх выставах прадстаўлены ўсялякія магчымыя навучальныя ўстановы з усяго сьвету - моўныя курсы ды каледжы, універсытэты й школы, прафэсійныя курсы і інстытуты. Акрамя таго, дзяржаўныя адукацыйныя арганізацыі звычайна прэзэнтуюць на іх свае стыпэндыяльныя праграмы, праграмы абмену школьнікамі, студэнтамі, прафэсіяналамі. Тыя выставы, што маюць адбыцца:

22-24 сакавіка: Варшава, **міжнародная канфэрэнцыя і выстава адукацыі, навучальных сродкаў і абсталяваньня "Edukacja"**, праводзіць яе *ICEF* (International Consultants for Educational and Fairs);

23-25 сакавіка: Сэул, **Карэйскі студэнцкі кірмаш**, міжнародная выстава вышэйшай адукацыі і лінгва-кірмаш, арганізатар *ICEF*;

29-31 сакавіка: тая ж фірма *ICEF* ладзіць у Тайвані міжнародную выставу **"Адукацыя, мовы і навучальныя сродкі"**.

У рубрыцы **Транспарт** — расклад руху прыгарадных цягнікоў на станцыі Менск-Пасажырскі, а таксама — "Колькі каштуе праехаць электрычкай да свайго лецішча?" **Чытайце на старонцы 11**

рэйтынгі — сёньня: 10 самых папулярных сынглаў, фільмаў і відэафільмаў нямецкага каналу VIVA

UK - SINGLES 11.3.96

СЫНГЛ	Папярэдняе месца на хіт-парадзе	ВЫКАНАЎЦА
1) **"How Deep is Your Love"**	*new*	**Take That**
2) **Don't look Back**	*(1)*	**Oasis**
3) **Children**	*(2)*	**Robert Miles**
4) **Coming Home Soon**	*new*	**Boyzone**
5) **Going Out**	*new*	**Supergrass**
6) **Passion**	*new*	**Gat Decor**
7) **Anything**	*(3)*	**3 T**
8) **Good Thing**	*new*	**Eternal**
9) **I wanna Be a Hippy**	*(6)*	**Teginohead**
10) **I Got 5 on it**	*(7)*	**Luniz**
11) **Falling into You**	*(10)*	**Celine Dion**
12) **These DCys**	*new*	**Bon Jovi**
13) **Lifted**	*(8)*	**Lighthouse Family**
14) **Spaceman**	*(4)*	**Babylon Zoo**
15) **Give Me A Little...**	*(14)*	**Gabrielle**
16) **Out of the Sinking**	*new*	**Paul Weller**
17) **Be As One**	*new*	**Sasha & Maria**
18) **Too Much Love...**	*new*	**Queen**
19) **Disco's Revenge**	*(9)*	**Gusto**
20) **Ready Or Not**	*new*	**Lighting Seeds**

ДЗЯСЯТКА НАЙЛЕПШЫХ ФІЛЬМАЎ У НЯМЕЦКІМ ХІТ-ПАРАДЗЕ

Назоў фільму	Жанр	Кінастудыя
1) **Mannerpension**	*камэдыя*	**(Delnhi)**
2) **Dangerous Minds**	*драма*	**(Buena Vista)**
3) **James Bond—Goldeneye**	*трылер*	**(UIP)**
4) **Ein Schweinchen namens Babe**	*камэдыя*	**(UIP)**
5) **Copykill**	*трылер*	**(Warner Brothers)**
6) **Ein Geschenk des Himmels**	*камэдыя*	**(Buena Vista)**
7) **Abbuzze!**	*камэдыя*	**(Constantin)**
8) **Money Train**	*action*	**(Col. Tr.Stcr.)**
9) **Ein amerikanischer Quilt**	*драма*	**(UIP)**
10) **Mortal Kombat**	*action*	**(UIP)**

ДЗЯСЯТКА ПАПУЛЯРНЫХ ВІДЭАФІЛЬМАЎ

Назоў фільму	Жанр	Кінастудыя
1) **Bad Boys-Harte Jungs**	*action*	**(Columbia)**
2) **Judge Dredd**	*SciFi*	**(VCL)**
3) **Stirb langsam 3**	*action*	**(Buena Vista)**
4) **Wahrend Du schliefst**	*камэдыя*	**(Buena Vista)**
5) **Crimson Tide**	*трылер*	**(Hollywood)**
6) **Batman Forever**	*action*	**(Warner)**
7) **The Shooter**	*act/трылер*	**(Starlight)**
8) **Stargate**	*SciFi*	**(Fox)**
9) **Drop Zone**	*трылер*	**(LIC)**
10) **Street Fighter**	*action*	**(Columbia)**



Французскі спадарожнікавы канал
MONTE CARLO MUSIK

▶▶9

прэзэнтуе 22 сакавіка:
22/03 **Сэлін Дыён** 23-24/03 **Tears for Fears** 25/03 **ENIGMA** 26/03 **The Smith** 27/03 **Лені Кравіц** 28/03 **Laurent Voulzy** 29/03 **Дзукера** 30-31/03 **Тына Тэрнэр**

Падпіска на газэту **"НАША НІВА"** праз пошту і "САЮЗДРУК" — індэкс **63125.** Падпіска празь недзяржаўную сетку дастаўкі — тэлефон **29-22-10** *(Цыбульскі Леанід)*.

25 сакавіка ў *Галівудзе* адбудзецца ўрачыстае ўзнагароджаньне *Оскарамі* за дасягненьні ў галіне кіно. У гэтую ноч на хвалю *Оскараў* наладжваецца ўся плянэта і гэты факт не патрабуе ніякіх камэнтароў. Узнагароджваньне *Оскарамі* дае матэрыял для роздуму, спрэчак, пытаньняў, пярэчаньняў, стварае патрэбу даведацца пра некаторыя дэталі і падрабязнасьці ... словам, аб *Оскарах* варта паразмаўляць. І менавіта гэта **"Голас Амэрыкі"** прапануе Вам ажыцьцявіць.

Увага: ў аўторак, **26 сакавіка**, у эфіры на працягу гадзіны будзе гучаць спэцыяльная праграма, прысьвечаная амэрыканскаму кінэматографу, у якой слухачы змогуць прыняць непасрэдны ўдзел. У Вас ёсьць унікальная магчымасьць зьвязацца з **"Голасам Амэрыкі"** праз тэлефон і задаць пытаньне, якое Вас цікавіць, непасрэдна ў эфіры. Тэлефанаваць трэба наступным чынам: спачатку трэба набраць маскоўскі нумар **8-095-938-61-33**. Вам адкажа апэратар, якога Вы папросіце зьвязаць Вас з *Вашынгтонам* за кошт **"Голасу Амэрыкі"** (тэлефон калектыўны). Нумар тэлефону ў Вашынгтоне: **202-619-31-11**. Пры гэтым Вы плаціце толькі за званок на маскоўскі нумар, за званок у Вашынгтон плоціць **"Голас Амэрыкі"**.

Расклад **"Голасу Амэрыкі"**, а таксама іншых радыёстанцыяў глядзіце на старонцы **10**

Рынак на стадыёне "ДЫНАМА". 20 сакавіка.
Глядзіце на старонцы **3**

Кошты на [illegible] ў газэце "НАША НІВА" і інфармацыйным дадатку "ІНФАРМАТАР"

	"НАША НІВА"	"ІНФАРМАТАР"
Базавая стаўка ч/б	0,5$ см.кв.	0,4$ см.кв.
Замова ў рэклямным бюро	0,5$ см.кв.	0,4$ см.кв.
Замова праз тэлефон	0,6 $ см.кв.	0,5 $ см.кв.
Першая паласа	ч/б - 1$ см.кв. Колер - (ня менеў за 100 см.кв.) - 2,5$ см.кв.	ч/б - 0,9$ см.кв.
Радковая рэкляма на паласе "Біржа працы"		5.000 руб. (зьмяшчаецца запар у двух нумарах)
Колер	ня менеў за 50 см.кв. - 1$	ня менеў 20 см.кв. - 1,5$ см.кв.
TV-праграма		ч/б - 1$ см.кв. колер - 1,5$ см.кв. (ня менеў за 50 см.кв.)

Замовіць рэкляму можна праз тэлефон 36-76-75 з 10.00 да 20.00 штодня, ці на адрасе: вул.Пуліхава, 29, кв. 61 да 18.00.

Пры гэтых коштах ня ўлічваецца выраб арыгінал-макету.

Падпісны кошт **12.000 на месяц**
36.000 на квартал

*** Прадугледжаны скідкі на колькасьць выхадаў і плошчу рэклямных аб'явaў**

НОВЫЯ ВАКАНСІІ Й ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ

ГРУПА "ПРАЦА БЕЗ СПЭЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ"

ЭКСПЭРЫМЭНТАЛЬНА-КАНСТРУКТАРСКАЕ БЮРО МАШЫНАБУДАВАННЯ, вул. Брэсцкая, 34, тэл. 77-72-53

Габляр.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны. Габляр-дзяўбнік.

ЗАВОД (ВЭЗ) НВА "МЭХЖЫЎТЭХАБСЛУГОЎВАННЕ", вул. Сьцебянёва, 20, тэл.75-65-51

Фрэзероўнік 5-6 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак 1.000.000 руб.

ЗАВОД "СЬВЕТАКОМ", вул. Чыгуначная, 27/3, тэл. 26-31-75

Наладнік такарных аўтаматаў.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак 1.000.000 руб.

ЗАВОД МАТОРНЫ, вул. Ваўпшасава, 4, тэл. 38-74-32

Фрэзероўнік.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 4 чалавекі. Адукацыя сярэдняя. Заробак 1.500.000 руб.

МЕНСКІ ТРАКТАРНЫ ЗАВОД (МТЗ), вул. Даўгабродзкая, 29, тэл. 30-42-23

Токар-карусэльнік.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя. Заробак дамоўны. Габляр-дзяўбнік.

ЗАВОД (ВЭЗ) НВА "МЭХЖЫЎТЭХАБСЛУГОЎВАННЕ", вул. Сьцебянёва, 20, тэл.75-65-51

Фрэзероўнік 5-6 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак 1.000.000 руб.

ЗАВОД СРОДКАЎ КОМПЛЕКСНАЙ АЎТАМАТЫЗАЦЫІ, вул. Ляшчынскага, 8, тэл. 58-71-23

Фрэзероўнік.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 3 чалавекі. Заробак дамоўны.

ХІМІКАТЭХНАЛАГІЧНЫ ЦЭНТАР АКАДЭМІІ НАВУК РБ, вул. Жодзінская, 16, тэл. 64-11-16

Токар 5-6 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 2 чалавекі. Сярэдне-спэцыяльная, сярэдняя адукацыя. Заробак 700.000 руб. Пэнсіянэр.

"АРВІТ" НПА ТАА, пр. Партызанскі, 95, тэл. 45-15-84

Токар 5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 5 чалавек. Заробак 1.500.000 руб.

Токар-паўаўтаматчык 5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 5 чалавек. Заробак 1.500.000 руб.

Фрэзероўнік 5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 5 чалавек. Заробак 1.500.000 руб.

УПРАВА РБК АП "БЕЛЦЕПЛАІЗАЛЯЦЫЯ", вул. Чапюскінцаў, 19, тэл. 43-41-13

Стрэшнік 3-4 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 3 чалавекі. Заробак 3.000.000 руб.

АБ'ЯДНАННЕ "БЕЛКААПРАГРЭС", вул. Гало, 48а, тэл. 66-03-56

Сталяр.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны.

УПРАВА РБК ВА "МЕНСКРАМБУД" ФРУНЗЭНСКАГА Р-НУ, вул. Маўра, 49, тэл. 52-04-28

Тынкоўнік.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 4 чалавекі. Заробак 1.500.000 руб.

Сталяр

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 4 чалавекі. Адукацыя сярэдняя. Заробак 1.500.000 руб.

УПРАВА РБК ВА "МЕНСКРАМБУД" КАСТРЫЧНІЦКАГА Р-НУ, вул. Рабкораўская, 14, тэл. 25-15-32

Маляр.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

Муляр.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

ЗАВОД МАЛОЧНЫ N2 АРАНДАТАР (ГМЗ N2), пр. Партызанскі, 10-ы кілямэтар, тэл. 44-27-62

Электрагазазварнік (газаэлектразварнік) 5-6 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак 1.000.000 руб.

ДРУКАРНЯ МЕНСКСЕЛЬГАСПРАДУ, вул. Р.Люксэмбург, 69а, тэл. 26-50-29

Маляр.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 2 чалавекі. Заробак 2.000.000 руб.

КІРАЎНІЦТВА СПРАВАМІ ЗАГАДЧЫКА ГУ МІНІСТЭРСТВА АБАРОНЫ РБ, вул. Камуністычная, 14, тэл. 37-28-75 (пасьля 17.00)

Электрагазазварнік (газаэлектразварнік) 5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 2 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. 3 досьведам працы ня менш за 5 год.

ЗАВОД "КРЫЁН", вул. Сярова, 8, тэл. 75-22-81

Тынкоўнік.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны.

БЕЛАЎТАМАТАСЭРВІС, вул. Брэсцкая, тэл. 77-08-33

Электрагазазварнік (газаэлектразварнік) 5-6 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 5 чалавек. Заробак дамоўны.

МЕНСКІ ТРАКТАРНЫ ЗАВОД (МТЗ), вул. Даўгабродзкая, 29, тэл. 30-42-23

Электрагазазварнік (газаэлектразварнік).

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя. Заробак дамоўны.

КІРАЎНІЦТВА МК N5 МАНТАЖНАЕ, вул. Казлова 20, тэл. 36-94-54

Электрагазазварнік (газаэлектразварнік) 5-6 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. 3 досьведам працы ня менш за 5 год. Варыць трубы.

ВУЧЭЛЬНЯ ВТВ (ВЫШЭЙШАЯ ТЭХНІЧНАЯ ВУЧЭЛЬНЯ) ПТВ N115 ВВ-1, вул. Ваўпшасава, 23, тэл. 46-35-25

Сталяр.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Адукацыя сярэдняя. Заробак 700.000 руб. Рамонт мэблі.

УПРАВА РБК "БЕЛРАМБУДМАНТАЖ" ВА "БЕЛОМА", пр. Скарыны, 76а, тэл. 66-06-29

Муляр-тынкоўнік 4-6 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Адукацыя сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб.

КІРАЎНІЦТВА СПРАВАМІ ЗАГАДЧЫКА ГУ МІНІСТЭРСТВА АБАРОНЫ РБ, вул. Камуністычная, 14, тэл. 37-28-75 (пасьля 17.00)

Электрагазазварнік (газаэлектразварнік) 5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 2 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. 3 досьведам працы ня менш за 5 год. Зьвяртацца на тэл. 68-37-29.

Абліцоўнік-плітачнік 4-5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 9 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. 3 досьведам працы ня менш за 5 год. Зьвяртацца на тэл. 68-37-29.

Маляр 4-5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. 3 досьведам працы ня менш за 5 год.

СУД ГАСПАДАРЧЫ ВЫШЭЙШЫ РБ, вул. Валадарскага, 8, тэл. 29-22-27

Сталяр.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак 560.000 руб.

"РАМДРЭЎГ", вул. Валгаградская, 18, тэл. 66-62-28

Сталяр-станочнік.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 2 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак да 1.000.000 руб. 3 досьведам працы.

"САПО" МП, вул. Ангарская, 1, тэл. 42-89-69

Электразварнік ручной аргонна-тукавае зваркі 5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак 1.500.000 руб.

"АЛІМАР" ВКП, вул. Ротмістрава, 62, тэл. 44-02-09

Стрэшнік-бляхар.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 6 чалавек. Заробак дамоўны. Зьвяртацца на тэл. 44-02-09. Сумяшчаць з працай цесьляра.

БЮРО КАНСТРУКТАРСКАЕ ВП "БЕЛІНВАТЭХ", зав. Калініна, 7, тэл. 66-69-57

Электрагазазварнік 5-6 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. 3 досьведам працы ня менш за 5 год.

ПРАДПРЫЕМСТВА БЕЛАТЭП АП, вул. Стралковая, 14, тэл. 27-39-84

Электрагазазварнік (газаэлектразварнік).

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 2 чалавекі. Заробак дамоўны.

УПРАВА БК-211 ТРЭСТУ N35, вул. Я.Коласа, 38, тэл. 31-68-29, 68-37-29

Сталяр 4-5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 5 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. 3 досьведам працы ня менш за 5 год.

Паркетнік 4-5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. 3 досьведам працы ня менш за 5 год. Зьвяртацца на тэл. 68-37-29.

Абліцоўнік-плітачнік 4-5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 9 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. 3 досьведам працы ня менш за 5 год. Зьвяртацца на тэл. 68-37-29.

Маляр 4-5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 3 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб. 3 досьведам працы ня менш за 5 год.

БУДІНАВАЦЫЯ ГМП ПРЫ КААПЭРАТЫВЕ "БУДАЎНІК", пр. Ф.Скарыны, 76а, тэл. 66-49-21, 66-34-48

Электрагазазварнік 5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 2 чалавекі. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак 2.000.000 руб. Зварка трубаправоду. Сантэхнік.

ЛЯТАР ЗАТ, вул. Мясьнікова, 86, тэл. 20-61-03

Тынкоўнік.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны.

ГРУПА "ВУЗКІЯ СПЭЦЫЯЛЬНАСЬЦІ"

"НОВЫ ЧАС" КААПЭРАТЫЎ, вул. Палявая, 2а, тэл. 21-98-64, 24-14-66

Каменячос-гранітнік.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 25 чалавек. Заробак дамоўны.

"КАМЛЕЯ" КАЛЕКТЫЎНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА, вул. Артылерыстаў, 16, тэл. 24-45-41

Закройнік мужчынскае вопраткі.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны.

Закройнік летніх жаночых сукенак.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны.

БЕЛВЭСТПРАМ ТАА ВКФ, вул. Ясеніна, 10, тэл. 72-00-54

Швачка складанага асартымэнту.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 6 чалавек. Заробак дамоўны. З досьведам працы.

КІРАВАНЬНЕ БУДАЎНІЧАЕ БК 211 ТРЭСТУ N35, вул. Я.Коласа, 38, тэл. 31-68-29, 68-37-29

Мазаічнік 4-5 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак 1.500.000 руб.

БУДІНАВАЦЫЯ ГНП ПРЫ КААПЭРАТЫВЕ "БУДАЎНІК", пр. Ф.Скарыны, 76а, тэл. 66-49-21, 66-34-48

Аздобнік 4 ступені.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак да 2.000.000 руб.

УНІВЭРСЫТЭТ ЛІНГВІСТЫЧНЫ (БДЛУ), вул. Захарава, 21, тэл. 33-20-63

Працоўны на кухні.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Адукацыя сярэдняя. Заробак 350.000 руб. Кавярня. тэл. 34-32-52.

Да 22 год. Прыбіраць посуд са сталоў.

УНІВЭРСЫТЭТ ІНФАРМАТЫКІ І РАДЫЁЭЛЕКТРОНІКІ БДУІР (РТІ), вул. П.Броўкі, 6, тэл. 32-31-01

Ліфцёр.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны.

Без прафэсіі.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак дамоўны. Зьвяртацца на тэл. 39-88-79. Чысьціць дахі вучэбных корпусаў. Можна паводле працоўнага пагадненьня.

АКАДЭМІЯ ПАЛІТЭХНІЧНАЯ БДПА (БПІ), пр. Ф.Скарыны, 65, тэл. 32-77-97

Даглядчык (дворнік).

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак 460.000 руб. Зьвяртацца: інтэрнат N6, вул. Я.Коласа, 26, тэл. 39-91-71.

Бяз шкодных звычак.

ПАЛІКЛІНІКА ДЛЯ ДАРОСЛЫХ N34, вул. Кульман, 22, тэл. 32-12-93

Санітарка.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 4 чалавекі. Заробак 400.000 руб. Узрост 45-55 год.

Прыбіральніца службовых памяшканьняў.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак 200.000 руб.

ПАЛІКЛІНІКА ДЗІЦЯЧАЯ N25, вул. Адзінцова, 75, тэл. 58-51-92

Працоўная на кухні.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак 259.000 руб.

ЗАВОД СТАНКАБУДАЎНІЧЫ ІМЯ КІРАВА, вул. Чырвонаармейская, 21, тэл. 26-16-05

Стралок-ахоўнік.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 4 чалавекі. Заробак 500.000-600.000 руб. Зьвяртацца на тэл. 26-01-04.

Былыя вайскоўцы, супрацоўнікі МУС. Узрост 40-55 год. Вартаваць праз суткі.

ПАЛІКЛІНІКА ДЛЯ ДАРОСЛЫХ N8, вул. Нікіфарава, 3, тэл. 66-61-02

Ліфцёр.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 2 чалавекі. Адукацыя сярэдняя. Заробак 200.000 руб.

Зьвяртацца на тэл. 60-38-03. З пацьверджаньнем на паўтары стаўкі.

САНАТОР СУХОТНЫ ДЗІЦЯЧЫ, Лагойскі тракт, 13-134, тэл. 65-50-25

Санітарка.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 4 чалавек. Адукацыя сярэдняя, пачаткова-сярэдняя. Заробак 450.000 руб. Праца паводле рухомага графіку.

РАЁННЫ АДДЗЕЛ АДУКАЦЫІ ЗАВОДЗКАГА Р-НУ, пр. Партызанскі, 83, тэл. 46-32-92

Прыбіральніца службовых памяшканьняў.

Сталая занятасьць, поўны працоўны дзень.

Усяго 1 чалавек. Заробак 191.000 руб. Зьвяртацца на тэл. 46-44-12, 45-93-21.

РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТЫ "НАША НІВА" патрабуецца машыністка зь веданьнем беларускае мовы. Зьвяртацца на тэл. 36-76-75.

Рынак працы: студзень - сьнежань 1995

Працяг. Пачатак у "Інфарматары" N 1

3. Аплата працы

Сярэднямесячны намінальны заробак службоўцаў (без уліку каапэратываў, МП, СП, ТАА) у студзені-сьнежні склаў 1.031.221 рублёў, у сьнежні — 1.362.646 рублёў. Тэмпы росту ў параўнаньні з адпаведным пэрыядам мінулага году склалі адпаведна 7,9 і 3,5 раза. З улікам інфляцыі рэальны заробак у параўнаньні зь леташнім студзенем-сьнежнем склаў 100 працэнтаў, у параўнаньні са сьнежнем 1994 году — 102,9 працэнтаў. Самы высокі ўзровень заробку ў сьнежні быў у працаўнікоў кіраваньня каапэратыўных арганізацыяў — 2.959.848 рублёў, банкаў — 2.563.220 рублёў, што адпаведна ў 2,2 і 1,9 раза вышэй за сярэднямесячны заробак у народнай гаспадарцы.

Табліца 3

	сьнежань 1995 г.	сьнежань 1995 г. да сьнежня 1994 г., разоў
Сярэднямесячы заробак, руб.	1.362.646	3,5
Прамысловасьць	1.258.076	3,0
Транспарт	1.544.723	3,4
Сувязь	1.513.732	4,3
Будаўніцтва	1.785.373	3,3
у т.л. будаўніча-мантажныя арганізацыі	1.851.056	3,2
Гандаль	1.187.456	3,8
ЖКГ	1.378.411	4,0
Бытавое абслугоўваньне	848.585	4,7
Ахова здароўя, ф/к, сацзабесьпячэньне	1.020.874	4,4
Народная адукацыя	954.062	4,3
Навука, навуковае абслугоўваньне	1.351.814	4,5
Крэдытаваньне, страхаваньне	2.540.282	2,5
у т.л. банкі	2.563.220	2,5
Апарат органаў кіраваньня	1.986.919	4,6

Розьніца ў аплаце заробку працоўных высокааплатных і нізкааплатных галінаў гаспадаркі трохі зьменшылася і склала 4,1 раза, у сьнежні 1994 г. — 9,1 раза. Фактычна, калі ўлічыць даходы занятых у МП, СП, ТАА і каапэратывах, яна значна вышэйшая.

Разьмеркаваньне даходаў у сьнежні 1995 г. выглядае наступным чынам:

Табліца 4

	Сярэднямесячны заробак, руб.	сярэднямесячны заробак у н/г, працэнтаў
Лідары:		
Кіраваньне каапэратыўных арганізацыяў	2.959.848	217,2
Банкаўскія арганізацыі	2.563.220	188,1
Авіяцыйны траспарт	2.065.153	151,6
Агульная камэрцыйная дзейнасьць	2.056.783	150,9
Сярэдні заробак занятых у н/г	1.362.646	
Аўтсайдары:		
Народная адукацыя	954.062	70,0
Мастацтва	849.649	62,4
Бытавое абслугоўваньне	848.585	62,2
Сацыяльнае забесьпячэньне	727.015	3,5

Няроўнасьць у аплаце працы адбіваецца, перадусім, на ўзроўні жыцьця працоўных асобных галінаў народнае гаспадаркі. Заробак працоўных сацыяльнага забесьпячэньня складае толькі палову ад сярэдняга ў народнай гаспадарцы; заробак працаўнікоў кіраваньня каапэратыўных аргнізацыяў у 2,2 раза перавышае ягоны сярэдні ўзровень.

4. Рух працоўнае сілы

Зварот працоўнае сілы вызначаецца павелічэньнем ліку звольненых працаўнікоў у параўнаньні з прынятымі на 37,5 тыс. чал. Прыём новых працаўнікоў аднаўляе выбыцьцё на 75,8 працэнтаў, інакш кажучы, працягваецца "схаванае" вызваленьне працоўнае сілы.

Табліца №5

Зварот працоўнае сілы, чалавек

	паводле прыёму на працу	паводле выбыцьця	у тым ліку ў сувязі са скарачэньнем штату	зь іх моладзь да 25 год	звольненыя на сваё жаданьне
студзень-сьнежань 1995 г.	117.482	154.998	16.729	3829	92.349
студзень-сьнежань 1994 г.	102.201	135.144	11.207	3678	84.401

У параўнаньні зь леташнім студзенем-сьнежнем зварот працоўнае сілы паводле прыёму ўзрос на 15,3 тыс. чалавек (плюс 15 працэнтаў), паводле выбыцьця — на 19,9 тыс. чал. (14,7 працэнтаў). На нашу думку значны рост звароту працоўнае сілы паводле прыёму зьвязаны з тым, што працаўнікі ўсё часьцей вымушаны звальняцца на сваё жаданьне ў пошуках працоўных месцаў з больш прыймальнымі ўмовамі найманьня.

Удзельная вага звольненых на сваё жаданьне ў звароце выбыцьця нязначна зьменшылася з 62,5 працэнтаў да 59,6 працэнтаў. Тым жа часам доля звольненых пры скарачэньні штату ў агульным звароце паводле выбыцьця павялічылася з 3,3 працэнтаў да 10,8 працэнтаў. У абсалютным вызначэньні колькасьць звольненых на сваё жаданьне ўзрасла на 7,9 тыс. чал. (на 9,4 працэнта), а лік звольненых пры скарачэньні штату — на 5,5 тыс. чал. (на 49,1 працэнта).

Абсалютная большасьць звольненых на сваё жаданьне знаходзіць новую працу (занятак, які прыносіць даход) самастойна і толькі 3,9 працэнта зарэгістраваліся ў службе занятасьці як беспрацоўныя, а сярод звольненых паводле скарачэньня штату іх 43,5 працэнту.

Такім чынам, зьмяненьнне структуры працаўнікоў, якія звальняюцца, ускосна ўплывае на афіцыйнае беспрацоўе.



Паводле інфармацыі Менскага гарадзкога цэнтру занятасьці насельніцтва

Працяг у наступным нумары

9	10800	9600	8400	7200	6000	4800	3600	2400	1200	1200	1200	2400	3600	4800	6000 . 7200
10	12000	10800	9600	8400	7200	6000	4800	3600	2400	1200	1200	1200	2400	3600	4800 . 6000
11	13200	12000	10800	9600	8400	7200	6000	4800	3600	2400	1200	1200	1200	2400	3600 . 4800
12	14400	13200	12000	10800	9600	8400	7200	6000	4800	3600	2400	1200	1200	1200	2400 . 3600
13	15600	14400	13200	12000	10800	9600	8400	7200	6000	4800	3600	2400	1200	1200	1200 . 2400
14	16800	15600	13200	12000	10800	9600	8400	7200	6000	4800	3600	2400	1200	1200	1200
15	18000	16800	15600	13200	12000	10800	9600	8400	7200	6000	4800	3600	2400	1200	1200

Для праезду дзяцей прадугледжана скідка ў памеры 50% кошту

НАЗВЫ СТАНЦЫЯЎ І ПРЫПЫНКАЎ У ЗОНАХ

0 ЗОНА Менск-Пасажырскі (вакзал)
1 ЗОНА Бальніца Менск-Паўднёвы Лошыца Менск-Усходні Трактарны Радыятарны
2 ЗОНА Курасоўшчына Гай Памысьлішча Калядзічы Мачулішчы Сьцяпянка Азярышча Масюкоўшчына Ждановічы Менскае Мора
3 ЗОНА Пліч Воўчкавічы Асееўка Міхановічы Калодзішчы Садовы Гарадзішча Ратамка Крыжоўка Зялёнае
4 ЗОНА Фаніпаль Бярэжа Седча Зазерка Рыбцы Слабада Дамашаны Загор'е Беларусь Хмелеўка Анусіна Радашкавічы
5 ЗОНА Станькава Койданава Раўнапольле Смалявічы Вязынка Пралескі Дубравы Раманы
6 ЗОНА Клыпаўшчына Негарэлае Н. Сяло Зарэчная Чырвонае знамя Аляхновічы Баяры
7 ЗОНА Энэргетык 806-ы Мязінаўка Коласава Дрычын Вендзеж Тэхнікум Пухавічы Барсукі Жодзіна-Паўднёвы Жодзіна Ласі Вуша Мясота
8 ЗОНА Атцэда Кучкуны Вялянскі Блужа Майская Весялоўка Пр. пабеда Пячанская Крыніца Селівонаўка Таташчызна
9 ЗОНА Стоўбцы Талька Барысаў Маладзечна
10 ЗОНА Сінява Вярхі Вярэйцы Беразіно Неманіца Навасады Замужаньне
11 ЗОНА Асіпоўшчына Савецкая Юбілейная Асіповічы Прыяміна Беражок
12 ЗОНА Варацішча Гарадзея Ліпа Крупкі
13 ЗОНА Хвоева Пагарэльцы Юшкевічы Новае жыцьцё
14 ЗОНА Пабеда Крошын Бобр Красноўка
15 ЗОНА Баранавічы Слаўнае

Кошт правозу жывелаў у электрычках: да 100 км – 4800 руб., болей за 100 км – 7200. Перавоз дадатковай ручной покладзі і ровара каштуе: да 100 км – 7200 рублеў, болей за 100 – 14.400.

Ці добрая Вы жонка?

Каб даведацца пра гэта, адкажыце, калі ласка, на некаторыя пытаньні. Пры адказах выкарыстоўвайце літары, пададзеныя ў дужках.

1. Што Вы зробіце, калі даведаецеся, што муж Вам схлусіў:
1) прымушу яго прасіць прабачэньня (А);
2) зраблю выгляд, што не заўважыла (Г);
3) скажу, хто ён ёсьць насамрэч (Ж).

2. Калі муж не павіншаваў Вас з датаю вашага (сумеснага!) шлюбу, што Вы зробіце:
1) ён больш ніколі не пачуе мой цудоўны голас (З),
2) напішу гэтую дату на сьцяне супраць таго месца, дзе ён увечары сядзіць з газэтай (апошнюю схаваю) (Д);
3) далікатна, пяшчотным голасам (каб не пакрыўдзіць) скажу, што ён паводзіць сябе як парсюк (Б).

3. Вы толькі вымылі падлогу (нацерлі паркет), а Ваш любы муж прыйшоў з вуліцы і бадзяецца па кватэры ў брудным абутку. Вашыя дзеянні:
1) пакажу тое месца, дзе засталіся брудныя адбіткі, і, ня слухаючы ягоныя стогны пра літасьць, запатрабую ўсё прыбраць (Е);
2) у нас раўнапраўе: я магу зрабіць тое самае (але хто будзе прыбіраць за мной) (І);
3) лепш памру, але ў абутку ў хату ён ня зойдзе (В).

4. Вы заўважылі, што муж надзвычай пяшчотна да Вас ставіцца, Вашыя дзеяньні:
1) паспрабую даведацца, у чым ён правініўся (Г);
2) скарыстаю момант, каб прапанаваць абнавіць мой гардэроб (З);
3) з радасьцю адкажу на яго пачуцьці і імкненьні (Б).

5. Калі муж пайшоў на працу, на ягоным гарнітуры не было гузіка (я яму ня швачка), а калі вярнуўся, гузік быў на месцы. Ваша рэакцыя:
1) запатрабую растлумачыць, з чыёй дапамогай робяцца цуды (Д);
2) мне будзе няёмка (навошта назаляць іншым — усё ж гэта мой муж) (А);
3) не зьвярну на гэта ўвагу (хто хоча, той і прышывае гузікі) (Ж).

6. Вы ў гасьцях. Муж у Вас на вачах пачынае зашмат зьвяртаць увагу на іншую жанчыну, як Вы буздеце на гэта рэагаваць:
1) у тую самую хвіліну яму пачне здавацца, што надыйшоў Апакаліпсіс (гэта я гарантую) (І);
2) адразу зраблю выгляд, што мяне гэта не хвалюе, але дома ён зразумее, што інквізытары былі вельмі гуманыя людзі ў параўнаньні са мной (Е);
3) буду лічыць, што гэта такі жарт (нават цьвік праграмы) (В).

7. Вы заўважылі, што валасы Вашага мужа зрабіліся значна радзейшымі, і вырашылі інфармаваць яго пра гэта:
1) "Любы, гэта дробязі, табе нават пасуе адсутнасьць пэўнае колькасьці валасоў" (А);
2) пастаўлю ўльтыматум: ці ён зараз жа бяжыць да лекара, ці я бягу ад яго (Г);
3) вельмі добра: у мяне зьявіўся яшчэ адзін казыр (пры сварках гэта тое, што трэба) (З).

8. Вы ўвесь тыдзень, як вар'ятка, бегалі па крамах у пошуках самага моднага гальштуку, знайшлі... Але мужу ён не спадабаўся. Вашыя дзеяньні:
1) адразу схаплю нажніцы і парэжу гальштук на дробныя кавалачкі (лепш калі муж не пасьпеў яго зьняць) (І);
2) запатрабую, каб ён пабег у краму (хай нават будзе 12 гадзінаў ночы) і вярнуў мае грошы ці абмяняў яго на нейкі іншы (Б);
3) што мужчына можа разумець у гальштуках. Мне падабаецца, і ён будзе яго насіць (ці я ня я) (Д).

9. Апошнім часам муж прыходзіць вельмі позна (ад 21 да 5-й гадзіны — далей можна казаць, што рана), расьсеяны і раздражнёны. Як Вы рэагуеце?
1) Папярэджу, што, калі гэта ня скончыцца, месца ягонае жонкі будзе вакантнае (З);
2) зраблю ўсё, каб даведацца, ці не зьявілася ў яго новае захапленьне (Г);
3) буду імкнуцца выклікаць яго на шчырую размову і дапамагчы (А).

10. Муж зрабіў учынак, варты сапраўднага мужчыны. Ваша адзнака:
1) падумаю, што гэта выпадкова (І);
2) прызнаю, што ён малайчына, але буду імкнуцца не перахваліць (Б);
3) ён варты ўзнагароды (В).

Апрацоўка вынікаў тэсту "Ці добрая вы жонка?"
За адказы групаў А, Б, В — па 10 балаў; за адказы групаў Г, Д, Е — па 5 балаў; за адказы групаў Ж, З, І — пры падліку агульнае сумы адняць па 5 балаў (за кожны адказ гэтай групы).

90 балаў і больш. Вы ідэальная жонка, добрая, пяшчотная, уважлівая, цярплівая (далей эпітэты на свой густ). Муж для Вас — галава сям'і ў поўным сэнсе гэтага слова. Шчасьця Вам!

70 — 85 балаў. Вы сапраўдны спэцыяліст у мужчынскай псыхалёгіі, валодаеце пачуцьцём такту, умееце захоўваць у сям'і спакой і ўзаемадавер. Ці жыцьцё, ці прырода дала Вам сапраўдную мудрасьць!

45 — 65 балаў. Калі шчыра, муж Вам неабыякавы, думкі пра будучыню зьвязаныя зь ім адным. Але час ад часу Вы вырашаеце зрабіць яму невялікую чыстку, без усялякіх на тое падставаў, хутчэй для прафілякты.

5 — 40 балаў. Відаць, у Вас з мужам адносіны халодныя. Калі глядзець паводле адказаў, у гэтым ёсьць Вашая віна. Вы заўсёды жадаеце, нават насуперак здаровому сэнсу, трымацца свайго.

0 балаў. Хутчэй за ўсё Вы адказвалі на пытаньні тэсту несур'ёзна. Альбо Вы ўвогуле не замужам. Таму Вашы адказы маюць тэарэтычны характар. Калі гэта так, раім не выходзіць замуж, пакуль сума балаў будзе ня меншай за 50.

ПРЭФЭРАНС

ЗАНЯТАК 2

(Працяг. Пачатак у №1)

ЗДАВАНЬНЕ

Здавальнік бярэ ў рукі калоду картаў. Усе яны павінны ляжаць аднолькава, г.зн. кожная карта ляжыць альбо кашуляй дагары альбо кашуляй уніз. Ведайце, што забаронена здаваць калоду, у якой хоць бы адна карта павернута кашуляй у іншы бок, чым астатнія. Калі Вы заўважылі такі дэфэкт, знайдзіце перагорнутую карту і пакладзіце яе правільна.

Перад здаваньнем праводзіцца тасаваньне картаў. Каб добра ператасаваць карты, трэба ўзяць калоду ў левую руку, правай рукой аддзяліць прыкладна палову, і ўсунуць асобныя карты паміж астатнімі картамі, якія засталіся ў левай руцэ. Такую працэдуру трэба паўтарыць чым больш, тым лепш. Звычайна гульцы робяць яе ад васьмі да пятнаццаці разоў. Калі Вы лічыце, што здавальнік дрэнна ператасаваў калоду, Вы можаце патрабаваць працягу тасаваньня. Пры гэтым калоду трэба трымаць кашуляй дагары. Тасаваць трэба так, каб ніхто, у тым ліку і Вы, ня мог убачыць масьць альбо вартасьць якой-небудзь карты.

Скончыўшы тасаваць, здавальнік кладзе калоду кашуляю дагары перад гульцамі, якія сядзяць справа. Улічвайце, Вы павінны абавязкова пакласьці калоду, г.зн. прыбраць ад яе рукі. Дапусьцім, тасаваў гулец Пн. Ён кладзе калоду для здыманя перад гульцом З. Гулец, перад якім пакладзена карты, павінен правільна зьняць калоду. Для гэтага ен прыпадымае верхнюю частку калоды і кладзе яе каля ніжняе часткі справа. Такім чынам, на стале ляжаць ужо два стосікі картаў. У кожным зь іх павінна быць ня менш за тры карты. Пакінутую на стале верхную частку трэба пакласьці на зьнятую частку калоды. Здавальнік, узяўшы атрыманы стосік, пачынае здаваць карты.

Падчас усяго здыманя не павінна быць адкрыта ніводнае карты, не павінна быць дадзена магчымасьці для адпаведнае масьці і вартасьці якой-небудзь з картаў. Калі ў чым дапушчана памылка, то кожны гулец мае права патрабаваць пераздаваньня, але калі карты тасаваныя і зьнятыя правільна, здавальнік павінен здаць карты.

Узяўшы ў руку калоду, правай рукою здавальнік здымае іх перад гульцом, які сядзіць зьлева. Наступныя дзьве карты кладуцца перад тым, хто сядзіць насупраць, далей дзьве карты кладуцца перад правым суседам і, нарэшце, дзьве карты кладуцца перад сабою. Затым дзьве карты зноў даюцца суседу зьлева, насупраць і справа. Але сабе, акрамя ўжо пакладзеных дзьвюх, здавальнік картаў не кладзе. Рэшта калоды разьмяркоўваецца гэткім жа чынам паміж трыма гульцамі без здавальніка. Калі апошнія дзьве карты будуць пакладзены перад правым ад здавальніка гульцом, то карты хутчэй за ўсё здадзены слушна. Калі яны трапілі кудысьці ў іншае месца, трэба пераздаць.

Дапусьцім, здаваў гулец Пн. Тады апошнія дзьве карты былі пакладзены перад гульцом З. Перад Пн пасьля здаваньня ляжаць дзьве карты прыкупу, перад астатнімі гульцамі ляжыць па дзесяць картаў. Зьвярніце ўвагу: гульцы не павінны чапаць карты падчас здаваньня. Карты бяруцца ў рукі, калі здадзена ўся калода. Здавальнік жа не павінен дакранацца да прыкупу, пакуль гэта ня будзе прадугледжана ягонымі абавязкамі.

Усе, акрамя здавальніка, падымаюць свае карты і пералічваюць іх. Калі ў каго-небудзь ня дзесяць картаў, робіцца паўторнае тасаваньне, здыманьне й здаваньне. Калі ў кожнага з гульцоў па дзесяць картаў, здаваньне лічыцца правільным і пачынаецца гульня.

Дапусьцім, здаваў гулец Пн. Перад ім ляжаць дзьве карты прыкупу. У гэтым выпадку гулец У знаходзіцца на першай руцэ, гулец Пд — на другой, а гулец З — на трэцяй. Гулец У першым атрымаў карты падчас здаваньня, першым ён зрабіў аб'яву, першым будзе хадзіць і г.д. Гулец Пд другім атрымаў карты, другім будзе рабіць аб'яву на гандлі, другім будзе хадзіць і г.д. Нарэшце, гулец З усё тое ж будзе рабіць пасьля У і Пд. Калі гульцоў трое, то функцыі здавальніка бярэ на сябе гулец на трэцяй руцэ. Ён здае ўсім, у тым ліку й сабе, па дзесяць картаў. Дзьве карты, ня першыя і не апошнія, адкладаюцца ім асобна ў прыкуп.

ГАНДАЛЬ

1. АГУЛЬНЫЯ ПАНЯТКІ

І вось здаваньне зроблена слушна. Трое гульцоў бяруць у рукі свае карты і пачынаюць прыводзіць іх да ладу. Здавальнік не трымае прыкуп і не заглядвае ў карты суседзяў. Увага! Карты бліжэй да ордэнаў, як гаворыць прэфэрансавая прыказка. Менавіта цяпер лягчэй за ўсё падгледзець Вашыя карты. Будзьце ўважлівыя. Магчыма, Вам давядзецца гуляць ня толькі з тым, хто лічыць за ганьбу падглядзець карты ў суседа. Нездарма адна з прыказак прэфэрансістаў гучыць так: "Спачатку паглядзі карты суседа, свае заўсёды пасьпееш!" Пры гэтым той, хто падглядзеў Вашыя карты, увогуле мае рацыю, бо правілами гэта не забаронена. А вось Вы, паказваючы карты, ня маеце рацыі.

Раскладзіце карты паводле масьцяў і старшынства, перамешваючы чырвоныя масьці з чорнымі. Так Вам зручней будзе ацаніць свае карты. Бывае, што карта схаваецца за сьпіну іншай, а выявіцца гэта значна пазьней. Картаў павінна быць ня больш і ня менш за дзесяць. Пазьней у Вас выпрацуецца ўменьне, празь якое Вы безь пераліку заўважыце недахоп ці лішак.

Пасьля ўпарадкаваньня картаў пачынаюцца аб'явы. Што ж абвяшчаецца гульцамі? Яны робяць аб'яву на права прызначыць гульню. Як робяцца аб'явы мы разгледзім далей, а цяпер вывучым іхны мэханізм. Пры гэтым неабходна толькі ўлічыць, што ўсе аб'явы адрозьніваюцца паводле старшынства. Здавальнік нічога казаць ня мае права, бо ў гандлі ўдзелу не бярэ. Гандлююць толькі тры наступныя гульцы. Кожны зь іх можа зрабіць два віды аб'яваў:

— **Пас**. Зрабіўшы такую аб'яву, гулец адмаўляецца ад прызначанае гульні на гэтай раздачы. Адмовіўшыся адзін раз, гулец больш ня мае права рабіць прызначэньне гульні ў гэтае здаваньне.

— **Прызначэньне гульні**. Прызначыўшы пэўную гульню, гулец бярэ на сябе абавязак узяць адпаведную колькасьць хабараў. Адмовіцца ад гульні, калі астатнія не пярэчаць супраць ягонай аб'явы, ён ня мае права.

Першым робіць аб'яву гулец зь першай рукі — той, хто сядзіць зьлева ад здавальніка. Дапусьцім, ён аб'явіў нейкую гульню. Гандаль на гэтым не сканчаецца.

Гулец з другой рукі можа зрабіць сваю аб'яву, але яна абавязкова павінна быць старэйшай за зробленую папярэднікам. Дапусьцім, гулец на другой руцэ абвяшчае гульню, натуральна старэйшую за абвешчаную гульцом на першай руцэ. Пасьля гэтага аб'ява папярэдніка анулюецца. Права прызначэньня пераходзіць да гульца на трэцяй руцэ. Ён можа таксама абвясьціць гульню, але зноў-такі, старэйшую за аб'яўленую да яго. Пасьля гэтага слова даецца зноў першай руцэ. Такім чынам гульцы гандлююць датуль, пакуль двое з траіх не абвесьцяць пас. Апошні, зрабіўшы прызначэньне, павінен пацьвердзіць яго пры гульні. Аб'ява ўдзельнікаў у гульні, якія спасавалі, не абавязвае іх ні да чога.

Калі адзін гулец не жадае ўдзельнічаць у гандлі, ён абвяшчае пас. У гэтым выпадку гандаль вядзецца паміж двума астатнімі. Напрыклад:

У: Пас (гулец нібы гаворыць: "У мяне няма нічога, я ня буду ўдзельнічаць у гандлі").

Пд: Пазначае якую-небудзь гульню.

З: Пазначае гульню старэйшую, чым абвешчаная Пд.

Пд: Пазначае гульню яшчэ старэйшую.

З: Пазначае гульню яшчэ старэйшую.

Пд: Пас (гулец адмовіўся ад далейшага гандлю).

Таму як апошняе слова засталося за гульцом З, ен атрымлівае адпаведныя правы й абавязкі.

2. СТАРШЫНСТВО ГУЛЬНЯЎ НА ЎЗЯЦЬЦЕ ХАБАРУ

Мінімальна магчымае прызначэньне, якое можа зрабіць гулец, гэта абавязак узяць шэсьць хабараў. Аб'явы на ўзяцьце пяці, чатырох і г.д. хабараў няма. Такім чынам, у сачынцы маюцца наступныя аб'явы:

Шасьцёрная — гулец, які абвясьціў шасьцёрную, павінен узяць шэсьць хабараў.

Сямёрная — гулец адпаведна павінен узяць сем хабараў.

Васьмерная — гулец адпаведна павінен узяць восем хабараў.

Дзевяцёрная — гулец адпаведна павінен узяць дзевяць хабараў.

Дзесяцёрная — гулец адпаведна павінен узяць дзесяць хабараў.

Мізэр — гулец, які абвясьціў мізэр, павінен ня ўзяць ніводнага хабару.

Мізэр мы разгледзім пазьней, а цяпер вывучым аб'явы на ўзяцьце ад шасьці да дзесяці хабараў.

Гульні бываюць: Віновая, Жалудовая, Званковая, Чырвовая і Бесказырная. Робячы прызначэньне, гулец абвяшчае колькасьць хабараў і казырную масьць. Напрыклад: "Шэсьць жалудоў" альбо: "Восем вінаў". Першым словам гулец абвяшчае колькасьць хабараў. Калі гэтая аб'ява застанецца за ім, то ня менш за гэтую колькасьць ён павінен узяць. Такім чынам, калі Вы абвяшчаеце шэсьць, то мусіце ўзяць шэсьць, сем, восем, дзевяць альбо дзесяць хабараў. Калі абвяшчаеце восем, то, адпаведна, восем, дзевяць альбо дзесяць хабараў. Ну а калі абвешчана дзесяць, то Вы павінны ўзяць дзесяць хабараў і ніяк ня менш. Назавем прызначэньне колькасьці хабараў узроўнем гульні. Інакш кажучы, у аб'яве гульца — значэньне казыра. Казыром можна прызначыць любую з чатырох масьцяў альбо абвясьвіць гульню без казыра. У прэфэрансе самая малодшая масьць — віны, наступная паводле старшынства — жалудовая, далей звонкі, чырвы, і старэйшая за гульню ў масьці — гульня без казыра. Старшынство масьцяў дзейнічае толькі пры гандлі на адным узроўні гульні.

Напрыклад, гулец абвяшчае: "Шэсьць вінаў". Наступны перабівае аб'явай: "Шэсьць жалудоў". Абодва гульцы абвясьцілі гульню аднаго ўзроўню, але таму што масьць, абвешчаная іншым гульцом, старэйшая, то яго аб'ява перабівае папярэднюю. Таксама, як і пры аб'яве ўзроўню гульні, гулец абавязваецца гуляць на гэтым узроўні на гэтай альбо старэйшай масьці. Гэта значыць, калі гулец аб'явіў восем звонкаў, ён абавязваецца ўзяць восем хабараў, прызначыўшы казыром звонкі, альбо чырву, альбо гуляючы без казыра, а магчыма і прызначыць дзевяцёрную, дзесяцёрную гульню зь якім заўгодна казыром.

Працяг у наступным нумары

— НЕШТА МНЕ ГЭТА НЕ ПАДАБАЕЦЦА: ЁН УВЕСЬ ЧАС ПАЎТАРАЕ "МНЯ-МНЯ-МНЯ", — ЗАЎТРА АПРАНЕШ ШТАНЫ

ШАХМАТЫ

1п. Белыя перамагаюць



2п. Белыя перамагаюць

3п. Белыя перамагаюць

4п. Чорныя пачынаюць і перамагаюць

5п. Чорныя пачынаюць і перамагаюць



6п. Мат за 2 хады

Адказы ў наступным нумары

ЗАБАЎКІ

АДКАЗЫ НА ПАПЯРЭДНІЯ ЗАДАНЬНІ

Шахматы
Тлумачэньні:
Кароль — Кр;
Гетман (Фэрзь) — Г;
Вежа (Тура) — Вж;
Вышнік (Слон) — В;
Конь — К.

1п. 1. Г:d4+; 1... Г:c5 2. Г:c5+b6 3. Г:b6X.

2п. 1. Гe6+ Крh8 2. Кf7+ Крg8 3.Кh6++ Крh8 4. Гg8+! Вж:g8 5.Кf7X.

3п. 1. Вжf8 Кc8 2.Г:b7+! Кр:b7 3. a6+ Крb8 4. Кc6+ Крa8 5. Вж:c8X.

4п. Вжa6!

5п. I. Мат за 3 хады.
1. Вж:g3! B:g3
2. Кf3! 3. g4X.
II. Мат за 4 хады.
1. hg! Be3 2. Вжg4 Bg5 3. Вжh4+ B:h4 4. g4X.
III. Мат за 5 хадоў.
1. Вжb7! Be3 2. Вжb1 Bg5 3. Вжh1+ Bh4 4. Вжh2! gh 5. g4X.

6п. 1. Вжg7+ Крh8 2. Кf8! Вж:f8 і мат за 2 хады.

Забаўкі
1. Фігура №2
2. 11. Адняць лічбу на дзьвярох з сумы лічбаў на вокнах.

Задача 1

2	6
54	18

?	9
81	27

Устаўце прапушчаную лічбу

Задача 2



1 2 3 4 5

Выключыце лішнюю фігуру

Задача 3

3	7
5	20

13	21	?
51	104	?

Устаўце прапушчаныя лічбы

Адказы ў наступным нумары

адпаведны запыт. Калі ўсе тэчкі з дасье выставіць у шэраг, то ён выцягнецца на 180 кілямэтраў. Чаргі на атрыманьне сваёй асабістай справы даводзіцца чакаць гадамі. Таму і пасьпяшаліся людзі на дзень адчыненых дзьвярэй, каб хоць паглядзець на штабкватэру "Штазі" зь сярэдзіны ды наведаць створаную пры ёй выставу.

Агульнае абурэньне выклікалі шкляныя слоікі з жоўтымі анучамі. Цяжка даць веры, але ў іх захоўваліся здабытыя нейкім чынам пробы паху слынных ГДРаўскіх дысыдэнтаў. Анучы давалі панюхаць паліцэйскім аўчаркам ды пускалі на сьлед. Адзін з тых, на каго была заведзена справа — Рэйнхард Курц, апазыцыйна настроены электрамэханік. Яго разам зь сям'ёй перасьледавалі чэкісты. "За мной хадзілі па сьлядах", — узгадвае Курц. На ўсіх яго сваякоў былі заведзеныя справы. У "Штазі" ён праходзіў пад мянушкай "Жаба", яго бацьку назвалі "Мэдузай", а маці "Савою". Цікава, пад якой мянушкай лічацца ў нашым беларускім КГБ лідэры апазыцыі, і ці ёсць іхнія пахі ў слоіках?

Легенда савецкага самалётабудаваньня — звышгукавы авіляйнэр ТУ-144 зноў зьбіраецца ўзьняцца ў паветра. У мінулую нядзелю на падмаскоўным аэрадроме Жукоўскі быў выстаўлены ацалелы з 70-х гадоў самалёт. Гэты звышгукавы авіяляйнэр рабіў калісьці палёты па маршруце Масква-Алма-Ата. Тады з-за неэканамічнасьці (самалёт спальваў за адзін такі палёт да 180 тонаў газы) ад ТУ-144 давялося адмовіцца. Да таго ж, на міжнародным авіясалёне ў Ле-Буржэ ён пацярпеў аварыю. Усяго было выпушчана 17 такіх самалётаў, зь якіх на сёння захаваліся толькі 4. Спрабуючы палепшыць сваё фінансавае становішча, расейскае канструктарскае бюро Тупалева прадставіла свой колішні гонар былым зацятым ворагам па халоднай вайне.

Цяпер на заказ НАСА і некалькіх амэрыканскіх авіябудаўнічых карпарацыяў стары самалёт быў выцягнуты з ангару, наноў пафарбаваны і забясьпечаны вымяральнай апаратурай. Гэта будзе лётная лябараторыя. На самалёце ўсталяваныя больш моцныя і эканамічныя рухавікі ад стратэгічнага бамбардоўшчыка ТУ-160. Былыя спаборнікі канструктарскага бюро Тупалева ў часы халоднай вайны — кампаніі МакДоналд Дуглас, Рокуэл і Боінг —заключылі з тупалеўцамі кантракт на 32 экспэрымэнтальныя палёты. Іх вынікам будзе стварэньне новага амэрыканскага звышгукавога пасажырскага самалёту другога пакаленьня. Такі самалёт будзе мець крэйсэрскую хуткасьць удвая большую за хуткасьць гуку, і здольнасьць перавозіць да чатырох соцень пасажыраў на адлегласьць 9300 кілямэтраў.

Цікава, што для сваіх дасьледаваньняў амэрыканцы вырашылі скарыстаць менавіта ТУ-144, а не ангельска-французскі "Канкорд". Са словаў кіраўніка тупалеўскай фірмы Валянціна Клімава, расейскі самалёт у большасьці парамэтраў пераўзыходзіць "Канкорд".

На пераабсталяваньне ТУ-144 у паветраную лябараторыю амэрыканцы выдаткавалі ўсяго 10 мільёнаў даляраў. Калі ўлічыць значнасьць задачы — стварэньне самалёта 21 стагодзьдзя, — то для амэрыканцаў гэта ня надта вялікая сума.

У канцы лютага - пачатку сакавіка ў Каліфорніі была праведзена маштабная дабрачынная акцыя — сотні добраахвотнікаў з інструмэнтамі ў руках прыйшлі ва ўсе сярэднія школы найбольш населенага штату Амэрыкі. Мэта акцыі — далучыць школы да сусьветнай кампутарнай сеткі INTERNET. Тэхнічнае абсталяваньне бясплатна далі найбуйнейшыя карпарацыі ЗША, а грамадзкія арганізацыі накіравалі сваіх сяброў-дабраахвотнікаў, каб за невялікі тэрмін ды адначасна абсталяваць усе школы. У гэтай акцыі браў удзел і Біл Клінтан — здымак прэзыдэнта, які трымае драты, друкаваўся на першых палосах амэрыканскіх газэт.

Падобная ж акцыя ў лютым была праведзена ў Эстоніі — там да INTERNET'у былі далучаныя ўсе сярэднія школы й тэхнікумы, універсытэт і інстытуты. Сярод постсацыялістычных краінаў Эстонія мае ў гэтай справе (і ня толькі ў гэтай) найбольшыя посьпехі.

Паводле зьвестак "НН" і інфармацыйных крыніцаў матэрыялы падрыхтаваў Уладзімір Бараніч

Мы не памыліліся

Напрыканцы мінулага году ў горнай Андоры (краіна ў Пірэнэях, паміж Францыяй і Гішпаніяй, дзяржаўная мова — каталёнская) адбылося 23-е міжнароднае біенале манахромнае фатаграфіі пад эгідаю FIAP (Міжнардная фэдэрацыя мастацкай фатаграфіі) і FAF (Андорская фатаграфічная фэдэрацыя). У гэтым прэстыжным конкурсе бралі ўдзел задзіночаныі фатографаў з 45 краінаў сьвету. Беларусь прадстаўлялі дзесяць, пераважна магілёўскіх, фотамайстроў. Сярод іх сябры AFIAP Эндрык Юшка, Генадзь Карчэўскі ды Базыль Цітоў, а таксама добра вядомы нашым чытачам малады Андрэй Антонаў. Яны разам набралі 10 пунктаў і атрамалі ў міжнацыянальным заліку 29-е месца. Сярод беларускіх здымкаў (паводле ўмоваў конкурсу — па адным ад мастака) першым стаў "Morning" (Раніца) Мікалая Панцялеева. Між іншым, менавіта гэты здымак мы зьмясьцілі летась у магілёўскім нумары "Нашае Нівы". Мы не памыліліся! Дарэчы, сярод ізраільскіх майстроў першым выйшаў сп. Зінові Шэгельман, таксама майстар магілёўскага гарту.

Сяргей Харэўскі

Фота Мікалая Панцялеева. Morning.

■ ГІСТОРЫЯ

Пад беларускім сьцягам 440 гадоў таму

Гісторык Генадзь Сагановіч знайшоў яшчэ адно сьведчаньне таго, што пад сьцягам зь белым і чырвоным колерамі прасты беларускі люд ваяваў у XVII ст.

Калі маскоўскі царызм у 1654 годзе разьвязаў вайну і хутка акупаваў практычна ўсю Беларусь, у краіне пачаў нарастаць рух народнага супраціву. Хапіўшы зброю, многія сяляне выступалі як супраць чужынцаў, так і супраць шляхты, якая прысягнула цару. Гэтая барацьба была асабліва актыўная на ўсходніх беларускіх землях, у Падняпроўі, усьцяж Бярэзіны. Мясцовыя мужыкі тут складалі аснову сотняў Дзяніса Мурашкі, які зваў сябе "наказным беларускім палкоўнікам". У лясах Меншчыны поўна было і зусім дробных сялянскіх аддзелаў. Яны ставілі засады на дарогах, нападалі на маскоўскія каманды, што зьбіралі і вывозілі збожжа, не прапускалі да акупаванага Менску вяскоўцаў.

На адну з купаў такіх партызанаў, што дзейнічалі ў цэнтральных раёнах Беларусі, увесну 1656 году ўлады кінулі царскае войска зь Менску. Бітва адбылася каля вёскі Грыдчыцы. Ясная рэч, мужыкі не маглі выстаяць перад рэгулярным фармаваньнем. Іх аддзел быў разьбіты, не адзін дзясятак інсургентаў трапіў у палон. А сярод трафэяў, захопленых на пабаявішчы, "ЗНАМЯ ПОЛОТНЯНОЕ БЕЛОЕ, НАКРЕСТ ПЕРЕШИТО СУКНОМ КРАСНЫМ", — чытаем у адпісцы маскоўскага ваяводы.

Схопленых пад бел-чырвона-белым сьцягам цар загадаў павесіць. Як патрабаваў вешаць і іншых злоўленых партызанаў, і тых сялянаў, што адважваліся ўступаць у казацкія сотні Івана Нячая. Але яшчэ безьліч разоў цягам той вайны яму даводзілася выпраўляць сваіх ваякаў, ня раз з артылерыяй, на паўсталых беларускіх мужыкоў.

"НН"

■ УКРАІНА

"Аднавіць СССР немагчыма"

Дэнансацыя Белавескіх пагадненьняў расейскаю Думай насьцярожыла ўкраінскіх палітыкаў.

Украінская тэлевізія падала з гэтае нагоды прамову прэзыдэнта Леаніда Кучмы, у якой ён падкрэсьліў, што ягоная краіна — незалежная дэмакратычная дзяржава, і гэткія рашэньні думцаў выклікаюць толькі здзіўленьне. На думку ж лідара Народнага Руху Вячаслава Чарновіла, дзеяньні расейскіх парлямэнтараў маюць адзінае пазытыўнае наступства — яны аўтаматычна ліквідуюць СНГ. Мустафа Джамілёў, старшыня Мэджлісу крымска-татарскага народу, бачыць станоўчае ў тым, што падзеі ў Расеі актывізуюць антыімпэрскія сілы ў Крыме. Абсурдныя і авантурныя дзеяньні расейскіх камуністаў, на ягоную думку, паспрыяюць развіцьцю татарскага нацыянальнага руху.

Дэнансацыя дэнансацыі зьдзіўляе нават прарасейскіх крымскіх палітыкаў. Юры Заранаў, адзін зь лідараў блёку Расея ў Вярхоўным Савеце Крыму, палічыў яе прапагандысцкім, папулісцкім крокам камуністаў, што мае на мэце падман выбаршчыкаў. "Аднавіць Савецкі Саюз немагчыма", — зазначыў Заранаў.

Наагул, рашэньне думцаў ня мае юрыдычнае сілы ў Расеі, ня кажучы ўжо пра ейных былых калегаў у "імпэрыі зла". Найлепшым варыянтам у гэтай сытуацыі было б папросту не зважаць на ўнутрырасейскія перадвыбарныя гульні.

Гэтак, зрэшты, і вырашыла большасьць лідараў украінскіх палітычных партыяў. Толькі камуністы ды сацыялісты падтрымалі ініцыятыву маскоўскіх таварышаў. Паводле словаў галоўнага камуніста нашых паўднёвых суседзяў Пятра Сіманенкі, Украіна "мусіць скарыстаць з расейскіх рэаліяў і цярабіць шырокі шлях да інтэграцыі". Аднак заява Сіманенкі мае застацца толькі заяваю. Як слушна заўважыў у інтэрвію польскай "Gazecie Wyborczej" былы кіраўнік дзяржавы Леанід Краўчук, прэзыдэнт Украіны Леанід Кучма — гэта табе не беларускі Лукашэнка. Кучма цьвёрда трымаецца незалежніцкіх пазыцыяў, праводзіць рэформы і мабілізуе ўсе ўнутраныя сілы. "Калі б я быў на ягоным месцы, я зрабіў бы тое самае", — дадаў ён.

Шмат у чым дзякуючы абодвум прэзыдэнтам, Украіна нязьменна праводзіць незалежную зьнешнюю палітыку ды, у адрозьненьне ад Беларусі, усё больш інтэгруецца ў агульнаэўрапейскі палітычны працэс.

Пятро Рагойша

Тры колеры: блакітны, белы, чырвоны...



У мінулую сераду ў варшаўскім шпіталі памёр выдатны кінарэжысэр Кшыштаф Кясьлёўскі. Хвораму на сэрца паляку было толькі 55 гадоў.

Кясьлёўскі пакінуў гэты сьвет у зэніце сваёй славы. Нарадзіўся ў Варшаве 27 чэрвеня 1941 году, скончыў у 68-м Вышэйшую Школу Кіно, Тэатру і Тэлевізіі ў Лодзі і да сярэдзіны 70-х працаваў як кінадакумэнталіст. Першы мастацкі фільм Кясьлёўскага — "Пэрсанал" (1976) — гісторыя пра маладога тэатральнага краўца, якому прапануюць шпегаваць за сваімі калегамі. Наступны фільм рэжысэра — "Аматар" — атрымлівае ў 1979 годзе галоўны прыз Маскоўскага кінафэстывалю. Кясьлёўскі фармуе ў гэты час новую хвалю польскага кіно — кіно маральнага неспакою, дзе імкнецца паказаць праўдзівае аблічча тагачаснай ПНР. Да гэтага тэматычнага цыклю належаць таксама фільмы "Без канца" і "Выпадак", якому давялося праляжаць на паліцах сем гадоў, чакаючы прэм'еры.

У канцы 80-х Кясьлёўскі засяроджваецца ў сваёй творчасьці на рэчах больш універсальных. У 87-м годзе ён здымае "Кароткі фільм пра забойства" і "Кароткі фільм пра каханьне", якія ўвайшлі ў тэлевізійны сэрыял "Дэкалёг" (1987-89). Гэты твор быў задуманы, як цыкл сучасных навэлаў на тэму дзесяці запаветаў і прынёс рэжысэру сусьветную вядомасьць. Кясьлёўскі стаўся аўтарытэтам у галіне рафінаванага псыхалягічнага кіно, адрасаванага больш патрабавальнаму гледачу. Ён пераяжджае ў Францыю, дзе пачынае працаваць над "Падвойным жыцьцём Вэранікі" — гісторыяй дзьвюх дзяўчын, што нарадзіліся адначасна ў Францыі і Польшчы. Падобныя адна да аднае, яны адчуваюць узаемную прысутнасьць.

Аднак найбольшым посьпехам Кясьлёўскага застанецца, без сумневу, трылёгія "Тры колеры". У 93-м годзе зьявіўся першы фільм — "Блакітны". У той жа ж год ён атрымаў "Залатога Льва" на міжнародным фэстывалі ў Вэнэцыі. Другі фільм — "Белы" — атрымаў праз год "Срэбнага Мядзьведзя" ў Бэрліне. Апошнюю частку трылёгіі чакаў трыюмф. Фільм "Тры колеры. Чырвоны" амэрыканская акадэмія кінамастацтва намінавала на "Оскара". Праўда, гэтага прызу праца Кясьлёўскага не здабыла, але затое атрымала ўзнагароду імя Мэліеса, што прысуджаецца Французскім Сындыкатам Кінакрытыкаў. Здавалася, высокая ацэнка ягонае творчасьці павінна была натхніць рэжысэра на новыя шэдэўры. Тым ня менш, "Тры колеры" сталіся апошняй працай рэжысэра. Кясьлёўскі неўзабаве абвясьціў на Канскім фэстывалі, што болей ня будзе здымаць фільмы. Спыненьне творчага жыцьця фатальным чынам пацягнула за сабой спыненьне жыцьця фізычнага.

Андрэй Андрыеўскі

Беларуска-літоўскі канфлікт

Гутарка гісторыкаў літаратуры: Дарыюс Куоліс (АН Літвы) і Сяргей Шупа ("Наша Ніва")

Выразнае разьмежаваньне паміж беларусамі ды літоўцамі ў бачаньні мінуўшчыны Вялікага Княства пачалося ў XX ст. Раней, калі існавала гэтае Вялікае Княства, разыходжаньні, якія дакляравалі-ся прадстаўнікамі элітаў двух этнасаў, уяўлялі сабою выказваньне або розных арыентацыяў, або розных сымпатыяў — але прадстаўнікоў аднаго палітычнага арганізму. Нараджэньне нацыяў азначала нараджэньне зусім розных адчуваньняў гісторыі ВКЛ. Беларускія й літоўскія гісторыкі ў сваіх прадметах і ў сваіх стылістыках сфармулявалі (а ў некаторых выпадках справакавалі) гістарыяграфічныя разыходжаньні. Паспрабуем для будучае дыскусіі вызначыць некаторыя вузлавыя кропкі гісторыі, якія сталі кропкамі канфлікту гісторыяграфіяў:

— узьнікненьне ВКЛ: лякалізацыя тэрыторыі летапіснае Літвы, вызначэньне першай "сталіцы", вызначэньне ініцыятараў працэсу ўтварэньня дзяржавы;

— палітычная эліта: вызначэньне прыналежнасьці яе да этнасаў — беларускага ці літоўскага;

— падзел культурнае спадчыны — з гэтым найперш зьвязана й фармуляваньне "права ўласнасьці" на ВКЛ (адсюль варыянты вызначэньняў: літоўская дзяржава, беларуская, беларуска-літоўская, літоўска-беларуская);

— тэрытарыяльная праблема найноўшае гісторыі: прыналежнасьць Вільні, лінія дзяржаўнае ды этнічнае мяжы.

Некаторыя гістарыяграфічныя праблемы маюць характар скразных (глябальных) ды могуць зьяўляюцца прадметам дыскусіяў у межах некалькіх вузлавых праблемаў. Адна з такіх праблемаў — дэфініцыя афіцыйнае мовы Вялікага Княства. Але гэтая праблема пачынае паўставаць хутчэй для літоўскай гістарыяграфіі, у беларускай тэрмін "старабеларуская мова" ўжываецца найчасьцей у сэнсе простай канстатацыі. І можа быць тут найважнейшы пункт разыходжаньняў. Разлом утварыўся не як вынік вострых дыскусіяў, а як наступства спробаў інгнараваць прадмет — адна гістарыяграфія (літоўская) да нядаўняга часу не заўважала факту дамінаваньня старабеларускай мовы, другая гістарыяграфія (беларуская) ня бачыла падставаў для дыскусіі. Гэта значыць, што адбылося такое глыбокае разьмежаваньне, пры якім гісторыкі рознай нацыянальнасьці, якія дасьледавалі гісторыю ВКЛ, вывучалі мінуўшчыну розных дзяржаваў. А тое, што Вялікае Княства Літоўскае — гэта палітычня цэльнасьць, толькі дадавала драматызму ў беларуска-літоўскі канфлікт гісторыкаў.

Значыць, калі сапраўды распачнецца дыялёг беларускіх ды літоўскіх гісторыкаў, ён абавязкова мусіць закрануць моўную праблематыку, ці, дакладней, тады будзе сфармулявана праблема моўнага фактару ў гісторыі ВКЛ. Вось чаму ў інтэрвію, што тут друкуецца, Дарыюс Куоліс ды Сяргей Шупа так шмат размаўлялі пра старабеларускую й літоўскую мову ў ВКЛ. Д.Куоліс — гісторык літаратуры, намесьнік дырэктара Інстытуту Літаратуры і Фальклёру Акадэміі Навук Літвы, у 1990-1992 г. быў міністрам культуры і асьветы.

Рэдакцыя "НН" мае намер зрабіць праблематыку беларуска-літоўскга канфлікту гісторыкаў сваёй сталай тэмаю й рэальна распачаць свабодную дыскусію пра інтэрпрэтацыю тэксту гісторыі Вялікага Княства.

A.Dz.

Сяргей Шупа: Калі пагартаць старонкі кніг, прысьвечаных гісторыі культуры ВКЛ, напісаных у Менску, Вільні і дзе-небудзь у Польшчы, — ад школьных падручнікаў да навуковых манаграфіяў — чытач мог бы падумаць, што гаворка йдзе пра тры зусім розныя краіны. У прынцыпе, ясна, у чым тут праблема, таму што гуманітарныя навукі вельмі часта ставяць сабе за мэту ня пошукі супэраб'ектыўнай навуковай гістарычнай ісьціны, а канкрэтныя патрэбы фармаваньня гістарычнае сьведамасьці свайго народу. Таму нацыянальная гістарыяграфія, гістарыясофія, гісторыя нацыянальнай культуры вельмі часта ўяўляюць сабою "мастацкія творы", якія дапамагаюць гадаваць маладое пакаленьне ў духу, патрэбным для ўмацаваньня маладой нацыянальнай дзяржавы. Аднак, калі гаварыць канкрэтна пра літоўцаў і беларусаў і пра дзяржаву, у якой калісьці жылі іхнія продкі — ці ня страчваем мы нешта ад такой сэлектыўнасьці погляду на сваю гісторыю?

Дарыюс Куоліс: Мне здаецца, што істотнае было Вамі заўважана — сапраўды, сучасныя дзяржавы, што ствараліся ў XIX ст., на гістарычную навуку глядзелі вельмі па-рознаму, рамантычная парадыгма гістарычнае навукі — на гісторыю як пэўную міталёгію, як на крыніцу знакаў, сымбаляў, якія мусяць быць падпораю нацыянальнае сьведамасьці. Але гэтак жа сама ёсьць і іншы сур'ёзны погляд на гістарыяграфію як на інтэрпрэтацыю, калі прызнаюцца магчымасьці розных паглядаў, а сама гісторыя разглядаецца як творчасьць свабодных людзей. Гісторыя як гуманітарная дысцыпліна непазьбежна сутыкаецца з тым вымярэньнем свабоды, якое робіць гісторыю адкрытым, шматзначным тэкстам, і тыя інтэрпрэтацыі непазьбежна бываюць розныя, бо інтэрпрэтатар таксама мае тое самае вымярэньне свабоды, ён таксама свабодны чалавек, тым болей, што этнічныя супольнасьці як інтэрпрэтацыйныя супольнасьці таксама тлумачаць па-свойму мінуўшчыну як тэкст.

Я вельмі сумняваюся, што нам калі-небудзь удасца займець "аб'ектыўную" гісторыю таго ці іншага народу, як марылі — і літоўскія гісторыкі — што вось, пасьля саветаў будзе магчыма стварыць праўдзівую, аб'ектыўная гісторыя Літвы. Сутыкнуўшыся зь беларускімі гісторыкамі на розных міжнародных гістарычных мерапрыемствах, я адчуў, што гэткая ілюзія жывая і ў Беларусі, што вось будзе створана гісторыя беларускага народу, дзе мы ўсё вытлумачым і скажам, як мы жылі й як маем жыць. Гэта ўсё тая самая гістарыяграфічная ілюзія, якая йснавала за часы рамантызму й пазытывізму (як ні дзіўна, рамантычная й пазытывісцкая пазыцыя ў гэтым выпадку супадаюць) і ясная трактоўка гісторыі — як трактоўка нацыянальнае ідэалёгіі.

Мы можам гаварыць пра палілёг інтэрпрэтацыяў, пра канфлікт інтэрпрэтацыяў, але ў адкрытай культурнай прасторы сёньняшняга дня. Такая пазыцыя была б мне больш прымальная. І ў гэтым сэнсе я ўяўляю сабе, што для гэтай інтэрпрэтацыйнай прасторы будуць вельмі карысныя пазыцыі беларускіх інтэрпрэтатараў, свабодныя й сумленныя пазыцыі, якія ні ў якім разе не супадуць з пазыцыямі літоўскіх інтэрпрэтатараў, а таксама розныя інтэрпрэтацыі літоўскіх гісторыкаў. Але было вельмі старамодна й небясьпечна для дачыненьняў паміж абодвума нашымі народамі, для разьвіцьця сьведамасьці абодвух народаў, калі б мы цяпер пачалі шукаць адзіную праўдзівую, аб'яднаную для ўсяго беларускага народу інтэрпрэтацыю гісторыі, або міталягізашыю гісторыі, і супрацьпаставілі б яе нейкай гэткай самай адзіна праўдзівай канцэпцыі літоўскай гісторыі ды глядзелі б, як іх можна скласьці або б спрабавалі, што таксама ілюзія, вывесьці нейкую агульную парадыгму з гэтых дзьвюх гісторыяў, або калі яшчэ далучыць сюды палякаў — вывесьці нейкую агульную для усіх траіх гістарычную парадыгму. У гэтым назіраецца пэўны анархізм. Гэткія спробы назіраюцца ў некаторых сёньняшніх абмеркаваньнях, гаворыцца аб агульным падручніку, якім маглі карыстацца і беларускія, і польскія, і літоўскія дзеці. Такія ілюзіі былі пасьля другое сусветнае вайны, здаецца, у скандынаўскіх краінах, сеўшы разам, пісалі такія падручнікі. Была зроблена вялікая праца, а пасьля ў школах гэткімі падручнікамі не карысталіся — датчане, здаецца, такі падручнік напісалі, і ім зусім не карысталіся.

С.Ш.: Я цалкам згодны з такой Вашай пазыцыяй і хацеў бы, каб палілёг інтэрпрэтацыяў пачаўся зараз жа, тут і цяпер. Вось жа беларускаму грамадзтву літоўская гістарыяграфія найбольш і вядомая ў яе ізаляцыйна-агрэсіўнай форме, якая была створана дзеля канкрэтных патрэбаў канкрэтнае эпохі. Усякія іншыя інтэрпрэтацыі фактычна не даходзяць — нашыя народы дагэтуль разьдзяляе вялікі інфармацыйны "кітайскі мур". Мне запомніўся такі, на маю думку, яскравы прыклад інфармацыйнае прорвы паміж нашымі культурамі. У адным з сэмінараў па літаратуры ВКЛ, што адбыўся ў Вашым інстытуце, дакладчыца з Коўна выступала з паведамленьнем пра дзёньнік Тодара Еўлашоўскага, які яна сама й пераклала паводле выданьняў XIX ст. Дакклад быў вельмі эьмястоўны й выклікаў жывое абмеркаваньне. Для слухачоў, а сярод іх было нямала спэцыялістаў па гісторыі культуры й літаратуры ВКЛ, гэта відавочна сталася адкрыцьцём новае арыгінальнае й малавядомае дагэтуль старонкі гісторыі гэтай — нашай і вашай — дзяржавы. Для беларускага слухача гэта выглядала даволі нечакана і дзіўна — пра Еўлашоўскага ў нас ведае любы студэнт філялёгіі, на матэрыяле дзёньніка пішуцца дысэртацыі й манаграфіі, за апошнія гады ягоны тэкст перавыдаваўся двойчы паводле арыгіналу, знойдзенага ў 60-х гадох у Польшчы — пра які ковенская дакладчыца нічога ня ведала.

Д.К.: Ёсьць адна рэч, што гісторыя культуры Літвы ў даваенныя часы абапіралася толькі на літоўскія тэксты, і гэтую літоўскую традыцыю ВКЛ зварачалася асноўная ўвага. Цяперашняя гістарыяграфія культуры ВКЛ, тут можна прыгадаць працы Лукшайтэ або сёньня ўжо нябожчыка Юозаса Юргініса, спрабуе разглядаць спадчыну ВКЛ як непадзельную. Вось жа шмат з таго, што было за часы ВКЛ напісана "па-руску" — па-беларуску або па-ўкраінску — не атрымала тае натуральнае ўвагі, якая мусіла быць адведзеная гэтай культуры, гэтай літаратуры. Цяпер "утаймоўваюцца" й гэтыя тэксты. Увогуле ж, я думаю, літоўскія гісторыкі чытаюць беларускія гістарыяграфічныя працы, іншая справа, што сёе-тое ў іх часам шакуе, я б сказаў — якраз тая свабода інтэрпрэтацыі, якая часам, здаецца, бывае занадта вялікая.

Дарыюс Куоліс

Але я б хацеў закрануць яшчэ адну тэму. Мне здаецца, што тая маладая нацыяналістычная літоўская гістарыяграфія канца XIX—пачатку XX ст. і сёньняшняя беларуская гістарыяграфія у пэўнай меры ігнаруюць самастойнасьць тэксту, самастойнасьць гістарычнага тэксту. Гэткая бяда ёсць. Імкненьне падладзіць сам тэкст пад нейкае гатовае меркаваньне або пад чаканы вынік. Спробы згвалціць тэкст. І з гэтага гледзішча вельмі відавочна, што ВКЛ разумелася як дзяржава двух народаў, або вельмі часта — як дзяржава трох народаў: літвінаў, русінаў і жамойтаў. І дасьледаваныя мною тэксты якраз гэта паказваюць: Грамадзяне ВКЛ ясна ўяўляюць сабе, што ёсць тры этнасы. Палітоўску яны звaліся таксама gudai, žemaičiai і lietuviai — у літоўскіх крыніцах. Тое самае і ў Стрыйкоўскага — narod ruski, žomojtski і litewski. І гэтыя тры этнасы жылі і суладна, і тое, што быў створаны палітычны арганізм — ясна, што гэта была творчасьць усіх этнасаў. Часамі гэтая творчасьць была суладная й гарманічная, этнасы не маглі пражыць адзін без аднаго, каб захаваць той дзяржаўны арганізм, але разам з тым мы можам пабачыць і іхную самастойнасьць у той дзяржаве. Асабліва ў XVI ст., калі ўзьнікла ідэя нацыянальнае дзяржавы — дзяжавы, якая абапіраецца на нацыянальную культуру — пад уплывамі ідэяў Рэнэсансу, мы бачым, як тыя этнасы між сабою канфрантуюць. Але разам з тым імкнуцца захаваць ВКЛ як палітычны арганізм, які гэтыя этнасы ахоўвае, запэўнівае іхнае йснаваньне.

Зь іншага боку, я ўсё ж не адмаўляў бы тае сувязі сучаснай нашай дзяржавы з палітычнай спадчынай ВКЛ. Гэтая сувязь відавочная. Палеміка ў літоўскай гістарыяграфіі была вельмі моцная і ў часы незалежнасьці — ці Літоўская Рэспубліка ствараласа як нешта зусім новае, або гэта быў працяг ВКЛ? Тая самая палеміка разгарнулася ў 70-я гады на эміграцыі. Адныя літоўскія гісторыкі вельмі радыкальна даводзілі, што Літоўская Рэспубліка — гэта зусім новае ўтварэньне, якое магло ўзнікнуць, толькі калі разбурыцца старая традыцыя, іншыя — пераважна літоўскія гісторыкі шляхецкага паходжаньня — якраз даводзілі, што літоўская шляхта павярнула на новы гістарычны шлях, захаваўшы старую дзяржаўную традыцыю і толькі гэтак магла аднавіцца Літоўская Рэспубліка. Сувязь гэтая вельмі складаная й неадназначная, але сувязь гэтая ёсьць. Гэта датычыць як Літвы, гэтак і сучаснае Беларусі. Невядома, як бы склаліся дачыненьні паміж двума народамі, які б палітычны лёс выбралі сабе беларусы й літоўцы, калі б не было маскоўскага ўплыву, і якое дачыненьне тады б мелі абодва народы да ВКЛ. Інтэрпрэтацыя магла быць зусім іншая — шукалася б, што яднае абодва народы, і згодна з гэтым вызначаўся пэўны спосаб сужыцьця — у тыя гады, калі толькі што была адноўлена нашая дзяржаўнасьць.

С.Ш.: Як усё ж успрымае сучасная літоўская культура, у кантэксьце таго, што Вы толькі што казалі, афіцыйную актавую мову ВКЛ, на якой быў створаны калясальны корпус тэкстаў — ад дзяржаўных актаў да крыміналных запісаў. Цяжка запярэчыць цьверджаньню, што гэта была жывая мова, якая была ў штодзённым ужытку русінскага насельніцтва ВКЛ, канвэнцыйна прыстасаваная да пісьмовых тэкстаў. Я б не пагадзіўся з прафэсарам З.Зінкявічусам, які называе яе штучнай канцылярскай мовай, нейкай "усходнеэўрапейскай лацінай", на якой рэальна ніхто не гаварыў — бо такой мове бясспрэчна трэба было б спэцыяльна навучаць. Супраць гэтага сьведчыць перадусім неверагодная колькасьць тэкстаў — пэўна ж, тыя, хто пісаў, асобна гэтай мовы не вучылі — яны на ёй гаварылі. Зь іншага боку, у ВКЛ яна відавочна набыла надэтнічны характар. Нездарма ж татары, якія пасяліліся на беларуска-літоўскіх землях, забыўшыся свае мовы, пераклалі (стара)беларускую й пісалі на ёй, толькі арабскай графікай, свае кнігі. У пэўным сэнсе для літоўскіх гісторыкаў мова гэтая больш важная, чым лацінская, і аднак "на паверхні" яе не відаць — прыкладам, пра яе ролю й значэньне, або нават і пра сам факт яе йснаваньня маўчаць школьныя падручнікі гісторыі. У шырокай грамадзкай сьвядомасьці можа скласьціся ўяўленьне, што ў ВКЛ іншае мовы, апрача літоўскае, не было...

Д.К.: Пытаньне Вашае вельмі сур'ёзнае. На першую яго частку магу адказаць толькі, што пакуль яшчэ цяжка адольваецца замкнёнасьць, вузкасьць літоўскага погляду на гісторыю, характэрная той традыцыйнай гісторыі літоўскай культуры — заўважаюцца толькі літоўскія тэксты, паволі ўводзяцца ва ўжытак тэксты лацінскія і ўсё. Што да сёньняшняй гістарыяграфіі, дык паўсюль — ва ўсіх сур'ёзных працах — аб'ектыўна гаворыцца пра мову ВКЛ. Думаю, пра гэта ведаюць і ў школе: славянская мова была фактычнай

гісторыкаў

дзяржаўнай мовай у ВКЛ. Аднак, пагаджуся, дамінуе той літуаністычны погляд на гісторыю культуры, які мусіць цяпер пашырацца, і трэба рабіць што магчыма, вось і Інстытут Літаратуры АН Літвы, як толькі можа, акцэнтус сёньня й іншамоўныя тэксты.

Што да мовы, да беларускіх тэкстаў. Я ўсё ж пагадзіўся б з прафэсарам Гудавічусам, што варта было б называць гэтую мову "gudu kalba" — бо менавіта так называлі яе самі літоўцы ў XVI-XVIII ст. Гэты тэрмін зафіксаваны ў слоўніку Сірвіда, у іншых тагачасных слоўніках. "Gudai" не зусім атаясамліваюцца з сучаснымі беларусамі, бо ў тыя часы гэтак называлі і ўкраінцаў. Тэрмін "gudai" адпавядаў у тыя часы "русінам", і я думаю, гэтага тэрміну ў літоўскай гістарыяграфіі й варта было б трымацца. Вось жа відавочна, што "русінская мова" была фактычнай дзяржаўнай мовай ВКЛ і асноўныя дакумэнты былі створаныя на "русінскай" мовс — у тым ліку і дакумэнты, на якія абапіралася дзяржава — Статуты, гістарыяграфія й г.д. Але мы мусім заўважыць і пэўныя канфрантацыі культураў, якія адбываліся асабліва востра ў XVI ст. — бо ж і Міхалон Літвін, і Аўгусьцінас Рантудас гавораць пра тое, што гэта мова агульная з маскоўцамі, а таму яна не дае Літве быць самастойнай і моцнай дзяржавай, а таму трэба перайсьці на лацінскую мову. Бачым адну альтэрнатыву. І калі гэткія ідэі высоўваюцца аднымі рэдактарамі Статуту — Рантундас быў адным з рэдактараў, Волан таксама, здаецца, падтрымаў лацінскі варыянт — у той рэдакцыйнай групе былі й праваслаўныя, і гэтыя людзі "русінскай" культуры ўзялі верх, бо Ратундас прапанаваў пісаць Статут па-лацінску, аднак урэшце ён быў напісаны па-"русінску", лацінскі пераклад Ратунда ўсё ж не прайшоў, Сойм яго не зацьвердзіў. Але ж пэўнае напружаньне мы заўважаем. Вось і у прадмове Даўкшы: "Не лацінская мова й не русінская, але літоўская мова мусіць запанаваць ва ўсім Вялікім Княстве Літоўскім". Ён вельмі выразна зазначыў, што літоўскую мову мусяць шанаваць і літоўцы, і ўсе тыя, што жывуць у ВКЛ. Мы думаем, што тут ёсьць вельмі моцнае напружаньне, што і афіцыйная мова і што русіны, якія ня ведаюць гэтае мовы, мусяць усё ж цаніць гэтую мову, якую неабходна ўвесьці у гэтай дзяржаве ў канцы XVI ст. Але ёсьць і яшчэ адна рэч — ужо пазьней "русінская" мова супрацьстаяла й польскай мове як знак пэўнае культурнае тоеснасьці ВКЛ, гэтак польскай мове супрацьстаяла лаціна й "русінская" мова. І Варшаўскі Сойм 1697 г., які абмежаваў паўнамоцтвы гетмана найвышэйшага літоўскага, што таксама нанесла ўдар дзяржаўнасьці ВКЛ, афіцыйна ўвёў у дзяржаўны ўжытак польскую мову. Мы бачым, што абмежаваньне дзяржаўнасьці ВКЛ зьвязвалася і з абмежаваньнем "русінкае" мовы.

Задача літоўскае гістарыяграфіі — паглыбляцца ў "русінскую" культуру, у тэксты, напісаныя "парусінску"... Яшчэ адна рэч — ня варта атаясамліваць людзей, што пісалі "па-русінску", выключна з аднымі русінамі. Мы мусім бачыць, што ў палітычнай нацыі ВКЛ былі гэтыя тры этнасы — русіны, літвіны й жамойты, якія шмат у якіх тэкстах таксама лічаць сябе асобным этнасам. І іх яднала доўгі час гэтая мова й была адным з элемэнтаў культурнага й палітычнага ідэнтытэту — "русінская" мова для гэтых трох этнасаў.

С.Ш.: Якую місію мусілі б узяць на сябе беларускія й літоўскія навукоўцы, гісторыкі культуры, каб засьцерагчы нашыя два народы ад непаразуменьняў, вельмі небясьпечных у нашыя трывожныя часы? Што мы можам зрабіць, каб разбурыць той мур, што нас разьдзяляе? Якія ідэі мусім мы несьці ў грамадзтва?

Д.К.: Вельмі складанае пытаньне. Тое, што цяпер адбываецца ў Беларусі, нямала нас палохае, спараджае спачуваньне беларускай культурнай эліце. Мне здаецца, што вялікаю драмай беларускага народу было тое, што беларуская культурная эліта ня здолела стацца элітай палітычнай, што часткова ўдалося ў Літве, але таксама не да канца. Палітычная эліта "культурнага паходжаньня" ў Літве не была дастаткова самастойная, дастаткова эмансыпаваная, дастаткова мудрая. У гэтым таксама драма. Іншая рэч — доўгія часы саветызацыі нашых народаў, нашых этнічных супольнасьцяў, якія таксама няшмат мелі нацыянальнае сьведамасьці, палітычнага разуменьня. Былі ілюзіі, што "сыпеўная рэвалюцыя" ў Літве мае вялікія патэнцыі, шмат чаго можа, але пасьля выявілася, што гэта шмат у чым быў экспромт, якога не хапіла на даўжэйшы час. Але ўсё ж калі ёсьць групы людзей, якія адчуваюць абавязак перад лёсам краю, перад лёсам нацыі — групоўкі культурнае эліты, ну яны ж нешта мусяць рабіць, пакуль яны йснуюць.

Я толькі бачу адну небясьпеку — гэта адданасьць такім раманты чным стэрэатыпам, уяўленьням, што любыя сродкі ў канцы XX ст., якія служаць нацыі, аб'ядноўваюць яе, апраўданыя ў нашы часы. І мне здаецца, што беларуская эліта часам паддаецца той ілюзіі, што цяпер трэба рабіць усё, каб абудзіць нацыянальную сьведамасьць, стварыць усе міты, неабходныя нацыі — зробім, а пасьля паглядзім, пасьля ўжо адламо даніну навуковай гістарычнай праўдзе й г.д., а пакуль што будзем рабіць усё, каб выгадаваць сваю этнічную супольнасьць. Такія ілюзіі — яны даволі сучасныя, так, прыкладам сусьветна вядомы сэміётык Альгірдас Юліюс Грэймас, выступаючы ў 70-я гады на адным з сымпозіюмаў эміграцыйных літоўскіх навукоўцаў гаварыў, што ў гэтым якраз і заданьне інтэлектуалаў — ствараць нацыі міталёгіі, не пакідаць нацыю безь міталёгіяў, але гэта выклікала палеміку — усё ж трэба прывучаць сваю этнічную супольнасьць глядзець праўдзе ў вочы і вучыцца жыць ва ўмовах праўды, бязь мітаў, быць самастойнай, здольнай да свабоды. Такой пазыцыі мне хацелася б і ад літоўскіх інтэлектуалаў, якія часам таксама паддаюцца той ілюзіі, што асаблівая сытуацыя апраўдвае сродкі: кажучы праўду сабе, мы іншым можам падаць гэтую праўду крыху іначай. І якраз гэтыя самыя настроі, як мне здаецца, пануюць і сярод немалой часткі беларускіх інтэлектуалаў, наколькі мне даводзілася сутыкацца зь імі на міжнародных форумах — калі кажацца, што разумеем, што гэта ня так і крыху сорамна паказаць праўду за межамі Беларусі, але там мы мусім рабіць гэтую працу, бо яна на сёньня неабходная. Думаю, было б вельмі важна, каб менавіта цяпер мы здолелі без стэрэатыпаў, без гатовых уяўленьняў, сур'ёзна гаварыць пра будучыню нашых краінаў у такой постмадэрнісцкай, посткамуністычнай прасторы, і гаварыць такімі дыскурсамі, якія прынятыя сёньня ў заходнім сьвеце, у якіх таксама ёсьць свае хібы, якія таксама недасканалыя, — усё ж гаварыць на сучаснай мове і цьвяроза, без усякіх штучных мітаў глядзець і на сваю мінуўшчыну, і на цяперашнія дачыненьні, і на будучыню. Я б тут пагадзіўся з Томам Венцлавам, што ўсё ж заданьне нацыянальнае культурнае эліты — найперш крытычна глядзець на сябе й на сваю этнічную супольнасьць, змагацца зь яе адмоўнымі стэрэатыпамі й хібамі. Культурныя дыскурсы мусяць цыркуляваць паміж нашымі народамі сёньня, яны мусяць сыйсьціся для палілёгу, пэўнае інтэлектуальнае напружаньне, калі гэта ня будзе, то мы зноў з насьмешкай будзем глядзець адзін на аднаго, але ня знойдзеша таго дзейснага інтэлектуальнага напружаньня, якое вельмі істотнае для сужыцьця нашых народаў.

С.Ш.: Дзякую за гутарку.

31 ЛЮТАГА 1529 Г.

Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика (1528-1547). Knyga № 6. 6-oji Teismu bylu knyga — Vilnius: Vilniaus universitetas, 1995. — 488 p. ISBN 9986-19-016-9

Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика (1499-1514). Knyga № 8. Užrašymu knyga 8. — Vilnius: Mokslo ir enciklopediju leidykla, 1995. — 710 p. ISBN 5-420-01338-x

У параўнаньні зь Літоўскаю Мэтрыкаю не існуе іншых зборaў рукапісных тэкстаў, дзе б так поўна, падрабязна, дэталявана ды рознабакова было адлюстрава жыцьцё Вялікага Княства. Ня столькі гісторыя, як менавіта жыцьцё, што зафіксавана ў вялікакняскіх прывілеях, судовых выраках, шляхецкіх тастамантах... Нават тэксты міжнародных дамоваў маюць адбітак псыхічнага ці настраёвага складу тутэйшага пісара, бо Мэтрыка — гэта дублікатны фонд дакумэнтаў, што выдаваліся ў канцылярыі Вялікага Княства. Кожнае скарачэньне ў тэксьце, кожная вынаска над радком, кожная памылка — факт жыцьця Вялікага Княства. Падзел гэтага вялізнага комплексу дакумэнтаў, прапанаваны ў XIX ст. расейскім дасьледнікам С.Пташыцкім, вылучае з Мэтрыкі "Кнігі" судовых справаў, запісаў, данінаў, прывілеяў, пасольскія, публічных справаў, арэнды. Большыня гістарыяграфічных праблемаў ВКЛ можа быць вырашаная, калі часьцей зьвяртацца да гэтага аўтэнтычнага прадукту — Літоўскае Мэтрыкі.

Напрыканцы 70-х гадоў XX ст. была сфармуляваная міжнародная навуковая праграма публікацыі кніг Мэтрыкі (Глядзі "Нашу Ніву", №6 за 1994 год). Удзельнікі праекту — навуковыя ўстановы Польшчы, Літвы, Беларусі, Расеі, Украіны. Да нядаўнага часу свае выданьні мог прапанаваць толькі польскі бок — у 1987 і 1989 г. Анджэй Рахуба апублікаваў кнігі Мэтрыкі, арыгіналы якіх захоўваюцца ў Варшаве. У Літоўскай Рэспубліцы розныя навуковыя інстытуцыі рыхтуюць свае кнігі Мэтрыкі — у кожнай кнігі свой рэдактар, свае асаблівасьці.

У 1994 г. выйшла Кніга запісаў №5, якую рыхтаваў Эгідыюс Банёніс (Egidius Banionis). Першую карэктуру ён вычытаў ужо ў шпіталі на сваім перадсьмяротным ложку. Кніга была падрыхтаваная пад эгідаю Інстытуту гісторыі Літвы. А ў 1995 г. раптам зьявіліся два новыя тамы Мэтрыкі — №6 і №8 адпаведна пад эгідаю Віленскага Ўнівэрсытэту і зноў Інстытуту гісторыі Літвы. Гэта значыць, што том №7 рыхтавала іншая інстытуцыя, але ня здолела вытрымаць графік. Выконваючы супольна ўзгодненыя правілы публікацыі Мэтрыкі, рэдактары тамоў амаль аднатыпна перадаюць тэксты старажытных дакумэнтаў. Але паза тэкстам кожны рэдактар праявіў сваю навуковую індывідуальнасьць, прапанаваў свае напрацоўкі. Кніга №5 пачынаецца з грунтоўнага агляду гісторыі Мэтрыкі — утварэньня фонду, ягонага архіўнага падарожжа, археаграфічных публікацыяў. Э.Банёніс займаўся гэтымі праблемамі на працягу ўсёй сваёй навуковай дзейнасьці. Альгірдас Балюліс (Algirdas Balulis), які рыхтаваў да друку том №8, выкарыстоўвае мінімалісцкую мадэль — пасьля таго, як столькі напісана пра Мэтрыку, ён ня стаў публікаваць падрабязныя ўводзіны, а распавёў толькі пра "сваю" Кнігу запісаў №8. Выразная рыса віленскіх выданьняў — шыкоўны даведачны апарат: камэнтары да дакумэнтаў, тэрміналягічны (са слоўнікам старабеларускае лексыкі), геаграфічны, іменны паказальнікі. Але як розным інстытуцыям-публікатарам Мэтрыкі не ўдалося вытрымаць адзіны фармат розных тамоў, дык таксама няма поўнае ўніфікацыі ў выданьнях: А.Балюліс прапанаваў сваю сыстэму спасылак у тэрміналягічным паказальніку, крыху мадэрнізаваў прынцыпы публікацыі тэкстаў; Станіслаў Лазутка (Stanislovas Lazutka), які рыхтаваў том №6, увогуле адмовіўся ад асобных камэнтароў да дакумэнтаў, затое напісаў такія ўводзіны да Кнігі судовых справаў №6, якія практычна сталі дасьледаваньнем розных сфэраў сацыяльнага жыцьця Вялікага Княства. На падставе дакумэнтаў "сваёй" кнігі С.Лазутка прааналізаваў судовую справу, землеўладаньне, сямейнае права й працэс запрыгоньваньня сялянства, робячы ў кожным выпадку спасылкі на ўсе дакумэнты, што маюць дачынэньне да праблемы.

Рэдакцыйна-выдавецкая праца С.Лазуткі вызначаецца найбольш традыцыяналізмам. Сама нумарацыя старонак адпавядае прынцыпам публікацыяў XIX ст. — старонкі аўтарскага ўступу нумараваныя рымскімі лічбамі, а старонкі, дзе публікуюцца дакумэнты, традыцыйна пранумараваны арабскімі лічбамі. Нягледзячы на ўмоўнасьць сыстэмы падзелу Мэтрыкі, што прапанаваў С.Пташыцкі ("і гэта варта помніць публікатарам і дасьледнікам"), С.Лазутка канстатуе: "Няма дастатковых падставаў і адмовіцца ад такога падзелу. Адмовіцца ад яго — гэта значыць прыўнесьці няхай і ў недасканалую традыцыю яшчэ большы хаос, перакрэсьліць цэлы пэрыяд у гісторыі пытаньня" (с.IX). Вось гэтае трыманьне навуковае традыцыі й вызначыла грунтоўнасьць працы С.Лазуткі. Дасьледнік прааналізаваў такую не папулярную ў постсавецкіх гістарыяграфіях зьяву, як фармуляр дакумэнтаў, г.зн. правёў вылучэньне структурных частак дакумэнтаў, вызначыў іхную будову. У савецкім крыніцазнаўстве гэты мэтадычны прыём уважаўся за фармалістычны, другасны. Але што такое дакумэнт, калі ня пэўным чынам фармалізаваная ды стандартызаваная перадача на паперы (альбо на іншых носьбітах інфармацыі) сутнасьці зьявы? Тут стандартызацыя тэкставых частак — гарантыя разуменьня дакумэнтаў рознымі людзьмі. Вось чаму С.Лазутка так падрабязна прааналізаваў кожны з дакумэнтаў Кнігі судовых справаў №6 на прадмет іхнага фармуляру.

Прафэсар Лазутка прапанаваў новую канцэпцыю дзяржаўнасьці старабеларускае мовы. Ягоны скепсыс выклікае сама дыскусія вакол мовы Мэтрыкі. Дасьледнік прыводзіць словы Ўладзімера Пічэты пра тое, што "мова беларускае пісьменнасьці, дасягнуўшы высокага разьвіцьця ў XVI ст., натуральна, адрозьнівалася ад жывое народнае мовы "простых людзей", хоць фанэтычна й марфалягічна была беларускаю". Але віленскі прафэсар ідзе яшчэ далей, сьцьвярджаючы, што мова Мэтрыкі была ня толькі кніжнаю моваю. Правёўшы тэксталягічны аналіз дакумэнтаў, С.Лазутка вызначыў фрагмэнты, у якіх пісары непасрэдна ў простай мове выкладалі сьведчаньні бакоў і сьведкаў. Таму, на думку прафэсара, у мове Мэтрыкі мы маем справу не з працэсам "зьбліжэньня кніжнае мовы з жывою народнаю моваю" (паводле Пічэты), а з жывою народнаю моваю звычайных баяраў, а часам і сялянаў, якая перадавалася пісарчукамі амаль літаральна. Цытуючы адну з судовых справаў Менскага павету, С.Лазутка рытарычна зазначае: "Узьнікае пытаньне, на якой жа яшчэ мове маглі размаўляць сяляне Менскага павету, як не на беларускай, г.зн. на мове, на якой тады размаўляў народ Беларусі". Але таксама відавочна, што гэтая мова адрозьніваецца ад сучаснае беларускай. "Таму дакладней называць яе старабеларускаю". "Але самае цікавае ў справах "кнігі" з пункту гледжаньня мовы, што й літоўскія баярасы (баяры), і нават сяляне даюць паказаньні, паводле нашага цьвёрдага перакананьня, на гэтай жа мове". Адваротныя выпадкі толькі падкрэсьліваюць правілы. Калі аднойчы судовага чыноўніка, пасланага дапытаць сьведку на Жмудзі, спаганяты пачаў угаворваць па-літоўску, дык чыноўнік адразу пра гэта паведаміў суду. Бальшыня службоўцаў літоўскае мовы ня ведала, і ня толькі ўсё справаводства, але й сам судовы працэс, г.зн. прэтэнзіі бакоў, сьведчаньні й допыт вяліся на старабеларускай мове. Прафэсар Лазутка робіць заключную выснову: "За 200 гадоў гэтая мова стала ня толькі афіцыйнаю канцылярскаю мовай Літоўскае дзяржавы (што не выклікае сумневаў), але ў пэўнай ступені й моваю публічных стасункаў. Яе ведалі й на ёй размаўлялі ў публічных месцах паны, шараговая шляхта, мяшчане і, падобна, нават некаторыя сяляне". Такім чынам, прафэсар Лазутка зьвёў старабеларускую мову з чыста бюракратычнага ўзроўню на ўзровень шырокавядомай, з мовы канцылярыі вялікага князя ён "зрабіў" яе агульнадзяржаўнаю.

Для старажытных судовых сыстэмаў вельмі важны прынцып прэцэдэнту — судовыя выракі рабіліся на прыклад ранейшых, тое, што адбывалася ў мінуўшчыне, з пункту гледжаньня старажытных юрыдычных прынцыпаў, зьяўлялася традыцыяй, якой неабходна было кіравацца ў судовай практыцы. Акрамя таго, судовыя справы закраналі маёмасныя інтарэсы фаміліяў. Таму кожны судовы дакумэнт перапісваўся й захоўваўся стагодзьдзямі. Пры назапашваньні вялізных масіваў інфармацыі перапісваньне дакумэнтаў пераўтвараралася ў канвэер, дзе пісары маглі й стаміцца, зрабіць памылку. Гэтым, падобна, можна растлумачыць датаваньне 31-м лютага 1529 г. дакумэнтаў №87-88 з Кнігі судовых справаў №6. Я наўмысна зазірнуў у даведнікі, каб пераканацца, што такога дня — 31 лютага, не існавала ніколі. Рымскі Februarius утрымліваў 28 дзён; рэфармаваны Юліем Цэзарам каляндар, што дзейнічаў у Эўропе да канца XVI ст., дапускаў у лютым або 29, або 30 дзён. 31 лютага ў Мэтрыцы — гэта хутчэй за ўсё мэханічная памылка перапішчыка, стомленага цяжкім працоўным днём пад наглядам канцлера, які кантраляваў стварэньне дублікатнага фонду самага важнага архіву дзяржавы. У гэтай памылцы можа быць вялікая праўда гісторыі, ключ да разуменьня некаторых яе падзей — нашыя продкі былі жывымі людзьмі, са сваімі слабасьцямі й недасканаласьцямі, яны таксама рабілі памылкі.

Алег Дзярновіч

сола-Кравчука, геть московського попа!" – бот амонаўца прайшоўся. Тады ёй было 15. Яна й да сёньня ня стала прагматыкам, і мне няёмка паціскаць плячыма на яе пытаньне: "Ну чаму вы там, у Менску, студэнты, ня выйдзеце на галадоўку за незалежнасьць. Хіба яна таго ня вартая?"

Намесьнік міністра замежных справаў Цапкала ў задушэўным інтэрвію "Зьвязьдзе" кажа, што мы жывем у эпоху крушэньня маралі – і інтэрвію прызнаюць лепшым матэрыялам месяцу. Міністар друку Бельскі заяўляе, што хоча бачыць сваё міністэрства Міністэрствам праўды. Намесьнік Старшыні Вярхоўнага Савету Малумаў у той самай газэце заяўляе пра засільле беларускай мовы ў СМІ. Цынізм, безмаральнасьць, невуцтва – гэта толькі кветкі зла, калі ж тым пашанцуе яшчэ ажыцьцявіць аншлюс...

Мы марым пра Беларусь без чырвоных пысаў, брудных пад'ездаў і куфаек. Новыя паганцы мараць пра жыцьцё без маралі і беларускай культуры, бо так прасьцей і ямчэй. Супрацьстаяньне культуры і бранявана га дзікунства пачалося ня ўчора і скончыцца ня заўтра. Шкада, што постмадэрн ля калючага дроту, звычайна, не расьце. Затое нараджаецца нонканфармізм.

■ МЕНСК

Алесь Шпакоўскі

БРЫТАНІЯ

Гэты народ у пяць з паловай разоў большы за беларускі, жыве на востраве, ніколі ня меў камунізму або фашызму, разумее гэта і ўвесь час вучыцца на чужых памылках.

Брытанія плошчаю, прыблізна, як Беларусь, але ў адным толькі Лёндане жыве столькі ж людзей, колькі ва ўсёй Беларусі – 10 мільёнаў. Падобны да беларускага і клімат: шмат вільгаці, мяккія зімы. Крыху іншае – атлянтычнае – паветра, што адчуваецца на пах; праз гэта, відаць, больш яркая зеляніна. А звычайны дажджавы чарвяк настолькі актыўна гуляе па траве, што я пужаюся, калі босай нагой адчуваю яго настойлівае казытанне: маўляў – "дай дарогу..." Ён прапаўзае хутка ля мае лаўкі ў сквэр. Людзі тут цёплай парою любяць пабыць на сонцы, сядаюць проста на стрыжаны траўнік, а лаўкі часта пустуюць. Тут агульнапрызнана, што сумленьне чалавека – гэта тое "вакно", якое павінна быць адчынена толькі Богу. Мусіць таму тут ня любяць розных жарсьцяў, лічаць, што ў жарсьці праўды няма. Напрыклад, у закліках да "сусьветнае рэвалюцыі", што плодзяць тут нешматлікія марксісты. Таксама жарсьцю лічыцца, калі чалавек памногу або ўтрапёна глядзіць тэлевізар. Усё павінна падпарадкоўвацца спакойнаму асэнсаваньню.

Кожны прыежджы чалавек тут убачыць сваё: старшыня савецкага калгасу ўбачыць тут "калгас", фэрмэр – фэрму, сацыяліст убачыць сацыялізм, камуніст – "загніваючы" капіталізм. Пры гэтым Брытанія – краіна навуковага, сьвядомага, клясычнага капіталізму, які ўвесь час развіваецца, глядзіць і на Захад і на Ўсход.

Эканоміка ў Брытаніі падпарадкаваная закону вартасьці і кантралююць яе сусьветна вядомыя людзі яшчэ ад Адама Сміта. Палітыка грунтуецца на законе плюралізму – вольнага выбару ды поўнай інфармацыі. Культура цьвёрда ўвабрала пастулят, што найвышэйшая мудрасьць не ў філёзафаў, а ў сьвятых.

Увесь Захад (а я быў у Нямеччыне й Галяндыі) аддзяляе ад славянаў моцны псыхалягічны бар'ер: у чалавечым жыцьці яны бачаць яшчэ адзін, дадатковы да нашага, "паверх" – жыцьцё сумленьня. А з гэтага вынікае цэлы сьвет інстанцыяў, законаў, традыцыяў. Таму ў іх існуе чалавечае вымярэньне ды разуменьне такіх абсалютных паняцьцяў, якія ў нашай культуры не апісваюцца. Напрыклад, "Вышэйшы Маральны Закон" – калі ў чалавека праз малітвы ачышчаецца кроў, сумленьне настройваецца правільна, і чалавек, зьвяртаючыся да Бога, зноў пачынае атрымліваць ясныя адказы на свае пытаньні – Божыя Адкрыцьці. (У нас лічыцца, што толькі навукоўцы атрымліваюць "прасьвятленьні" – пры ўпартай працы.) Таксама і ў эканоміцы – падобны мэханізм: закон вартасьці, калі багатымі становяцца мудрэйшыя ды найбольш прыстойныя людзі. Кажуць, у Англіі робяцца пагадненьні на мільёны фунтаў без афармленьня афіцыйных папераў...

Але свабода сумленьня мае на ўвазе і цярпімасць да тых, хто не прызнае, што "частка Госпада – народ Ягоны". Напрыклад, у Нямеччыне да 17% маладых людзей шукаюць розныя спакусы. У Лёндане ёсьць раён, дзе культура андэграўнду, або "падзямельля", пачуваецца больш вольна. Маладыя людзі мяняюць сабе абліччы: фарбуюць валасы, твары, робяць наколкі, пратыкаюць розныя часткі цела. Ёсьць, зразумела, скрайнасьці. Я бачыў цьвік да 5 см у носе маладога чалавека. Гэта было ў супэрмаркеце – вялікай, шматлюднай краме і "падземны" выглядаў напружана. Трэба сказаць, што ўсе спакусы, якія толькі можна прыдумаць, чакаюць тут людзей, асабліва маладых. Але даўгавечнымі ды здаровымі застаюцца тыя, хто шукае добрае. Так было, ёсьць і будзе... Я зрабіў выснову, што калі чалавек робіць сабе штучнае аблічча, а не шукае веру, надзею, любоў у натуральным жыцьці – ён ідзе супраць прыроды свае душы...

Параўноваючы "новых рускіх" з заходнімі бізнэсмэнамі, думаю пра тое, што можа і рэвалюцыя ў Расеі стала магчымай праз гэтых "новых рускіх", якія, пэўна, прыйшлі былі з разьвіцьцём капіталізму ў імпэрскай Расеі? Цяпер, здаецца, пасьля палітычных фанатыкаў у нас зьявіліся грашовыя – такія ж бяздушныя, жорсткія ды агрэсіўныя. Менавіта такіх "багатых" асуджае Біблія, як людзей, ня вартых багацьця. У Лёндане "дыханьне" такіх адчуваецца нязначна на тле моцных законаў ды праваховы.

Няпроста напісаць пра ангельцаў прынятымі ў нас словамі. Бо там слова "добра" або "дрэнна" аб'ядноўвае тую большасьць народу, якую ня страшылі дзясяткі гадоў, як гэта было ў нас. Слова "добра" для іх – перш за ўсё спакой, пэрспэктыва, сонца ў душы. Калі гэтак ёсьць, то чалавеку прыкладзецца і радасьць існаваньня, а за гэтым і ўдача, дабрабыт. Свайго грамадзяніна Брытанія падтрымлівае матэрыяльна ў цяжкія моманты: ёсьць бясплатная адукацыя, бясплатныя дактары, вельмі спрыяльная атмасфэра для тых, хто "варушыцца" – можна ў любым узросьце набыць жаданую прафэсію і, вядома, заснаваць свой бізнэс. Ёсьць нават фірмы, якія адмыслова шукаюць спраўных людзей, каб даць ім шанец пачаць сваю справу. Я пазнаёміўся з індусам, які адчыніў аптэку пры дапамозе такой фірмы. Ён паказаў мне выраб менскага заводу й сказаў, што гэта тое, чым можна зацікавіць ангельскага пакупніка. Бачыў я там у краме і латыскія запалкі...

АПАВЯДАНЬНЕ

Уладзімір Лобач

Успамін пра клясычную восень

Восень была клясычнаю. Менавіта пра такую любяць пісаць местачковыя паэты. Павольная сьмерць зеляніны, сонца, летняга неба, пафарбаваная ў залаты колер. Усім ужо абрыдлі радыкальныя пераўтварэньні зь нязьменным уварваньнем заходніх вятроў і дажджоў на маленькія падвор'і цёплых бяскрыўдных мараў, якія пачалі гадавацца яшчэ ў красавіку, але далі парасткі толькі напрыканцы жніўня. Восень была клясычнаю. Пра такую любяць пісаць правінцыйныя празаікі. І нават мінакі на вуліцах мелі твары клясычна хворых, а не балюча параненых. Павольная хвароба, калі яшчэ не баліць, здаецца гэткаю ж сур'ёзнай, як і показка. Наступствы, якія няўмольна набліжаюцца, бразгаючы разнастайнымі прыладамі для катаваньня ў вясёлкава размаляваных снах, успрымаюцца блазнамі вэнэцыянскага карнавалу.



Здымак Цмока Ізотава.

Ніхто ў тую восень не пабачыў дажджоў, мокрага сьнегу і бруду пад нагамі. Ніхто не адчуў вільгаці ў чаравіках, хваравітых грыпозных козытаў у носе і жаданьня задушыцца, лежачы на даўно нефарбаванай падлозе і слухаючы, як сіпіць газ з усіх чатырох фасрак. Але, пустое. Душацца і ўзімку, што яшчэ можна патлумачыць, душацца ад невыноснае крыўды на сусьвет і ўлетку (некаторыя кажуць, што ўплывае сьпёка). Хай лясьнецца той, хто душыцца. Клясычна, калі зыход стоадсоткавы. Але... Кінем іх.

Для нябогі Сашы, што жыве ў суседнім доме, клясычная восень —пара бясконцых, але прыемных турботаў. Саша любіць зьбіраць сьмецьце. Нічыіх загадаў ці просьбаў абсалютна. Саша любіць зьбіраць сьмецьце. Апалае лісьце, паперчыны, галінкі й трэскі. Пустыя цыгарэтныя пачкі... Саша пільнуе толькі наш мікрараён — маленькае колка з шэрых "хрушчовак". Яго можна ўбачыць, ідучы на працу, вяртаючыся на абед, ці з вакна, падчас вечаровае гарбаты. Саша ня любіць людзей. Гэта заўважна, бо ён іх старанна абмінае. А калі, заняты сваімі справамі, ён кагосьці падпускае бліжэй за два мэтры, то ягоны скачок нагадвае вам палахлівыя ўцёкі добрага, але моцна цярпелага за ўсё жыцьцё сабакі.

Калі ніхто ня шкодзіць яму сваёй прысутнасьцю, Саша займаецца сваёй улюбёнай справай. Без усялякае стомы, з радасьцю на твары ён напаўняе свае пакункі, а то й мяхі, сьмецьцем. У клясычную восень Саша гаворыць з хрумсткім золатам апалай лістоты. Немагчыма сказаць, пра што. Можна толькі пабачыць, як бясконца варушацца ягоныя вусны і час ад часу зьяўляецца гэткая ж незразумелая ўсьмешка.

Аднойчы я вяртаўся дахаты зь нейкае сяброўскае вечарыны. На вузкай асфальтаванай стужцы, што па пэрымэтры ахінае плот дзіцячага садка і прыводзіць да майго дому, была толькі позьневечаровая цямрэча ды рэдкія ліхтары. Я ўжо не ўзгадаю, пра што думаў тады, калі ў сьветлавой пляме, адкінутай ліхтаром, зьявілася ягоная постаць. Я здрыгануўся ад нечаканасьці (у яго неверагодна ціхая хада), ён — ад спалоху. Зрабіўшы некалькі ліхаманкавых крокаў убок, ён паспрабаваў абмінуць мяне, але я адмыслова заступіў яму шлях. Саша спыніўся, і было бачна, што праз імгненьне ён паспрабуе ўцячы.

Уся наша сустрэча доўжылася ня болей за хвіліну. І тады я здолеў запытацца толькі ягонае імя, якога раней ня ведаў. Мне сьвярбела дазнацца, чаму ён так любіць зьбіраць сьмецьце. Хацелася невыносна, але нешта стрымала.

Саша. Мой аднагодак. У зашмальцаваным школьным пінжачку і кірзавых ботах. Чамусьці я ніколі не спачуваў яму, а тым больш не шкадаваў. Бо я не магу шкадаваць тое, чаго не разумею. Дыскусіі пра каханьне і шчасьце заўсёды завяршаюцца цынічнай хлусьнёй. Саша шчасьлівы, калі зьбірае сьмецьце. Яму непатрэбныя ні падвышэньні мінімальнага заробку, ні БНФ, ні жанчына, бо ён адданы сваёй любові. Ён закаханы ў сьмерць. Тысячы штодзённых дотыкаў да ўжо мёртвых рэчаў, мёртвае лістоты, да ўсяго таго, што ўжо аджыло і што мы клічам проста сьмецьцем. Дарэчы, як мала іх розьніць, гэтыя словы: "сьмецьце" і "сьмерць".

Апошнім часам я ня бачу Сашы. Магчыма, зь ім нешта здарылася. Магчыма, я рэдка наведваюся ў свой стары двор. Але чамусьці думкі пра сьмерць прыходзяць усё часьцей і часьцей. Асабліва пранізьлівымі яны робяцца ў клясычную восень.

1 сакавіка 1996 г.

Працяг са стар. 4

Пры згаданай шчыльнасьці насельніцтва цеснаты не адчуваецца. З усіх "гарачых" кропак зьяжджаюцца сюды ўцекачы, і ўсім ёсьць дзе жыць, што есьці, дзе вучыцца. Адзін уцякач з Грузіі мне сказаў так: "Толькі тут я адчуваю сябе спакойна, тут упершыню ў жыцьці адчуў сябе чалавекам".

Уражвае арганізацыя грамадзтва, дзе чалавек сутыкаецца не з канкрэтным чыноўнікам, а з мэханізмам законнасьці. А кожны чыноўнік асьцерагаецца нават падвышеньня голасу свайго кліента.

Ангельцы, відавочна, прыглядаюцца да Расеі, паважаюць яе за моцную навуку, касманаўтыку, але пакуль што не вылучаюць Беларусь як самастойную краіну. Менск ва ўяўленьнях Захаду —усё яшчэ правінцыйны горад, расейская ўскраіна. Даводзіцца кожны раз пры знаёмстве падкрэсьліваць: "... паміж Польшчай і Расеяй..." А вось Літва ў Англіі ўжо разглядаецца як маладая краіна, што мае ясную эўрапейскую арыентацыю і сваю гісторыю барацьбы за незалежнасьць.

Урэшце можна пажадаць кожнаму беларусу не губляць любоў да сваёй Радзімы, а радавацца за такіх суседзяў у будучым агульна-эўрапейскім доме. Мы важныя для іх сваім такім жа старажытным паходжаньнем, прыроджанай культурай, непрацяглым досьведам дэмакратычнага будаўніцтва, што, безумоўна, ужо ёсьць нашым унёскам у сусьветную культуру.

■ НЬЮ-ЁРК

Лявон Юрэвіч

СТАТУС ЭМІГРАНТА

Нас трое. Мы сядзім у найстарэйшым бары ў Нью-Ёрку (ня ведаю, ці дасьцё веры, але запішыце, на ўшэлькі выпадак, як казала мая шляхцянка-бабуля, адрас: скрыжаваньне пляцу Шаўчэнкі й другой авэню, літаральна насупраць украінскай уніяцкай царквы, куды я заходжу часам, бо беларускай няма) і п'ем піва: густое, важкае, як сьмятана зь вяршкамі ў вёсцы, і колеру чалавека — таго, за суседнім столікам, сапраўднага амэрыканца, што расклаў вакол кухля ці то пацеркі, ці то шкельцы і забаўляецца, перабірае, складае нешта. Можа гены ад піва прачнуліся, і трызьніцца яму Аляска, золата ненамытае. Піва — ірляндзкае. Тут, у бары, дзе пад нагамі шапаціць пілавіньне, а сталы пазразаныя надпісамі (як у вясковай школе), і ты п'еш ірляндзкае піва, ня думаеш пра Джойса, які ў беларускім перакладзе ня стаў бліжэйшым, думаеш... пра ІРА?..

Нас трое. Адзін паляк. Другі ўкраінец. Я трэці.

— Ешчэ Польска не згінэла?

— Шчэ не вмэрла Україна?

— Жыве Беларусь!

Жыве Беларусь! Дзе і ў чым? Першыя мае курсы ангельскае мовы... я — філёляг. Гэта, не раўнуючы, як Толкіен, толькі не пісьменьнік. Чамусьці слова "філялёгія" зьнікла тут з маёй мовы і ўсьведамленьня. Калі афармляў паперы, дабіраў балы на магістра (што па-нашаму кандыдат), доўга-доўга тлумачыў — у якой галіне. Бо літаратуру ведаюць, а вось філялёгію — не. З паходжаньнем яшчэ больш складана. White Russia, кажаш? На культурныя паролі не адгукаюцца: Скарына там, Гусоўскі, Будны, 1596, 1863... Спрацоўвае Чарнобыль — і выклікае ў тубыльцаў нязмушанае задавальненьне: так і ведалі, так і атрымалася — Украіна...

Нас трое па дарозе да ўкраінскага бару (два крокі ўгару па вуліцы. Як убачыце манаха ля брамы — паварочвайце сьмела: прыйшлі) далучаецца баўгарка. Манахі наліваюць піва. Чатыры келіхі, пасярод сьвечка. Цемра не ахутвае, яна быццам звальваецца, аднак, зноў жа, не ашаламляе — так і трэба, туды і йшлі. Гамана тых, што прыбіліся раней, невыразная ў сваім рознагрупамоўным паходжаньні, і таму нагадвае сярэднявечнае маленьне. Далучаем свае модлы й мы.

Мы знаёмыя гады два, але й сёньня знаёмімся:

— Гогаль украінскі пісьменнік.

— І я пачынаю разумець: у нас ува ўсіх нешта абрабавана. Хто яго ведае, авой, як казаў мой дзядуля рабін, мо й сапраўды.

Дзяўчына маўчыць. Яно й зразумела. Па-першае, спазьнілася. Па-другое, дзяўчына. Ці наадварот. Я пачынаю скардзіцца ёй. Не заляцаюся, крый Божа, а выкладаю сьціслы курс культуры гісторыі Беларусі.

— Ведаеш, — кажа яна, — у вас натуральная постмадэрновая культура. Постмадэрн бярэ цытатку і ўплятае ў сваю тканіну. Такое ўжо было ў Лацінскай Амэрыцы.

О, улюбёныя Борхес, Картасар, Маркес, вы — камплімэнт?!

Мы гаворым пра літаратуру. Яна — аб апошнім рамане Эка "Ківач Фуко", я адказваю пра Мішэля Фуко.

У бар уваходзяць новыя людзі. Дакладней, уваходзіць гоман, які яны нясуць з сабою. Нешта ўсходняе: чалмы, шырачэзныя каляровыя нагавіцы. Паспрабаваў уявіць на іх пэрсыдзкім узоры васілёк. Постмадэрн.

Яна не распавядае пра Баўгарыю, бо яе гісторыя антырасейская. Па-эўрапейску ведае: французскую, ангельскую, італьянскую, гішпанскую. Перакладае зь японскай. З "агульнапрынятай", але не агульназразумелай — горш.

— Мая сяброўка гэбрайка, — кажа яна, — ня можа чуць нямецкую. А я вось — расейскую. Вы ж шчасьлівейшыя за нас, уся культура сьвету адкрытая праз расейскія пераклады.

Нас ужо чацьвёра. Нас аб'ядноўвае ірляндзкае піва і амэрыканская ноч.

Вяртаюся на мэтро, чытаю расклееныя паўсюдна рэклямы ньюёрскага сабвэю: паэзія ў руху... Каб схавацца ад часу і ад сябе, разгортваю "Нашу Ніву". Побач кітаец гушкае сам сябе ў рытм колаў. Штораз зазіраецца на літаркі. Мабыць, такія сьмешныя.

— Руся, — кажа.

Ах ты, нябога мая.

■ ЗАНАТОЎКІ ЭГАІСТА

Адам Глёбус

Танцы

Танцы — вельмі эратычны занятак.Танцы перадгульня полавага акту. Танцы — рэпэтыцыя блізкасьці.

І можна было ўсяго папярэдняга не казаць, каб ня той факт, што кожнаму з нас раней ці пазьней даводзіцца адчуць гэта на ўласнай скуры.

Мяне запрасіў на дзень нараджэньня аднагодак, чатырнаццацігадовы Валера Кісялёў. На сьвяце я пачуваў сябе няёмка. Можа з-за таго, што астатнія госьці былі гэбраямі, а хутчэй праз тое, што большасьць запрошаных склалі дзяўчаты. Яны й верхаводзілі, і ў свае 12-14 не прыдумалі нічога лепшага, як распачаць танцы пад кружэлкі. Танцаваць я зусім ня ўмеў. І таму страшэнна сумеўся, калі дзяўчынка з доўгай шыяю выцягнула мяне на сярэдзіну пакоя. Амаль ня памятаю яе твару, запомнілася шыя, яе плаўны выгін, і недарэчнасьць падчас танцаў. Я мядзьведзевата таптаўся на адным месцы, паклаўшы рукі на талію мучыцелькі. І нечакана адчуў пад пальцамі гумку яе майткоў. Пад маімі рукамі, пад лёгкай тканінаю сукенкі пагойдвалася, рухалася, варушылася жаноцкае цела. Зусім побач, поплеч, поруч. Недаравальна блізка. Яно плыло, клікала, запрашала. Яно — іншае, дзявоцкае, невядомае — прымусіла адчуць уласную непаўнавартасьць, няскончанасьць, незавершанасьць. Нібыта я безь яе толькі палова істоты, толькі частка сапраўднага дасканалага арганізму. Я пачуваў сябе недабудаваным саборам. Млосьць і гарачыня распусьцілася ўва мне чырвонымі й руковымі кветкамі, а пад скронямі загрукаталі срэбнагалосыя малаточкі. І там... Мой Божа! Там пачало расьці, поўніцца, напінацца. Я ня ведаў, што зрабіць, як спыніць хуткі-хуткі працэс. Я ня ведаў куды падзецца, дзе схаваць вочы. Баяўся наблізіцца да спакушальніцы, а яшчэ больш баяўся адысьці ад яе, бо тады ўсе пабачаць натапыраную левую калашыну, яны здагадаюцца, што гэта не скамечаная насоўка ў кішэні, а зусім іншае. Яны здагадаюцца, пачнуць усьміхацца, перашэптвацца, кпіць.

Музыка абарвалася. Габрэйка сагнула доўгую блакітную шыю, і я ледзьледзь вымавіў амаль нячутнае "дзякуй", кінуўся да крэсла і сеў за стол. Госьці зь дзівам паглядзелі ў мой бок. А мне чуліся за сьпінаю шэпт і ціхі, здушаны, прыкрыты рукою сьмех.

Валера Кісялёў прыладкаваў на прайгравальнік чарговую кружэлку. Некалькі параў закружыліся па цеснаватым пакоі пад гукі вальсу. А я, баючыся, што зноў нехта запросіць на танец, хуценька прабраўся ў перадпакой і, схапіўшы з пачапельніка пінжак, выскачыў з кватэры.

◆

"Кожны танец ёсьць ня што іншае, як пачуцьцёвы экстаз. Інстынктыўнае ап'яненьне, якое ўвасабляецца ў рытмічныя рухі, што адпавядаюць сапраўднаму перажываньню гэтых пачуцьцяў у іх стылізаваным выглядзе", — так на пачатку XX ст. пісаў Эдуард Фукс, а я дазваляю сабе спрасьціць ягонае назіраньне. Танец —гэта стылізаванае выяўленьне полавага акту. Ці яшчэ... Танец — гульня перад актам.

◆

Танец — найлепшы зводнік.

◆

"Самае пікантнае для эратычнай юрлівай фантазіі, — лічыць нямецкі мараліст Эдуард Фукс, разважаючы пра канкан, — гэта калі жанчына са слодычным захапленьнем дэкальтуецца на вачах у свайго партнэра зьверху й данізу, калі яна ў парыве шаленства цалкам агаляецца перад ім, нібыта кажучы пра сваю адданасьць бессаромнымі жэстамі, якія больш ясныя за ўсе словы..."

Танец, як кампазыцыя жэстаў, зьявіўся значна раней за слова. Таму ён больш прыродны, раскрыты, аголены. Спачатку быў жэст, потым быў танец, потым было слова і слова было Бог.

Чалавек гаворыць ня толькі словамі.

Чалавечае цела можа гаварыць жэстамі, бо яно дамінуе ў полавым дыялёгу. І пацьвердзіць тое можа факт з гісторыі канкану.

У 50-х гадах XIX ст. у Парыжы была выдадзена пастанова, паводле якой у танцзалі павінен быў знаходзіцца sergente de ville (паліцыянт), які меў за абявязак папярэджваць, як лічылася, найгоршае й выводзіць з танцзалі даму, якую танчаньне канкану натхняла на вольнасьці і яна пачынала скакаць без кальсонаў.

ПІНГ-ПОНГ ЖЫВЫМІ ЛЮДЗЬМІ

на беларуска-літоўскай мяжы

"12 лютага 1996 г. адзін брокер (праваднік. — Тут і далей заўвагі рэдакцыі) прывёз (прывёў) нас у Літву. Потым гэты брокер пакінуў нас дзесьці ў джунглях (у ляску на мяжы) і сказаў, што вернецца праз 2 гадзіны, але не вярнуўся. Потым мы здаліся літоўскай паліцыі. Паліцыя трымала нас тры дні. Потым яны выштурхнулі нас у Беларусь. Ноччу беларускае войска выкінула нас назад у Літву. Мы зноў здаліся літоўскай паліцыі. Просім вярнуць нас у Маскву".

З тлумачэньня грамадзяніна Банглядэш Арыфа Кхана, якое ён напісаў для літоўскіх памежнікаў.

Праваднікі таемна правялі зь Беларусі ў Літву Арыфа Кхана, а зь ім яшчэ 57 грамадзян Банглядэш, Шры-Лянкі, Індыі і Аўганістану. Праваднікі кінулі іх у лесе, паабяцаўшы хутка зьявіцца з транспартам і даставіць уцекачоў да літоўска-польскай мяжы. Грамадзяне зь цёплых краёў, не дачакаўшыся ні праваднікоў, ні транспарту, цалкам скалеўшы, ня вытрывалі й выйшлі на шашу. Патруль паліцыі, які праязджаў міма, затрымаў іх. Парушальнікі мяжы не супраціўляліся і нават папрасілі паліцыю дапамагчы.

Высьветлілася, што ў іх былі афіцыйна атрыманыя расейскія візы. У некаторых аказаліся і выдадзеныя ў Расеі даведкі ўцекачоў, якія пацьвярджалі, што гэтым асобам нададзены статус уцекача, які дае права на атрыманьне прыстанку ў Расеі. Гэта дазваляе ім заставацца ў Расеі пасьля заканчэньня тэрміну візы. У Маскву яны прыляцелі, што пацьвярджаюць штампы кантрольнага пункту аэрапорту Шарамецева ў іх пашпартах. Да Менску дабраліся нелегальна цягніком з Масквы, бо перасячэньне расейска-беларускай мяжы не кантралюецца.

Для далейшага руху на захад групы ўцекачоў фармавалі ў нейкіх садовых дамках у ваколіцах Менску. Уцекачам давалі праваднікоў. Дакладнае месца яны назваць не змаглі –запомніць такія складаныя назвы ім не пад сілу.

Літоўскія памежнікі спрабавалі паразумецца зь беларускімі калегамі, але тыя рашуча адмовіліся прыняць уцекачоў назад. Адказныя асобы не адмаўлялі таго факту, што ўцекачы праніклі ў Літву зь Беларусі, аднак патрабавалі ў літоўскіх памежнікаў паказаць сьляды, якія даказваюць, што ўцекачы прыйшлі зь Беларусі. Але паколькі беларусы амаль двое сутак адцягвалі сустрэчу зь літоўскімі памежнікамі, а тымчасам выпала нямала сьнегу, сьляды, безумоўна, не засталося.

Літоўскай службе міграцыі не заставалася нічога іншага, як прыняць рашэньне аб тым, што ўцекачы за 24 гадзіны павінны пакінуць тэрыторыю Літвы. Як яны вярнуліся ў Беларусь, літоўскія памежнікі сказаць не маглі — гэта ўжо ня іхная справа. Аднак словы ў тлумачэньні Арыфа Кхана, што літоўскія памежнікі "выштурхнулі нас у Беларусь", зьявіліся, бадай, ня толькі з-за слабых ведаў ангельскае мовы...

Як бы там ні было, нелегальныя мігранты зноў апынуліся ў Беларусі й сталі там ужо легальнымі, бо мелі расейскія візы. Аднак былі зноў затрыманыя. Іх зачынілі ў нейкай казарме, надзелі наручнікі, як сьцьвярджалі ўцекачы, білі й прыгразілі, што калі яны яшчэ раз зьявяцца ў Беларусі, то... расстраляюць. (Становіцца зразумелай мальба Арыфа Кхана вярнуць іх у Маскву)...

Уначы 2 сакавіка ўцекачоў разьдзялілі на некалькі групаў. Адну групу пасадзілі ў крыты грузавік ГАЗ-52 і ў суправаджэньні двух чалавек у форме й аднаго ў цывільным прывезьлі да літоўскай мяжы. Суправаджальнікі паказалі на бачныя ўдалечыні агні (гэта былі Эйшышкі) і загадалі тупаць у тым накірунку, а інакш — расстрэл... Лёс іншых групаў пакуль не вядомы.

2 сакавіка каля 8 гадзіны раніцы на Лаварыскім памежна-прапускным пункце было затрымана 5 нелегальных мігрантаў. Праверка дакумэнтаў і допыт паказалі, што гэта людзі з тае самае групы, якая ўжо была ў Літве. У Эйшышках на аўтобуснай станцыі быў затрыманы 21 нелегал — як высьветлілася, з той самай групы.

Пасьля таго, як міністэрствы замежных спраў Беларусі й Літвы абмяняліся нотамі, 6 сакавіка ў Медніках 4 гадзіны спрачаліся беларускія і літоўскія памежнікі. Дамовіцца не ўдалося. Мала таго: беларусы спрабавалі пераканаць, што ўсіх 58 уцекачоў, якія вярнуліся зь Літвы ў Беларусь, яны пасадзілі ў цягнік і адправілі ў Маскву...

Сустрэча памежнікаў нічога ня мела плёну, бо гэта ж сьмешна, калі міждзяржаўныя справы імкнуцца разьвязаць начальнікі памежных падраздзелаў Смаргоні й Вільні. Калі Беларусь і Літва падпішуць дамову аб рэадмісіі (вяртаньне нелегальных асобаў), такіх канфліктаў ня будзе.

Пакуль беларусы прапануюць толькі розныя "прамежкавыя" варыянты, якія Літву не ўратуюць, затое дапамогуць Беларусі, якая па ранейшаму зможа адчапляцца ад нелегалаў, а іх там цяпер каля 100 тысяч. Перабрацца празь беларуска-польскую мяжу яны амаль не спрабуюць, бо яна добра ахоўваецца яшчэ з савецкіх часоў, значыцца, амаль усе пойдуць празь Літву. Вярнуць іх у Беларусь Літва ня можа, а вось палякі літоўцам іх вернуць, таму што з Польшчай у Літвы такая дамова ёсьць...

Цалкам зразумелае жаданьне і Беларусі, і літоўскіх памежнікаў вызваліцца ад уцекачоў. І неяк забываецца, што гэтыя ўцекачы — людзі, нярэдка падманутыя махлярамі рознага кшталту, кінутыя на волю лёсу, якія мерзнуць, галадаюць, паміраюць, нараджаюць...

Пакуль гэтая праблема ня будзе вырашаная на найвышэйшым дзяржаўным узроўні, пакуль Расея ня ўжорсьціць парадку выдаваньня вайскоўцаў грамадзянам дзяржаваў Азіі, не перастане даваць ім статус уцекачоў, на аснове якога яны легальна могуць зьявіцца ў Беларусі, пінг-понг жывымі людзьмі, у які гуляюць сёньня памежнікі Смаргоні і Меднікаў, дасягне ўзроўню поўнага абесчалавечваньня і будзе пагражаць міждзяржаўнымі нотамі, буйнымі канфліктамі й вялікімі бедамі перш за ўсё нашай дзяржаве. Ня будзем выключаць і такі варыянт, што цярпеньне Расеі да ўцекачоў з Азіі можа стаць даволі эфэктыўнаю "патаемнаю зброяй", каб дыктаваць умовы Літве.

Фэрдынандас Каўзонас,
Respublika, публікуецца з скарачэньнямі

ЛІТВА ЗА ТЫДЗЕНЬ

У Вільні самым паважным чынам рыхтуюцца да паводкі. Галоўныя прычыны — шмат сьнегу, рэзкае пацяпленьне, моцныя дажджы, лёдавыя заторы на рэках.

Найбольшая паводка ў Вільні ў XX ст. была вясною 1931 году. Тады 26 красавіка вада ў Вяльлі паднялася да адзнакі 8 мэтраў 25 сантымэтраў над узроўнем мора. Памятная табліца на сьцяне будынка Акадэміі Навук сьведчыць пра тое, што вада заліла Катэдральны пляц і прылеглыя вуліцы, электрастанцыю на правым беразе Вяльлі і сутарэньні Катэдры. Наступныя затапленьні адбываліся ў 1951 і 1956 годзе. Віленчукі згадваюць, як ў 1951 годзе вада зносіла сьмецьце з вуліц у раку, як па Катэдральным пляцы ў цёплыя сонечныя дні плавалі чаўны, як была затопленая бібліятэка Акадэміі Навук.

Сёньня сыноптыкам ужо ясна, што паводка паўторыцца, — занадта вялікі ўзровень сьнегу ў ваколіцах Вільні, зацягваецца прыход вясны, і мала спадзеву на тое, што ГЭС у беларускай Вялейцы стрымае вадзяны напор Вяльлі.

Работнікі сацыяльнага страхаваньня ў Клайпедзе лічаць, што былыя вайскоўцы расейскай арміі незаконна карыстаюцца льготамі, якія даюцца пэнсіянэрам зь дзяржаўнага бюджэту. Большасьць вайскоўцаў не паведамляюць у ЖЭСы пра пэнсіі і дапамогі, якія яны атрымваюць ад міністэрства абароны Расеі. Паводле дадзеных дэпартамэнту дзяржбясьпекі ў Клайпедзе жывуць 802 былыя вайскоўцы расейскай арміі і 206 былых супрацоўнікаў КГБ. Яны атрымваюць пэнсіі з Расеі. Увогуле ў Літве жыве каля пяці тысяч такіх адстаўнікоў. За месяц зь літоўскага дзяржбюджэту ім выплочваецца кампэнсацыяў на 100 тысяч літаў. Выказваецца думка, што гэта неадэкватныя затраты.

72 тоны кантрабанднага сьпірту затрымала паліцыя ў Клайпедзкім порце. Кантрабанда была дастаўленая на нямецкім караблі "Сэрэнада", які прыйшоў пад кіпрскім сьцягам. Сьпірт знаходзіўся ў 360 бочках па 200 літраў кожная. Згодна з дакумэнтамі, у бочках з бэльгійскага порту Антвэрпэн везьлі ацэтон, выраблены ў Францыі. Адрасатам значылася менская фірма "Ініс". Паводле папярэдніх дадзеных, такой фірмы на тэрыторыі Беларусі няма. Мяркуецца, што пагрузіць сьпірт маглі і ў нейкім іншым міжнародным порце. Даставіць "ацэтон" у Менск павінен быў нехта К.Навіцкас.

На вуліцах Паланге ўжо зьявіліся першыя раварысты. На аўтастанцыі — мікрааўтобусы гатовыя адвезьці кожнага ў Крэтынгу ці Клайпеду. Але пасажыраў амаль няма. У будзёныя дні славуты курорт на беразе Балтыкі больш нагадвае вымерлую вёску: праз нязвыкла ціхі пэнтар шпацыруюць асобныя пэнсіянэры. Яны прыяжджаюць на курорт узімку за кошт дзяржаўнага фонду сацыяльнага страхаваньня.

Затое па выхадных сюды наяжджаюць крутыя "скураныя" хлопцы з мабільнымі тэлефонамі і з сваімі даўганогімі дзеўкамі. У гэтых жаданьні празаічныя: найбольш шыкоўны дом адпачынку, куцёж, саўна. Яны жывуць на прынцыпе: сапраўдны джэнтэльмэн абавязкова павінен пасядзець на Лукішках (славутая віленская турма), парыбачыць у Куршскай затоцы ды правесьці ноч з каханкай у Паланзе. За пару дзён яны пакідаюць тут каля 3000 літаў (4 літы = $1).

З 48 кавярняў, якія ў сэзон працуюць на вуліцы Басановіча, зімой застаецца ўсяго дзясятак. Улетку ў любым бары ці рэстаране нават пасьля паўночы можна выпіць куфаль піва. А зімою легальна гэта можна зрабіць толькі ў двух, якія маюць ліцэнзіі на гандаль алькаголем. Дырэктар прыватнага дому адпачынку кажа, што бываюць дні, калі зварот складае 20-30 літаў. Улетку — у 250 разоў болей. Бармэны з вуліцы Басановіча кажуць, што сёлета ў лютаўскую завею быў пабіты рэкорд: за дзень замовілі тры кубкі кавы па тры літы.

Але дзе ж турысты? Як кажуць у турыстычным бюро, людзі пачынаюць купляць пуцёўкі з красавіка. Многія дырэктары дамоў адпачынку згадваюць пра просьбы замежнікаў забясьпечыць іх дзеўкамі лёгкіх паводзінаў. У Паланзе фірмаў "чароўных спадарожніц" няма, прастытутак даводзіцца прывозіць з Клайпеды. За гадзіну ім плацяць каля 130 літаў. Аматары азартных гульняў, таксама абмінаючы Палангу, едуць у Ліепаю або Рыгу: у Латвіі казыно працуюць легальна. У Паланзе сакавік — гэта яшчэ зіма.

Паводле Lietuvos Rytas



пытайцеся ў шапіках "Саюздруку" і ў прыватных распаўсюднікаў, а яшчэ лепш – выпісвайце

НЕЗАЛЕЖНЫ ТЫДНЁВІК

НАША НІВА



і н д э к с 6 3 1 2 5

© НАША НІВА Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая Наклад 5000 Нумар падпісаны ў друк 21.03.1996 Надрукавана ў ЗАТ "Lietuvos Rytas" (Вільня, праспэкт Гедыміна, 12а)